Установа адукацыі

«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва

Кафедра этналогіі і фальклору

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| _________В.В.Калацэй | __________Н.У.Карчэўская |
| 20 красавіка 2017 г. | 27 красавіка 2017 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА - МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС

ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

*для напрамку спецыяльнасці*

*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Складальнікі: Матыліцкая Н.В, старшы выкладчык

Разгледжана і зацверджана на паседжанні Савета ўніверсітэта

_____________ 20___ г.

пратакол № ___

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Матыліцкая Н.В., старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;

*Т.І. Кухаронак,* старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 20 красавіка 2017 г. № 9);

*саветам факультэта* традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 27 красавіка 2017 г. № 9)

*саветам* установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол ад 23 мая 2017 г. № 9)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Структура ВМК

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………….. 4
2.ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ..………………………………................ 7

2.1Навучальны дапаможнік па дысцыпліне…………………………… 7
2.2Канспекты (тэксты лекцый)………………………………………… 8

3.ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ...……………………………………………. 152
3.1Вучэбныя выданні, афіцыйна рэкамендаваныя МА РБ……………. 152

4.РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ..……………………………………. 153
4.1 Пытанні да семінарскіх і практычных заняткаў……………………. 153
4.2 Заданні для кантралюемай самастойнай работы і графік яе кантролю……………………………………………………………………. 157
4.3 Пытанні да заліку……………………………………………………… 159
4.4 Пытанні да экзамену………………………………………………… 161
4.5Тэматыка рэфератаў,………………………………………………… 164
4.6Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў………………………………………………………………… 165

5.ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ..………………………………................... 168

5.1 Вучэбная праграма па дысцыпліне,………………………………… 168
5.2Рабочы тэматычны план па дысцыпліне………………….............. 169
5.3Методыкі выкладання дысцыпліны……………………….............. 172
5.4Метадычныя рэкамендацыі………………………………………… 174
5.5Літаратура………………………………………………………….... 175

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1.ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна - метадычны комплекс “Гісторыя беларускай фалькларыстыкі” садзейнічае глыбокаму засваенню студэнтамі ўсяго комплексу тэарэтычных і практычных ведаў у галіне фалькларыстыкі. Яна дазваляе сістэматызаваць тэарэтычныя і практычныя навуковыя веды, накопленыя фалькларыстыкай на працягу яе гістарычнага развіцця, сфарміраваць уяўленне пра гістарычнае развіццё фальклору, яго жанрава-відавы склад, ідэйна-тэматычны змест і паэтыку, асаблівасці генезісу і развіцця сістэмы родаў, відаў і жанраў, асэнсаваць асноўныя кірункі збірання, публікацыі і даследавання вусна-паэтычнай творчасці ў працах айчынных і замежных нарадазнаўцаў, сфарміраваць уяўленне пра найбольш значныя крыніцы і тэарэтычныя працы па фалькларыстыцы.

Выкладанне гісторыі фалькларыстыкі базіруецца на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні філасофіі і гістарычных дысцыплін. Гэта дае магчымасць сістэмнага засваення і комплекснага ўсведамлення працэсу развіцця навукі аб фальклоры.

*Мэты вывучэння раздзела:*

– узбагаціць будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры ведамі па гістарыяграфіі фальклору, ведамі пра спецыфіку яго збірання і вывучэння, абумоўленую яго унікальнай і самабытнай прыродай;

– сфарміраваць у будучых спецыялістаў ў галіне беларускай народнай культуры разуменне ролі асобы дзеяча культуры ў зберагання, даследаванні і трансляцыі фальклору.

*Задачы вывучэння раздзела:*

– ажыццявіць тэарэтычнае і практычнае азнаямленне студэнтаў з помнікамі фалькларыстыкі;

– забяспечыць засваенне студэнтамі асноўных паняццяў і тэрмінаў фалькларыстычнай навукі, азнаямленне з асноўнымі школамі і кірункамі фалькларыстыкі, метадамі фалькларыстычнага даследавання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сфарміраваць асновы даследчыцкай культуры студэнта, закласці тэарэтычную базу для развіцця і эфектыўнага прымянення даследчыцкіх навыкаў будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры.

У выніку вывучэння дысцыпліны “Гісторыя фалькларыстыкі” ў поўным аб’ёме студэнты павінны *ведаць*:

– сацыяльныя і гісторыка-культурныя перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры, ролю пэўных дзеячоў, навуковых і грамадскіх устаноў у яе фарміраванні;

– асноўныя кірункі збірання, публікацыі і вывучэння вусна-паэтычнай творчасці;

– агульнатэарэтычныя пытанні фалькларыстыкі, этапы яе развіцця, асноўных прадстаўнікоў і іх працы;

– асаблівасці тэарэтычнага асэнсавання фальклору на розных этапах развіцця навукі і сучасныя праблемы фалькларыстыкі.

Студэнты павінны *умець*:

– прымяняць свае веды ў кантэксце сваёй прафесійнай дзейнасці;
– аналізаваць з’явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў;
– карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях гісторыі фалькларыстыкі і звязаных з ёй дысцыплін.

*Метады і тэхналогіі навучання*

У ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне гісторыі фалькларыстыкі і фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– метад гістарыяграфічнага даследавання;
– метад тэксталагічнага аналізу прац XIX – пачатку XX ст.

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў* павінна развівацца ў наступных кірунках:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– азнаямленне з навуковай, хрэстаматыйнай літаратурай (веданне тэкстаў першакрыніц);
– выкананне гістарыяграфічных даследаванняў;
– падрыхтоўка вусных і пісьмовых паведамленняў і прэзентацый.

Праграма прадугледжвае формы кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2.ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1. МАТЭРЫЯЛЫ Ў НАВУЧАЛЬНЫ ДАПАМОЖНІК ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ”

1. Матыліцкая Н. В. Асветніцкая дзейнасць Слуцкага краязнаўчага таварыства ў галіне фальклору(1920 – я гады) // Беларускае асветніцтва: вопыт тысячагоддзя : Матэрыялы міжнароднага кангрэса, 20 - 21 кастрычніка 1998 г.: У 2 кн. Мін. дзярж. пед. Ун - т; Рэд. Калегія.—Мінск Кн.2, 1998, с. 67- 69

2 Матыліцкая Н. В. Фальклорныя традыцыі Заслаўшчыны. // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Заслаўя Мн., 2000, с. 411-422

3. Матыліцкая Н.В. Краязнаўчы рух на Случчыне. // Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Слуцкага р-на і г. Слуцка. У 2 кн. Кн. 1-я. – Мн., 2000, с. 212-213

4.Матыліцкая Н.В. Слуцкае краязнаўчае таварыства // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т.2: -- Мн., 2006, с.539-540

5. Матыліцкая Н. В. З гісторыі даследавання каляндарна-абрадавага фальклору Случчыны // Аўтэнтычны фальклор: праблемы бытавання, вывучэння, пераймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў ІІІ Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі ( Мінск, 29 - 30 красавіка 2009 г.) / рэдкал.: Мажэйка М. А. (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск: БДУКМ, 2009 – 188 с., с. 85-86

6. Матыліцкая Н. В. Фальклорныя традыцыі Заслаўшчыны .Горад майго сэрца. Заслаўшчына літаратурная. Серыя “Беларусь літаратурная”. – Мінск, 2015. – С. 17-22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.2. Канспект лекцый

## Уводзіны

*Пытанні*

1. Фальклор і фалькларыстыка.
2. Фалькларыстыка ў сістэме гуманітарных навук.
3. Раздзелы фалькларыстыкі.

*Літаратура*

*Азадовский, М.К.* История русской фольклористики / М.К.Азадовский. – М., 1958. Т.1.; 1963. Т.2.

*Белорусская этномузыкология :* Очерки истории (XIX – XX вв.) /З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др.; под ред. З.Можейко. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 254с.

*Гусев, В.Е.* Эстетика фольклора / В.Е.Гусев. – Л. : Наука, 1967.

*Слов'янска* фольклористика. – Київ, 1988.

*Чистов, К.В.* Народные традиции и фольклор / К.В.Чистов. – Л. : Наука, 1986. – 274 с.

### 1.Фальклор і фалькларыстыка

Лічаць, што першыя формы фальклору з'явіліся паралельна са з'яўленнем у асяродку чалавецтва маўлення – напрацягу апошніх 350 тысяч гадоў. Даследчык Іосіф Жарданія прыводзіць наступную храналогію пераходу чалавечых супольнасцяў розных рэгіёнаў свету да гукавысотна-раздзельнага маўлення (таб. 1).

*Табліца 1*- Пераход розных рэгіёнаў свету да гукавысотна-раздзельнага маўлення

| **Чалавечыя папуляцыі** | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Ўсходняй Азіі | Аўстраліі | еўрапеоідаў Паўночнай Афрыкі і | Паўночнай Еўропы і горных | Афрыкі на поўдзень ад Сахары |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Заходняй Азіі | рэгіёнаў Еўропы | |
| 350-320 тысяч гадоў таму | 130 тысяч гадоў таму | 105-95 тысяч гадоў таму | 40-32 тысячы гадоў таму | меньш 30 тысяч гадоў таму |

Згодна выкладкам Жарданія, можна сцвярджаць, што першыя формы фальклору – песня і танец (карагод) – ужо існавалі як формы сацыяльнай камунікацыі папуляцый Еўразіі пры сумесным выкананні яе супольнасцямі магічных рытуалаў прыкладна 350 тысяч гадоў таму. Іх аўтары, носьбіты і захавальнікі на працягу тысячагоддзяў карысталіся павагай народа, ад пачатку і пазней часам мелі высокі сацыяльны статус (святароў, шаманаў, чараўнікоў, традыцыйных музыкаў-прафесіяналаў, а самі ўзоры вуснай народнай творчасці старанна захоўваліся і высока цаніліся знаўцамі. Яшчэ вялікі Платон, калі разважаў аб прыродзе сапраўднай паэзіі, спасылаўся менавіта на *народныя* ўяўленні пра тэхналогію і асаблівасці паэтычнай творчасці.

Аднак асабліва сістэмна і ў пісьмовым выглядзе асэнсоўваць плён спадчыны традыцыйнай культуры людзі пачынаюць па меры фарміравання буйных урбаністычных асяродкаў, не звязаных з вясковай (руральнай) культурай, ці ў сувязі з гандлёвымі і імперска-ваяўнічымі кантактамі з суседнімі, непадобнымі па культуры народамі. Так, першы аналіз лекаў і тэрапеўтычных прыёмаў, якімі карысталіся міжземнаморскія вясковыя знахаркі, пакінулі элінскія медыкі-гараджане; а першыя звесткі пра каранёвыя міфы і абрады кельтаў, германцаў, славян збіралі рымскія і візантыйскія ваяры, спецслужбы, каланіяльныя адміністратары і місіянеры.

Усходнеславянскія даследчыкі гісторыі фалькларыстыкі сцвярджаюць, што навуковы, прафесійны інтарэс да фальклору ўзнік у Еўропе ў сувязі з дзейнасцю італьянскага філосафа Джамбаціста Віко і асветнікаў XVIII стагоддзя, асабліва нямецкага эстэтыка Іагана Готфрыда Гердэра і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

французкага зачынальніка антрапалогіі Клода Адрыена Гельвецыя[1]. Пачатак спецыяльнага вывучэння, збірання фальклору і фарміраванне першых навуковых накірункаў еўрапейскай фалькларыстыкі адносіцца да першай паловы XIX стагоддзя. У працах тагачасных даследчыкаў, якія вывучалі фальклорныя помнікі, міфы, паводзінную культуру народаў (у мэтах спрыяння вызваленча-дэмакратычнаму руху, фарміраванню нацый у нетрах імперскіх утварэнняў Еўропы) метадолагі бачаць структуру і сістэмную арганізацыю навуковай веды. *Навука аб фальклоры* атрымала назву ф а л ь к л а р ы с т ы к а. Яна аформілася паступова ў складзе філасофіі, этнаграфіі, літаратуразнаўства, музыказнаўства і тэатразнаўства.

### 2. Фалькларыстыка ў сістэме гуманітарных навук

За свой 300-гадовы «метадалагічна-сістэмны» шлях фалькларыстыка падпадала пад уплывы разнастайных сумежных навук (гісторыі, сацыялогіі, культуралогіі, сацыяльнай псіхалогіі, лінгвістыкі, семіётыкі), узбагачала іх і сама ўдасканальвалася як навука. Пры гэтым, фалькларыстыка «…тады стане сапраўднай навукай, калі яна ў поўнай меры распрацуе свой паняційны апарат», прычым менавіта «…ў гэты бок ідзе яе развіццё» [Анікін, с.27].

Сёння фальклор, яго бытаванне, спецыфіку, склад і гісторыю вывучаюць у двух аспектах – вучэбным і даследчым. Вучэбны аспект шчыльна знітаваны з пераемнасцю фальклорных узораў, іх мастацкай рэканструкцыяй і нават з рэвіталізацыяй (вяртаннем у побыт); даследчы – з архівізацыяй і аховай помнікаў фальклору. Адпаведна профілю навуковых дысцыплін, якія займаюцца фальклорам, адрозніваюць чатыры віды яго вывучэння (табл.2).

*Табліца 2* – Асноўныя віды вывучэння фальклору

[1] Даследаванні Віко, Гердэра і Гельвецыя былі накіраваны на гісторыю чалавецтва ўвогуле, параўнанні агульнага і адрознага ў этнічных культурах (у мове, казках, песнях, светапоглядзе, звычаях і абрадах). Але ўсе яны цікавіліся фальклорнымі помнікамі з разуменнем неабходнасці вывучэння і аховы каранёвых культур еўрапейцаў для будучага дасканалення прыроды чалавека ў мэтах яго выжывання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Вывучэнне фальклору | | | |
|---|---|---|---|
| **філалагічнае** | **этнаграфічнае** | **мастацтвазнаўчае** | **комплекснае** |
| адпаведныя адгалінаванні навукі | | | |
| літаратуразнаўства, лінгвістыка, этналінгвістыка, парэміялогія | этнаграфія, этнакасцюмалогія, аўдыёвізуальная антрапалогія | этнамузыкалогія, этнахарэаграфія, кагнітыўная музыкалогія | этналогія, культуралогія, сацыялогія, этнапедагогіка, этнасеміётыка |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта досыць розныя па падыходах і метадалогіі навуковыя дысцыпліны. Звычайна гісторыя вывучэння фальклору разглядаецца як паслядоўная (паэтапная) змена шматлікіх кірункаў і школ фалькларыстыкі. Але шэраг даследчыкаў уяўляюць гісторыю фалькларыстыкі як дынамічную сістэму суіснуючых адначасова розных школ і кірункаў навукі пра фальклор.

**3 Раздзелы фалькларыстыкі**

Для сучаснага развіцця фалькларыстыкі характэрна супрацоўніцтва фалькларыстаў-філолагаў, музыказнаўцаў, тэатразнаўцаў, харэографаў. Маюць месца прыклады комплекснага вывучэння фальклору, што стварае перадумовы дляператварэння фалькларыстыкі ў навуку кампаратыўную, міждысцыплінарную. Даследчыкі.адрозніваюць шэсць раздзелаў сучаснай фалькларыстыкі

## Раздзел I. Узнікненне навукі аб фальклоры

### Тэма 1 Метадалогія фалькларыстыкі, яе школы і напрамкі ў Беларусі

Пытанні па тэме

1. Асноўныя метады фалькларыстыкі.

2. Методыка збіральніцкай працы.

3. Кірункі (напрамкі), школы фалькларыстыкі.

4. Асноўныя этапы народазнаўства Беларусі.

**Літаратура па тэме**

*Андреев, Н.П.* Указатель сказочных сюжетов по системе Аарне. – Л., 1929.

*Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору. – М., 2016.

*Пропп, В.* Морфология сказки. – М., 1969.

*Токарев, С.А.* История зарубежной этнографии. – М., 1978.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. Асноўныя метады фалькларыстыкі

Напярэдадні XXI стагоддзя аналітыкі навукі пазначалі, что: «Фалькларыстыка доўгі час існавала за кошт іншых навук і настаў час, калі навука пра фальклор павінна атрымаць самастойнасць. Гэта адбудзецца, калі яна асэнсуе свой прадмет, створыць уласную тэорыю, уласны метад» [Анікін, с.27]. Той від навуковай дзейнасці, які ў славянамоўнай навуцы завецца фалькларыстыка, у англамоўнай навуцы – частка антрапалогіі ці сацыякультурнай антрапалогіі (навукі пра чалавека і чалавечыя супольнасці). Часам аднога і таго ж даследчыка славянамоўнай навуцы завуць фалькларыстам, а ў англамоўнай – антраполагам. Хоць і фалькларыстыка, і антрапалогія вывучаюць людзей і іх культуру, яны розняцца па метадах і метадалогіі даследавання. Вядома, што м е т а д – (*грэч.* methodos – шлях даследавання) – *сукупнасць прыёмаў практычнага ці тэарэтычнага пазнання і асваення рэчаіснасці*, а м е т а д а л о г і я – *аб'яднанне розных метадаў у парадыгму для паспяховага правядзення навуковага даследавання.*

Вывучэнне фальклору вырашае розныя задачы і таму да яго існуюць некалькі навуковых падыходаў. Фальклор разглядаюць у наступных а с п е к т а х (п а д ы х о д а х): *сінхронным* (вывучэнне фальклору ў адзіны часовы «зрэз»), *дыяхронным* (вывучэнне часовых змен у фальклоры напрацягу пэўнага тэрміну), *сістэмным* (падыход да фальклору як да сістэмы

элементаў), *рэгіянальным* (вывучэнне фальклору аднаго гісторыка-культурнага рэгіёну, паселішча), *функцыянальным, тэксталагічным, сацыялагічным.* Асноўныя м е т а д ы , якія шырока выкарыстоўваюцца ва ўсходнеславянскай фальклярыстыцы (табл.3) – *гісторыка-геаграфічны, гісторыка-тыпалагічны, структурна-тыпалагічны.*

*Табліца 4* – Асноўныя метады фалькларыстыкі

| **Назвы метадаў** | | |
|---|---|---|
| **гісторыка-геаграфічны** | **гісторыка-тыпалагічны** | **структурна-тыпалагічны** |
| ***назвы-сінонімы*** | | |
| геаграфічна-картаграфічны, географа-гістарычны, географа-статыстычны | тыпалагічны | структурна-этналагічны, семіятычны |
| ***заснавальнікі і найбуйныя прадстаўнікі*** | | |
| Ю. Крон, К. Крон<br>Анці Аарне | Віктар Жырмундскі<br>Еліазар Меляцінскі | Уладзімір Проп |
| ***сутнасць*** | | |
| разуменне гістарычнага развіцця фальклору як руху ад простых і ясных форм (праформ) да ўскладнёных | прызнанне дамінантнасці агульных законаў сацыяльна-гістарычнага раз-віцця для фальклорных структур розных народаў | з'явам фальклору ўласціва стабільная структурная арганізацыя, выяўленне якой удакладняе іх генезіс і храналогію развіцця |
| ***прынцыповыя асаблівасці*** | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| вычляненне праформы пэўнай фальклорнай з'явы, выяўленне яе прарадзімы і вызначэнне часу яе ўзнікнення; да тэксту даследавання пэўнай з'явы фальклору дадаюцца храналагічныя дыяграмы і геаграфічныя карты яго міграцыі | аналіз генезісу, семантыкі, функцый пэўнай фальклорнай з'явы праз пошук яе этнаграфічных сувязяў і вонкавых уплываў | вызначэнне структуры (унутранай арганізацыі) фальклорнай з'явы, на аснове гэтага аналіз яе гістарычных каранёў |

На характэрных метадах і агульнай метадалогіі фалькларыстыкі пабудаваны методыкі розных відаў дзейнасці фалькларыстаў – напрыклад, методыка збіральніцкай працы, методыка апрацоўкі фальклорных адзінак і г.д.

**2. Методыка збіральніцкай працы**

М е т о д ы к а збіральніцкай працы ў фальклярыстыцы – *сукупнасць навукова абгрунтаваных прыёмаў збірання і запісу фальклору, якімі карыстаюцца фальклярысты-прафесіяналы і аматары.* Асновы фальклярыстычных методык заклалі ў XIX стагоддзе Арэст Мілер, Пётр Кірэеўскі, Павел Шэйн, у XX стагоддзе іх удасканалілі Барыс і Юрый Сакаловы, Рыгор Шырма, Кірыл Чыстоў, Віктар Гусеў, Канстанцін Кабашнікаў, Зінаіда Мажэйка, Тамара Варфаламеева, Алена Боганева.

Методыка збірання фальклору ўсталёўвае *задачы* і акрэслівае *сферу дзейнасці* (арганізацыйна рэгулюе працэс фіксацыі) збіральнікаў, спрыяе авалодванню збіральнікамі *тэхнікай запісу* фальклору. У якасці з а д а ч , якія вырашае абраная методыка, можа быць пастаўлена: *франтальнае (сплашное) абследаванне рэгіёну* з выяўленнем і запісам усіх бытуючых у ім відаў і жанраў фальклору; *выяўленне і запіс твораў аднаго жанру*; *паўторны запіс* і інш. У рабоце з інфарматарам (зараз часцей ужываецца дэфініцыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*этнафор*) збіральнік можа выкарыстоўваць наступныя п р ы ё м ы : *інтэрв'ю, апрос, анкетаванне, тэсты, апісанне* і інш.

### 3. Кірункі (напрамкі) і школы фальклярыстыкі

К і р у н а к (напрамак) фальклярыстыкі ці ш к о л а фальклярыстыкі – гэта *аб'яднанне ці шэраг даследчыкаў, працы якіх заснаваны на агульнай філасофскай, эстэтычнай, культуралагічнай ці іншай навуковай канцэпцыі*. Працы прадстаўнікоў аднаго напрамку ці адной школы звычайна падобны па праблематыцы і метадалогіі, але адрозніваюцца па тэматыцы і высновах даследаванняў. Дэфініцыі *кірунак* і *школа* часцяком ўжываюцца як сінонімы. Жорсткага крытэрыя адрознення напрамку ад школы ў фальклярыстыцы не існуе. За некаторымі аб'яднаннямі даследчыкаў фальклору замацавалася абазначэнне «напрамак», за другімі – «школа». Н а п р а м к і фальклярыстыкі звычайна называюцца па назве асобнай навукі, на сінтэзе з якой фальклярыстыкі заснаваны іх метадалогіі (сацыялагічны, семіятычны, псіхааналітычны, структуралісцкі напрамкі). Ш к о л ы называюцца па абсалютна розных крытэрыях: па прозвішчу заснавальніка (школы мовазнаўцы Аляксандра Весялоўскага, лінгвіста Мікалая Мара, этнамузыколага Філарэта Калесы); па назве тэорыі, якой трымаецца большасць прадстаўнікоў (міграцыйная, этнапсіхалагічная, культурна-гістарычная школы фальклярыстыкі); па нацыянальнасці фальклярыстаў-заснавальнікаў (фінская, руская гістарычная) ці па назве месцазнаходжання базавай навуковай установы, у якой працавалі заснавальнікі (кембрыджская школа, тартуская школа, заснаваныя ва універсітэтах гэтых гарадоў). У школу звычайна ўваходзяць навукоўцы-прадстаўнікі некалькіх генерацый.

Наяўнасць школы – гарантаванае вырашэнне навуковай праблемы, над якой працуюць даследчыкі-аднадумцы цягам некалькіх пакаленняў, якія карыстаюцца напрацоўкамі адно аднаго, узаемаабагачаюцца і супрацоўнічаюць. Навуковыя школы перадаюць атрыманыя дасягненні ад папярэдняга этапа развіцця навукі да наступнага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4. Асноўныя этапы народазнаўства Беларусі

Неабходнасць вывучэння каранёвых, стыхійна склаўшыхся форм культуры, якія праіснавалі тысячагоддзі і паспяхова выканалі г а л о ў н у ю ф у н к ц ы ю к у л ь т у р ы (функцыю *задавальнення фізічных і духоўных запатрабаванняў этнасу як біясацыяльнай сістэмы*), неаднаразова падкрэслівалася шэрагам навукоўцаў. У гэтым кантэксце даследаванні фалькларыстаў і этнічных антраполагаў раўняюць з вывучэннем універсальных форм чалавечай гісторыі [Kroeberg, 44, с. 5]. І сапраўды, фалькларысты даследуюць асобныя *каранёвыя формы арганізацыі мыслення і паводзін* – асобныя т р а д ы ц ы й н ы я к у л ь т у р ы.

Народазнаўства на беларускіх тэрыторыях мела сваю спецыфіку, звязаную з пошукамі этноніму і станаўленнем народнасці і нацыі беларусаў, іх барацьбой з каланіялізмам, але, адначасова, знаходзілася ў залежнасці ад агульнаеўрапейскай і сусветнай навуковай, эстэтычнай і грамадскай думкі, палітычных рэаліяў жыцця Еўропы. З гэтых пазіцый магчыма прапанаваць наступную перыядызацыю этапаў народазнаўства Беларусі (таб. 5).

Табліца 5 – Асноўныя этапы народазнаўства Беларусі

| **№** | **назва** | **храна-логія** | **асноўныя прадстаўнікі** | **знакавыя творы** |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Стыхійнае народазнаўства на землях русінаў і ліцвінаў у Сярэднявеччы, часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай | XII – XVII стст. | Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына, Мацей Мяхоўскі, Сігізмунд Герберштэйн, Мікола Гусоўскі, Ян Ласіцкі, Саламон Рысінскі | Летапісы, хронікі, тэалагічныя творы, дзённікі і мемуары XII – XVII стст. пра русінаў і ліцвінаў |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Асветніцкі этап народазнаўства антыкаланіяльнага літвінізму<br><br>*Падзелы Рэчы Паспалітай 1772-95 – расфарміраванне Віленскага ўніверсітэта 1832 пасля антыімперскага паўстання 1830-31* | мяжа XVIII/ XIX стст. – сяр. XIX стст. | Зарыян Даленга-Хадакоўскі, Ян Чачот, Уладзіслаў Сыракомля, Адам Міцкевіч, Юзаф Крашэўскі | «Пра славяншчыну да хрысціянства» (1818 Д-Х)<br>Выданні разагнаных у 1821 г. філаматаў: Тры часткі драмы «Dziady» (1822-32 А.М.) «Сялянскія песьні з-над Нёмана і Дзьвіны» (1844 Я.Ч.) «Кароткае дасьледаваньне мовы і характару паэзіі русінаў Менскай правінцыі» (У.С. 1856)<br>«Успаміны пра Палессе, Валынь і Літву» (1840 Я.К.) |
| 3 | Рамантычна-міфалагічны этап народазнаўства антыкаланіяльнага ліцвінізму<br><br>*Лагойскі музей (1844), Віленскуая археаля* | сяр. XIX ст. | Ян Баршчэўскі, Яўстафій Тышкевіч, Адам Кіркор, Павел Шэйн, Іван Насовіч, П.Бяссонаў | «Шляхціц Завальня» (1944-46 Я.Б.) «Апісанне Барысаўскага павета» (1847 Я.Т.)<br>«Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню» (1858) і «Беларускае Палессе» |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | *гічная камісія і Віленскі музей старажытнасцяў (1855) братоў Тышкевічаў – антыімперскае паўстанне 1863 г.* | | | (1882, А.К.) «Путешествие по Полесью и Белорусскому краю» (1853 П.Ш.) «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга края» (т. 1-3, 1887—1902 П.Ш. & С) «Беларускія песні» (П.Б. 1871) «Слоўнік беларускай гаворкі» (1870 І.Н.) |
| 4 | Культурна-гістарычна-антрапалагічны этап імперскага беларусазнаўства<br><br>*Паўночна-заходняе аддзяленне Імператарскага геаграфічнага таварыства (1861) – падзенне Расійскай імперыі* | другая пал. XIX ст. | Павел Шпілеўскі, Я.Раманаў, М.Федароўскі, У.Дабравольскі, М.Нікіфароўскі, М.Янчук, А.Сержпутоўскі, Я.Ляцкі, А.Багдановіч, Ч.Пяткевіч , К.Машынскі | «Беларускі зборнік» (1896 – 1912 т 1-9 Я.Р.); «Пережитки древнего миросозерцания у белорусов» (1895 А.Б.); |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | *(1917)* | | | |
| 5 | Рэвалюцыйна-крывіцка-сацрэалістычны этап савецкага прафесійнага беларусазнаўства<br><br>*Абвяшчэнне БНР (1918) і БССР (1921) – этнацыд 1930-х гг.* | пач. ХХ ст. | Інбелкультаўцы: Я.Карскі, У.Ігнатоўскі, М.Доўнар-Запольскі, В.Ластоўскі, І.Луцэвіч, А.Смоліч, І.Сербаў. +А.Шлюбскі, М.Гарэцкі, М.Нікольскі. | «Белорусы» (1903-22, т.1-3 Я.К.); «Мемарыял» («Асновы беларускай дзяржаўнасці») (1919 М. Д-З); «Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік» (1924 В.Л.); «Геаграфія Беларусі» (1919 А.С.); «Руска-беларускі слоўнік»» (1918 М.Г.) |
| 6 | Этап савецкага прафесійнага беларусазнаўства<br><br>*Падзенне фашысцкай Германіі (1945) – самазнішчэнне СССР (1991)* | другая пал. ХХ ст. | М.Грынблат, П.Глебка, В.Бандарчык, Г.Барташэвіч, А.Фядосік, У.Васілевіч, Т.Валодзіна. Этнамузыкалогія: В.Ялатаў, З.Мажэйка, Т.Варфаламеева. Народнае ДПМ: Я.Сахута, В.Лабачэўская. | Зборы ІМЭФ НАН Беларусі «БНТ», «Беларусы», Бел ІПК «ТМКБ» |
| 7 | Этап суверэннага | | Г.Барташэвіч, | Зборы ІМЭФ НАН |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | прафесійнага беларусазнаўства<br><br>*Суверэнітэт Рэспублікі Беларусь (1991) – пач. XXI ст.* | | У.Васілевіч, Т.Валодзіна, Т.Кухаронак. Этнамузыкалогія: З.Мажэйка, Т.Варфаламеева. Народнае ДПМ: Я.Сахута, В.Лабачэўская. | Беларусі «Беларусы», Бел ІПК «ТМКБ» |

*Табліца 3* – Раздзелы фалькларыстыкі

| **Назвы раздзелаў** | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **гістарыягра-фія фальклору** | **тэорыя фальклору** | **гісторыя фальклору** | **арганізацыя і методыка палявой работы** | **сістэматызацыя фальклорных фондаў** | **тэксталогія і эдыцыённыя прынцыпы фалькларыстыкі** |
| прадмет даследаванняў | | | | | |
| вывучае гісторыю збірання, публікацыі і вывучэння фальклору | вывучае спецыфіку фальклору як традыцыйнай мастацкай | вывучае гістарычную абумоўленасць усіх з’яў, | вывучае навукова абгрунтаваныя прыёмы збірання і | вывучае рысы, якія вызначаюць спецыфіку вялікіх і малых груп | вывучае прыёмы фіксацыі фальклору, яго архівізацы |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ўвогуле ці яго асобных жанраў, станаўленне і развіццё самой навукі пра фальклор, узнікненне школ і напрамкаў фалькларыстыкі | творчасці народа, прынцыпы вывучэння фальклору, творчую прыроду традыцый, суадносіны агульнанародных, рэгіянальных і лакальных якасцяў фальклору, варыятыўнасць, поліфункцыяналь-насць, паэтыку, роды, жанры і віды, фальклору | якія належаць да галіны фальклору, іх зместавую суаднесенасць з гістарычнымі эпохамі, наяўнасць у фальклорных тэкстах прыкмет перыяду гісторыі, які іх нарадзіў | запісу фаль-клору; усталёўвае задачы, акрэслі-вае сферу дзейна-сці збіральнікаў; асноўныя паняцці: анкетаванне, запіс паўторны, франтальнае даследаванне рэгіёну, фіксацыя, расшыфроўка (нацыраванне) | твораў і абумоўлены задачамі іх даследаван-ня, публікацыі і заха-вання; найбольш распрацаваная сістэма фальклорных сюжэтаў – каталог сказак Аар-не-Томсана; асноўныя прынцыпы сістэматы-зацыі фондаў: этнагра-фічны, гістарычны, эстэтычны, тэматычны, функцыянальны, кампазіцыйна-стылявы, | і, расшыфроўкі аўдыё- і відэазапісаў, правілы дакладнай публікацыі і іх (уключаючы акадэмічныя эдыцыі з каментарам і заўвагамі); галоўная мэта – аўтэнтычнасць апублікаванага матэрыялу |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | рытміка-меладычны | |
| асноўныя прадстаўнікі ва Усходняй Еўропе | | | | | |
| Аляксандр Пыпін, Міхаіл Сперанскі, Барыс Сакалоў, Канстанцін Кабашнікаў, Міхаіл Грынблат | Віктар Гусеў, Кірыл Чыстоў, Ігар Маціеўскі | Барыс Рыбакоў, Барыс Пуцілаў, Дзмітрый Ліхачоў, Іван Франко, М.Азадоўскі | Н.Савушкіна, Б.Марохін, О.Правдзюк, | Соф'я Грыца, О.Дэй, І.Беразоўскі, Анатоль Фядосік | Філарэт Калеса, Клімент Квітка, Яўген Гіпіус, Е.Лінева |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 2 Перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры

*Пытанні*

1.Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца народазнаўчага даследавання.

2. Гістарычна-мемуарная літаратура як крыніца народазнаўчага даследавання.

3. Традыцыйная культуры ў творах пісьменнікаў-лацiністаў і ў краязнаўчай літаратуры XVI-XVII стст.

4. Саламон Рысінскі – першы даследчык беларускай парэміялогіі.

*Літаратура*

Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму / Г.А. Каханоўскі. Л. А. Малаш, К.А. Цвірка. - Мн. : Навука і тэхніка, 1989. - 288 с. - С. 11-15.

Белазаровіч. В. А. Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: вучэб. дапаможнік / В.А. Белазаровіч. - Гродна : ГрДУ, 2006. - 345 с.

**1. Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца народазнаўчага даследавання**

Вусная творчасць беларусаў, як сведчаць сучасныя даследаванні. - адна з найбагацейшых у славянскім свеце, таму навукоўцы праяўляюць да яе вялікую цікавасць. Гэта абавязвае нас вывучаць і развіваць фалькларыстыку. узбагачаць яе навуковую базу пошукамі новых матэрыялаў у сховішчах архіваў, бібліятэк, музеяў. а таксама папаўняць палявымі запісамі.

Гісторыя збірання і вывучэння беларускай народнай паэтычнай творчасці асвятляецца ў шэрагу прац, прысвечаных асобным гістарычным перыядам у развіцці фалькларыстыкі. дзейнасці асобных вучоных. таксама ў зборніках пэўных жанраў і відаў фальклору і інш. Зыходзячы з прынцыпаў гістарычна-дакументальнай адпаведнасці вывучаемага аб'екта рэчаіснасці, неабходна адзначыць вытокі, перадумовы развіцця навукі аб фальклоры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Прысутнасць» стыхіі народнай культуры адчуваецца ўжо ў помніках старажытнабеларускай літаратуры. У «Жыціі Еўфрасінні Полацкай» напісаным у XII ст., гаворыцца пра яе глыбокую павагу да традыцыйных народных каштоўнасцей, народнай маралі. У павучэннях Еўфрасіння (Прад'слава) • Полацкая (каля 1112-1173) нагадвае моладзі пра ўстойлівыя традыцыі: «...учаше чнстоце душэвной... прн старэйшых маўчацн, мудрэйшых паслушаці а мало вешатн а много разуметп». Апошняе, відавочна, блізкае да выслоўяў, пачутых ёю ад сваіх сучаснікаў. Еўфраеіння-затворніца, што закрылася ад свету ў манастыры «кнігі множыць», несці асвету людзям, не капіравала слепа далёкую візантыйскую культуру, а ў кантэксце . хрысціянскага веравучэння тлумачыла неабходнасць развіваць і ўшаноўваць свае адвечныя традыцыі.

Красамоўства Кірылы Тураўекага (1130-1183), выдатнага рэлігійна-царкоўнага дзеяча Беларусі, аўтара «Словаў», малітваў, прытчаў, таксама грунтуецца на традыцыйных народных метафарах: «днесь вясна красуецца, ажыўляючы зямное естество н бурныя ветры, тнхо повеваюшче, плоды габзуюць, н земля, семена пітаюпш, земную траву рожает».

Багаццем фапьшорна-паэтычных матэрыялаў вылучаецца «Аповесць мінулых часоў» - найбольш ранні з дайшоўшых да нас старажытнарускіх летапісных зводаў пачатку XII ст., напісаны у Кіеве. У «Аповесці мінулых часоў» не толькі названы ўсходнеславянскія плямё'ны, але і ўказаны меецы іх рассялення. Летапіс дае ўнікальныя звесткі пра духоўнае жыццё некаторых рэгіёнаў старажытнай Беларусі. Сказана, напрыклад, што Усяслаў Полацкі быў ахрышчаны па язычніцкаму абраду. Там жа сказана, што «его же родіті маті от волхвованія». Летапіс гаворыць, што нібыта князь нарадзіўся «ў кашулі», а таму яму было сказана, каб ён усё жыццё насіў яе як талісман. (Нашэнне талісманаў у XII ст. было вельмі распаўсюджаным). Народная мянушка князя, занатаваная старажытным летапісцам (Чарадзей), і сувязь яго з павер'ямі аб ваўкалаках сведчаць аб моцных вераваннях у чарадзейства, што бытавалі ў той час на Полаччыне. У «Аповесці мінулых гадоў»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паведамляецца пра жаніцьбу Уладзіміра на полацкай князёўне Рагнедзе, да якой ён у 980 г. пасылаў сватоў. Некаторыя звесткі пра элементы тагачаснага зясельнага абраду (умыканне), абраду пахавання (спальванне) данеелі да нас іншыя летапісы, хронікі Старажытныя помнікі пісьменства таксама распавядаюць пра павер'і, тульні і абрады - сведчанне таго, што ў насельнікаў Беларусі інтэнсіўна развівалася духоўная культура. Трэба адзначыць, што сярод немалой колькасці беларускіх летапісаў і хронік найбольш інфарматыўнымі з'яўляюцца «Хроніка Быхаўца» і «Баркулабаўскі летапіс».

Крыніцы XII—XV стст. гавораць пра багатую тагачасную культуру ўсходніх славян. Каштоўныя дакументы па гісторыі славян, апісанні асобных багоў. каляндарных і сямейных абрадаў прыводзяць германскія і польскія храністы Адам Брэменскі («Дзяянні архіепіскапаў Гамбургскай царквы». XI ст.). Гель-мольд («Славянская хроніка». XII ст.) Вінцэнт Кадлубек («Польская хроніка». XIV ст.). Ян Длугаш («Гісторыя Польшчы», напісана ў 1460 1480-я гг., надрукавана ў пач. XVIII ст.), Мацей Стрыйкоўскі («Хроніка польская. літоўская, жмудская і ўсёй Русі». 1582).

Шырокае выкарыстанне народная творчасць знайшла ў літаратуры Эпохі Адраджэння. Беларускае пісьменства стала набліжацца да жыцця. да яго рэальных праблем і да трададыцыйнай народнай культуры. Народныя паэтычныя творы выкарыстаны ў прадмовах і пасляслоўях Францыска Скарыны. які ў параўнанні з некаторымі сучаснікамі найбліжэй стаяў да разуменпя вуснай народнай творчасці, роднай мовьГ. Славуты першадрукар і асветнік ужывае парэміі, элементы фальклорнай эстэтыкі. Напрыклад. у прадмове да кнігі «Есфера-царыца» ён прыводзіць прымаўкі: не капай пад другам сваім ямы. сам увалішся ў яе: не стаў. Амане, мардахею шыбеніцы. сам павіснеш на ёй. У параўнанні з некаторымі сучаснікамі Скарына быў бліжэй да разумення вуснай народнай творчасці. роднай мовы: не многім учыцелем бываці, но бо.чее уметі язык свііі справоваті. Ен быў першы ў гісторыі беларускай культуры. хто свядома ўвёў народную мову ў пісьмовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўжытак. тым болып стаў друкаваць на ёй «людзям простым паспалітым к пажытку і кю разманажэнню добрых звычаяўу>.

Адным з пęршых апублікаваў звесткі пра беларускія традыцыйныя абрады і народную творчасць Ян Ласіцкі ў кнізе «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні. вясельныя. пахавальныя абрады русінаў. маскавітаў. татар» (1582). Запісаныя ад простых беларускіх сялян у ваколіцах Любчы прыказкі выдаў у 1618 г. Саламон Рысінскі ў зборніку «Польскія прымаўкі» на по.тьскай і лацінскай мовах. Аб іх будзе гаварыцца больш падрабязна.

Нямала прыкладаў выкарыстання фальклору сустракаецца ў літаратуры перыяду Рэфармацыі. дзе гуманістычныя ідэі прадстаўнікоў Адраджэння знайшлі сваё далейшае развіццё. Зварот да аздаблення літаратуры народным элементам не маг.та перапыніць рэакцыйная дзейнасць у Беларусі езуітаў, якія імкнуліся манапалізаваць сферу духоўнага жыцця.

**2. Гістарычна-мемуарная літаратура як крыніца народазнаўчага даследавання**

Цікавыя звесткі пра матэрыяльную і духоўную культуру Беларусі змешчаны ў помніках лстарычна-мемуарнай літаратуры XVI - XVII ст.. мала даследаванай у нашай гуманітарнай навуцы. На іх узнікненне ў пэўнай меры паўплывалі вялікія геаграфічныя адкрыцці XV XVII стст.. якія выклікалі нс толькі ва ўсёй Нўропе, але і ў Беларусі вялікую зацікаўленасць да нсвядомых рапей народаў розных кантынентаў. Звычаі і абрады параўноўваліся са звычаямі і абрадамі ўласных народаў. што ў сваю чаргу прымушала звярнуць павышаную ўвагу на сябе.

3 XVI ст. усё часцей ггублікуюцца апісанні падарожжаў па еўрапейскіх краінах. Заходнееўрапейцы часцей прыязджаюць у краіны Усходняй Нўропы - у Маскоўскую дзяржаву (Масковію) і Вялікае княства Літоўскае. У розныя часы тут пабывалі польскі вучоны прафесар Кракаўскага мп'версітэта. аўтар «'Грактата аб дзвюх Сарматыях» (1517) і «Хронікі палякаў» (1519) Мацей Мяхоўскі (Мехавіта) , пасол Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмунд Герберштэйн (1517 і 1526). італьянскі купец Рафаэле Барберыні (1565). пасол

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свяшчэннай Рымскай імперыі Ганс Кабенцль фон Просег (1575), нямецкі падарожнік Самуэль Кіхель з Ульма (1586). англійскі пасол Джайлз Флетчар (1591), рэзідэнт Швецыі ў Расіі Іёган дэ Родэр (каля 1655). член пасольства германскага імператара Лўгусцін Майерберг (1661-1663). амстэрдамскі бургамістр і вучоны Мікалай Вітсэн (1664). сакратар пасольства Свяшчэннай Рымскай імперыі Іёган Георг Корб (1698-1699) і іншыя заходнееўрапейцы. Усе яны зафіксавалі ў сваіх нататках і працах нямала каштоўных звестак пра жыццё. побыт, народную культуру насельніцтва Усходняй Нўропы. у тым ліку і Беларусі.

Асабліва цікавыя звесткі пакінуў Сігізмунд Перберштэйн'. У 1516-1517 гг. і 1526-1527 гг. ён двойчы прыязджаў у Маскву і Ноўгарад. Вынікам гэтых падарожжаў стала кніга «Запіскі аб Масковіі», у якой асобны раздзел прысвечаны Беларусі - «Аб Літве». Разумеючы пад Літвой ВКЛ. ён пісаў: «Бліжэй за усіх да Масковіі Літва. Я гавару цяпер не пра адну толыю вобласць. але аб краінах, якія да яе прылягаюць і разумеюцца пад агульгіай назвай Літва. Яна цягнецца доўгай паласой ад горада Чаркасы, які знаходзіцца ля Барысфена [Дняпра), аж да Лівоніі». У іншым месцы Нерберштэйн называў беларускія землі Руссю. сцвярджаючы. што большай часткай Русі валодае вялікі князь маскоўскі. а астатнімі яе часткамі - вялікі літоўскі князь Жыгімонт.

Паводле Нерберштэйна. « усе гарады на заходнім беразе Дняпра былі «падпарадкаваны каралю польскаму. тыя ж, што ляжаць па ўсходняму берагу, падуладны гаспадару Маскоўскаму. акрамя Дуброўны і Мсціслава. якія знаходзяцца пад уладай Літвы». Лўгар разглядаў рэкі Баларусі адносна іх прыналежпасці да розпых басейнаў. Прыпяць. Гур і Бярэзіну адносіў да басейна Дняпра. Буг, Неман і Нараў, паводлс яго. цякуць па поўнач. Адзначыў такую адметную рысу Беларусі. як балоты. таксама называў яе «даволі лясістым краем». Праязджаючы з Вілы-п' ў Полацк. ён часта бачыў «вялікія і нязмерна працяглыя лясы. што распасціраліся на 50 нямецкіх міляў». Дарогі былі блытаныя. Арыентырамі звычанна служылі капцы. на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія кожны вандроўнік павінен быў падкінуць камень або сухую галіну. Часам заломваліся сукі. рабіліся зассчкі на дрэвах ці на абчэсаных камлях выпальватіся магнацкія гербы. Але разбойпікі. піша Перберштэйн. часам усталё'ўвалі ілжэзнакі. каб завабіць абозы ў непраходныя нетры. Таму падарожжа па Беларусі. з Вільні да Полацка. здалося Герберштэйну не толькі цяжкім. шіе і небяспечным. Аўтар піша пра гарады Крэва. Гродна («замак і горад драўляны»). умацаваны Менск. Звяртае ўвагу на тое. што у Барысаве Бярэзіна суднаходная. Герберштэйн прыкмеціў, што праваслаўныя жыхары перамешаны з «чужымі. іншамоўнымі і іншавернымі плямёнамі». Аўтара здзіўляла бяспраўнае етановішча прыгоннага сялянства і дробнай шляхты. Болыласць падарожнікаў называлі Беларусь Літвой або Руссю. ІПто датычыцца тэрміна «Белая Русь». то ў XV- XVI ст. ён ужываўся вельмі шырока і непаслядоўна .

Для чужаземных падарожнікаў адметнымі рысамі ВКЛ былі суровыя зімы з маразамі і мноствам снегу, вялікая колькасць лясоў. рэчак і балотаў. Як правіла, яны скардзілся на сцюжу. Герберштэйн пісаў пра жорсткія маразы. моцны вецер. падобны да віхуры. неверагодную глыбіню снежных сумётаў і непраглядныя завеі. Падарожнікі добра апісалі беларускія рэкі і азёры. А. Маерберг падрабязна апісаў Днепр і яго прытокі. ІПмат увагі надаецца апісанню густых. непраходных лясоў, расліннага і жывельнага свету Беларусі. Чужаземцы скардзіліся на дарогі ў дрэнным стане. Што датычыцца мастоў, то яны у той час былі часовымі і трымаліся не на сваях, а на плоскіх суднах. напрыклад, у Оршы.

Падарожнікі зрабілі апісанне сродкаў транспарту. корчмаў. якія называліся Пачакай, Вясёлая, Зладзейка, Рым. Выгода. Засталося шмат звестак аб гарадах Беларусі: Мінску, Барысавс. Магілёве, Оршы, Полацку, Віцебску. Ваўкаеыску, Пінску, Слоніме і інш. Іншаземцаў здзіўляла гасціннасць мясцовых жыхароў. Б.Танер пісаў: «Тутэйшыя жыхары вельмі гасцінныя: мы прабылі восем дзён, і яны ўдосталь забяспечвалі нае рознымі прыпасамі: півам. мёдам. водкай. віном. шчодра кармілі нашых коней». У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цэлым замежныя падарожнікі заставілі шмат запісаў аб гаспадарчым жыцці. гандлі. гістарычных помніках і гарадской архітэктуры ВКЛ .

Публікацыі за.ходнееўрапейцаў пра Беларусь падштурхоўвалі і мясцовых пісьменнікаў узяцца за пяро. тым больш што ў працах іншаземцаў было нямала выдумкі, праяў тэндэнцыйнасці і нястрыманай фантазіі.

**3. Традыцыйная культура ў творах пісьменнікаў-лацаністаў і ў краязнаўчай літаратуры XVI-XVII стст.**

Трэба адзначыць, што лацінамоўная літаратура таго часу застаецца яшчэ для сённяшняга чытача ў пэўным сэнсе іеіта інсоййіа. Між тым яна мае надзвычай важнае значэнне для ўзнаўлення гісторыі нашай культуры. у ёй трэба шукаць зародкі беларускага нарадазнаўства. Да літаратуры гістарычна-краязнаўчага характару ўмоўна можна аднесці і асобныя мастацкія творы пісьменнікаў-лаціністаў розных часоў. Асобныя ўзоры вуснай народнай градыцыі (легенды. паданні. парэміі) ужыў Ян Вісліцкі. аўтар гістарычнай паэмы «Пруская вайна» (1515). у якой уславіў перамогу на Тэўтонскім ордэнам", здабытую ў выніку народнага змагання. Вопыт Яна Вісліцката. верагодна. выкарыстаў аўтар ліра-эпічнай паэмы «Песня пра зубра» (1522) " Мікола Гусоўскі (1470-1533). Паэма ўзнікла з жадання аўтара расказаць заходнееўрапейскаму чытачу пра родную зямлю. яе прыроду. гісторыю. звычаі. Як вядома. твор быў напісаны для папы рымскага Льва X. які зацікавіўся далёкай д.ія яго радзімай М. Гусоўскага і. у прыватпасці. паляваннем на паселыііка тутэйшых лясоў - зубра.

Асаблівай увагі заслугоўваюць працы аднаго з найбольш значных пісьменнікаў-краязнаўцаў другой палавіны XVI першай палавіны XVII ст. Яна Ласіцкага (каля 1534 пасля 1599).

Нарадзіўся Ян Ласіцкі (польск.: .іап Тазіскі) у Мазовіі (Польшча). дзе і атрымаў першапачатковую адукацыю. У 1556 г. выехаў за мяжу. Вучыўся. працаваў. удзельнічаў у культурным і грамадскім жыцці Германіі, Італіі. Францыі, Швейцарыі. Пасля 25 гадоў блуканняў па Гўропе наняўся па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

службу да мінскага кашталяна Яна Глябовіча ў якасці выхавальніка яго трох сыноў. Жыў то ў радавой рэзідэнцыі Глябовічаў у Вільні. то ў Дубровах. Радашковічах. то ў новым замку ў Заслаўі, дзе. як мяркуюць даследчыкі. і памёр. Дваццацігадовы перыяд жыцця Яна Ласіцкага ў Беларусі быў самым плённым, прынёс яму поспехі ў знаёмстве з мясцовымі старажытнасцямі. а таксама і народнай творчасцю. Якраз у час прабывання ў Беларусі, а пасля і ў Літве ён аддаецца вывучэнню галоўным чынам «гісторыі першабытных вераванняў і этнаграфіі народнасцей. якія пражывалі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай». Такой народнасцю былі ў першую чаргу беларусы.

Для беларускай фалькларыстыкі найбольшую цікавасць мае кніга Я. Ласіцкага «Пра рэлігію. ахвярапрынапіэнні. вясельныя. пахавалыіыя абрады русінаў, маскавітаў, татар...» (1 582)'Х якую склалі матэрыялы з розных крыніц. у тым ліку і ўласныя назіранні аўтара. Гэту працу Я. Ласіцкі прысвяціў свайму новаму апекуну Яну Глябовічу.

У кнізе знаходзім шмат звестак пра звычаі. абрады. матэрыяльную культуру. народную творчасць беларусаў XVI ст. Аб тым, што звесткі адносяцца менавіта да гэтых насельнікаў краю. якіх аўтар называе «русінамі» і «рутэнцамі». сведчань геаграфічныя назвы. што ўпамінаюцца ў тэксце: 1 Іолацк. Вільня. Дрыса, Палата. Дняпро і інш. ІДікава, што аўтар карыстаешда ўжо і самім тэрмінам «Белая Русь». у межах якой ён называе Полацк і Тураблю і Тураў) і якую адрознівае ад зямель «суседніх маскавіцян».

Больш за ўсё звестак пра Бедарусь знаходзім у раздзеле, які мае назву «Аб рэлігіі русінаў, маскавітаў і татар, вясельных і пахавальных абрадах, ежы, адзенні і інш., а таксама аб рэлігіі і звычаях татар праўдзівы і дакладны расказ, паведаны пісьмова высокашаноўнаму Давіду Хітрэю». У пачатку аўтар паведамляе. што хоча выканаць ранейшае абяцанне - расказаць адрасату «тое-сёе пра рэлігію русінаў і іх звычаі». Пры гэтым ён агаворваецца. што тое. аб чым ён піша. «не ўзята з кніг». не выдумана: «Мы пададзім толькі тое. што бачылі сваімі вачыма». Праўда, аўтар з пагардай ставіцца да «русінаў». якіх ён называе «варварамі». і шкадуе. што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«найярчэйшае святло евангелля не азарыла ягачэ іх цалкам». Да таго ж ён не ведаў яшчэ іх мовы, і таму гаварыць з імі яму даводзілася пры дапамозе перакладчыка.

Асабліва падрабязна расказвае Я. Ласіцкі пра шлюбныя звычаі і абрады «русінаў». Юнак. якому спадабалася дзяўчына. спачатку пасыдае ў яе дом сватоў. якія ўсяляк імкнуппа пераканаць бацькоў аддаць дачку. Бацькі ж. каб яшчэ больш падахвопіпь жаніха, адмаўляюць сватам. выдумляючы якуіонебудзь прычыну. Калі бацькі адмаўляюць не жартам. не дзеля «падахвочвання» еватоў. а ўсур'ёз. тады жаніх вырашае завалодаць дзяўчынаю сілай. Для гэтага ён падбірае групу сяброў, якія. улучыўшы зручны момант, крадуць нявесту і дастаўляюць яе да жаніха. Праз колькі часу. калі нявеста пажыла ў доме жаніха. ён адсылае яе са сваімі пасланцамі дадому. Пасланцы імкнуцца апраўдаць перад бацькамі нявесты ўчынак жаніха. растлумачваючы ўсё гэта моцным каханнем. Бацькам нічога не застаецца. як даць згоду па шлюб. 3 такой жа падрабязнасцю. як і пра етаражытны звычай выкрадання нявесты (дарэчы. гэта адзінае ў нас поўнае яго апісанне), апавядае Я. Ласіцкі і пра абрад вянчання маладых у храме, пра асобныя элементы ўласна вяселля. Не менш цікавыя звесткі пра пахавальныя абрады. запісаныя з многімі важнымі падрабязнаспямі. Аўтар. напрыклад. паведамляе. ппо нябожчыка звычайна кладуць на стол і цэлую гадзіну мыюць цсплай вадой. прычым робяць гэта ноччу. Памыўіпы. яго пераносяць на «ложа». якое сгавяць пасярод хаты, каб радня і блізкія маглі аддаць яму пашану. Даецца такса.ма апісапне пахавальнай працэсіі. абраду развітання з нябожчыкам каля магілы. Адначасова аўтар падае ўзоры народных га:іашэнняў. якія ў сваёй аснове всльмі нагадваюпь сучасныя: «О найдаражэйшы. чаму ты сыходзііп з вачэй нашых? Хіба цябе забі.п' няетачы'? Ці ты хацеў вызваліцца ад путаў нсшчаелівага шлюбу?..» і г. д. Гэтыя галашэнні над магілай працягваюцца. па сцверджанні аўтара. болып чым паўіары гадзіны.

З належнай грунтоўнасцю апісвае аўтар таксама памінкі, на якія яго запраніалі. Ён іпюў т\ды. <(каб лепей паназіраць за іх норавамі і звычаямі». Ласіцкі падае многа надзвычай цікавага з павер'яў. народных спосабаў лячэння розных хвароб. апісвае элементы звычаёвага права. еж\. адзенне. жыллё. музычныя інструменты, расказвае пра гандаль, паляванне на куніц і баброў і ішп.

Пасмяротна выйшаў твор Яна Ласіцкага «Пра багоў самагітаў. іншых сарматаў і несапраўдных хрысціян» (Базель. 1615) першы сісгэматычны выклад балцкіх язычніцкіх вераванняў. таксама напісаны на лацінскай мове '. Але асобныя моманты іх духоўнай культуры часам параўноўваюцца з адпаведнымі момантамі «іншых сарматаў». у тым ліку з культурай насельнікаў Беларусі. Ласіцкі ў гэтай прапы апісаў багоў. пра якіх ніхто болып не ўспамінаў.

На жаль, да нас дайшла нязначная часгка спадчыны пісьмеппікаў лапініетаў. Хутчэй за ўсё іх працы так і засгаліся ў рукапісах. Болыпасць гэтых манускрыптаў незваротна загінула, аля няма^гіа. трэба думаць, захоўваецца ў архівах у нас і за мяжой. Гэтыя працы. якія захоўваюць у сабе шмаг цікавейшых звестак пра нашых продкаў. чакаюць яшчэ сваіх даследчыкаў.

## 4. Саламон Рысінскі – першы даследчык беларускай парэміялогіі

Пра пашырэнне цікавасці да народнай кулыуры беларусаў у XVI XVII стст. яскрава сведчыць гворчаснь прадстаўніка тагачаснага пісьменсгеа на лацінскай мове Саламона Рысінскага. якога можна назваць адным з першых беларускіх фалькларыстаў-парэміёлагаў .

Нарадзіўся Саламон Рысінскі (лат. Зоіотопіз Кізіптз (РапіЬегаз) у 1570/1585 гг. у вёсцы Рысіна/Рысін. ііпо знаходзілася, па адных меркаваннях, над Полацкам. па другіх, -непадалёк ад Клімавіч. на Магілёўшчыне. Адукацыю ён атрымаў. як і іншыя найболып здольныя юнакі з Беларусі ў Заходняй Гуропе. дзе. напэўна. і пазнаў «розныя народы і розныя гарады». У

1582 годзе вучыўся ў Лейпцыгу. затым выкладаў у Жамойці і Малой Польшчы. У 1586 годзе паступіў у Альтдорфскнй універсітэт. запісаўшыся 8оІоітю РапіЬегаз Геіісогаззпз (Ьенсогшзш са старажытнагрэцкай мовы беларус). У лісце сябру Конраду Рытэрсхаўзэну называў сваю краіну - Гепсогоззіа (са старажытнагрэцкай мовы Беларусь). Рысінскі самаакрэсліўся як беларус даволі рана. У гэты час ніхто на бацькаўшчыне Рысінскага такімі назвамі не карыстаўся. Ужыва'ііся назвы Літва і Русь. русіны і літвіны. На прыклад Францыск Скарына запісаўся ў Кракаўскі ўніверсітет як літвін (Гігініапнз). а ў Пад\анскі якрусін (РіііЬеішз).

Звесткі нра жыццё першага вядомага навуцы ча,чавека. які еам сябе назваў беларусам. а сваю краіну Беларуссю, няпоўныя. Вядома. што пасля 1586 г. С. Рысінскі вярнуўся ў Беларусь у двор магната Крыштофа Мікалая Радзівіла (Перупа). Жыў спачатку ў Дзяляцічах. а потым пасяліўся у мястэчку Любчы. дзе і пражыў да канца жыцця. Вядома. што ён быў выхавальнікам сына магната, якога вазіў для далейшай вучобы у Парыж. Памёр С. Рысінскі ў 1625 г. у Дзяляцічах. Пахаваны ў Любчы. Над яго магілай загадана было «паставіць высокі светлы мураваны помнік. а каля таго слупа насыпаць велічны курган».

С. Рысінскі выдаў на лацінскай мове некалыо кніг самага featnага зместу і вартасці. сярод якіх трактат аб паходжанні роду Радзівілаў. творы кальвініоцка-пратэстанскага кірунку, філалагічныя і гістарычныя працы.

Самую шырокуго вядомасць атрымала найбольш значная праца С. Рысінскага «Польскія прымаўкі» . выдадзеная у 1618 г. У кнізе было змешчана 18 «цэнтурый». г. зн. 18 соцень прыказак і прымавак і яшчэ адна няпоўная «цэнтура». Кожная з гэтых соцень была падзелена на пранумараваныя дзесяткі. Размяшчадіся ўсе прыказкі і прымаўкі ў алфавітным парадку- па іх першай літары. Падаваліся яны на польскай і лацінскай мовах.

Аснову кнігі склалі прыказкі і прымаўкі. запісаныя С. Рысінскім у ваколіцах Любчы. Гэта сцвярджае сам укладальнік у прысвячэнні-прадмове

свайму сябру - віленскаму купцу, які. верагодна. фундаваў выданне кнігі: «Прыказкі нашы не з кніг узяты. а сабраны з доугай практыкі і старанных назіранняў». Гэтыя жамчужыны народнай мудрасці лавіў ён, па яго выразу. «вухам ад людзей самага рознага роду». але ў першую чаргу запісваў іх ад простых сялян.

Добра разумеючы. што зварот да творчасці ніжэйшых слаёў грамадства быў далека. не модны і яго прыхільныя адносіны да народнай культуры сустрэнуць рэзкую крытыку «эстэтаў». ён загадзя даваў ім адказ: «Калі б мнс далей зрабілі папрок за тое. што я сабраў у кнізе непрыстойныя прымаўкі і прыказкі з вуснаў простанароддзя. гады б. як шчытом, я абараніўся б ад такіх атак парадай вучоных асоб: «Сцеражыся падабацца кожнаму. бо ўсім і так адзін ніколі дагэтуль не дагадзіў і дагадзіць не здолее».

Пераважная большасць прыказак і прымавак была запісана ў Беларусі. і гэта відаць з аналізу Вінцэся Каратынскага. які добра ведаў беларускі фальклор. Уважліва вывучыўшы сабраны С. Рысінскім матэрыял. ён прыйшоў да высновы. што «большая частка выслоўяў. змешчаных у яго працы. жыве дагэтуль у вуснах наднёманскага люду, на беларускай мове». Прычым. заўважае В. Каратынскі. «у кніжцы ёсць значная колькасць выслоўяў. якія ў аддаленых ваколіцах невядомыя». У якасці прыкладу ён прыводзіць такія з іх, як «Багаты дзівіцца. чым бедны жывіцца». «Учарашняга дня шукае», «Ні села. ні пала». «Дзіця не плача - маці не здагадаецца. што яно хоча», «Даюнь хлеба густа. каді зубоў у губе пуста». Тут прымаўкі і пра чалавечую дабрыню («Розум без дабраты - меч у вар'ята»). і пра выхаванне («Не народзіць сава сокала»). і пра ўзаемападтрымку народа («Людзі для нае будавалі. а мы для людзей»). Адлюстраваны розныя чалавечыя заганы («Гарэ.тка. як злодзей: і не згадаеш. як падкрадзецца». «Дзіця і іГяны праўду екажуць», «Дай яечка. ды яшчэ і аблупленае». «Таму, хто рабіць не хоча. і мука рукі коле»), сацыяльныя супярэчнаеці («На чыім возе едзеш. таму і песенькі спявай») і інш. Такім

чынам. С. Рысінскі адзін з першых у Рэчы Паспалітай паказаў, якое культурнае багацце хаваецца ў народзе.

У зборнік) С. Рысінскага знаходзім нямала і антыклерыкаіьных прыказак. многія з якіх высмейвалі маратьнае аблічча духавенства: «Праца - хлоп. сквапнасць - поп». «Ваўку авечак даверылі». «Хто хоча пражыць добра дзень - няхай зарэжа сабе гусь, хто тыдзень хай парсюка заколе. хто месяц - хай вала заб'е, хто цэлы год хай жонк) возьме.. а хто да смерці - хай ксяндзом стане». «Манаху. даўшы есці, трэба даць і ў мяшкх панесці».

Сваёй кнігай ён прымусіў адукаваны свет па-новаму паглядзець на народ. на яго старажытн\ю культурў. На бытаванне ў беларускай мове запісаных С. Рысінскім прымавак звярнулі ўвагу і сённяшнія даследчыкі яго спадчыны. якія прыводзяць у якасці доказу такія з іх. як «Б'юць і плакаць не даюць». «Дзе людзі бяднеюць. там паны багацеюць». «Аднаго разу казала рэдзька: я добрая з мёдам, а мёд кажа: чорт пябе просіць. я добры і без цябе». «Прыйшоў нястатак. забраў астатак». «Панская хвароба беднага здароўе». «Заўсёды трэба на заднія колы аглядацца». «Славен бубен за гарамі». «Адно - васемнаццаць. а другое без двух дваццаць». Усе гэтыя прыказкі зафіксавшіі ў свой час ў Беларусі І. Насовіч і М. Федароўскі.

С. Рысінскі быў нс проста збіральнікам парэмій. але і іх дасдедчыкам. Ён паказвае іх культурную каштоўнасць. значэнне для навукі і народнай асветы. выпрацоўвае іх сістэматызацыю, спосаб падачы пры публікацыі. Яго прадмову-прысвячэнне можна назваць першым навуковым даследаваннем прыказак і прымавак, у якім праявілася добрая тэарэтычнай падрыхтоўка аўтара. Праца С. Рысінскага аказала вялікі ўплыў на далейшае развіццё ў Рэчы Паспалітай. а пазней і ў Беларусі парэміяграфіі. Усс яго паслядоўнікі — збіральнікі і даследчыкі народных прымавак і прыказак — нязменна звярталіся да гэтай кнігі і абапіраліся па яе. Сабраныя там номнікі народнай мудрасці на працягу вякоў выкарыстоўвадіся ў працах самых розных дзеячаў культуры і літаратуры. Асабліва папулярнай была кпіга С. Рысінскага ў яго час: з 1618 па 1634 г. яна перавыдавалася ў розных гарадах Рэчы Пасналітай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6 разоў. Алс пасля 1634 г.. нягледзячы на вялікі попыт на яе аматараў жывога народнага слова. яна не выходзіла больш чым дзвесце гадоў. Тут ёсць свая заканамернасць: з сярэдзіны XVII ст. у Рэчы 1 Іаспа.пітай назіраецца актывізацыя рэакцыйных сіл контррэфармацыі на чале з ордэнам езуітаў. іх нястрымны наступ на духоўнае жыццё грамадства.

Будучы нецярпімымі да любога праяўлення вальнадумства. адступніцтва ад каталіцызму. езуіты імкнуліся падпарадкаваць сабе ўсю адукацыю ў Рэчы Паспалітай. кпігавыдавецкую справу. Усё. што не адпавядала догматам каталіцызму. няшчадна знішчалася. За час дзейнасці езуітаў было знішчана, аддадзена агню незлічоная колькасць здабыткаў вялікіх эпох Рэнесанса і Рэфармацыі.

Гэтым можна растлумачыць гой факт, што да нашага часу дайшлі ўсяго лічаныя кнігі С. Рысінскага, і то не ўсіх выданняў. Гзуіты імкнуліся знішчыць памяць аб славутым вальнадумцу. У гэтым пераканаўся і В. Каратынскі. які дарэмна шукаў у Любчы ў сярэдзінс XIX ст. пастаўлены па загаду Крыштофа Радзівіда помнік выдатнаму дзеячу нашай кульгуры канца XVI пачатку XVII ет. ці хоць якія небудзь сляды яго дзейнасці: «Вялікія памяткі пратэстантызму так старанна тут вынішчаны. што ні ма.гіейшага знаку ад друкарні, школы. збору і нават нратэстанцкіх могілак не засталося ў Любчы. Над мястэчкам запанавала цемра. і памяць. скіраваная да магіл. анямела». Як справядліва заўважыў В. Каратынскі адносна справы С. Рысінскага. яго «крохкая папера перажыла каменную пабудову».

Помнікі літаратуры XVI-XVII стст. сярод якіх выключнае месца належыць зборніку мшіых жанраў фальклору Саламона Рысінскага. засведчылі багацце духоўнай кульгуры нашага народа. На жаль, падобныя крыніцы з пункту гледжання фалькларыстыкі вывучаны яшчэ вельмі слаба.

## Раздзел II. Развіццё народазнаўства ў канцы XVIII – пач. XIX стст.

## Тэма 3 Пачатак сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Пытанні*

1. Збіральнік фальклору.
2. Палявыя даследаванні.
3. Методыка збіральніцкай працы.
4. Асноўныя паняцці збірання фальклору.

*Літаратура*

Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард ; пад рэд. П.Церашковіча. – Мінск : Тэхналогія, 1995. – 478 с.

Кабашнікаў, К.П. Методыка збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці / К.П. Кабашнікаў. – Мінск. 1978.

Программа для комплексних фольклорных экспедиций / Отв.ред. В.Е.Гусев. – М., 1971.

Савушкина Н.И. О собирании фольклора / Н.И. Савушкина . – М., 1974.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**1. Збіральнік фальклору**

Асаблівасцю антрапалагічных навук з'яўляецца метад непасрэднага назірання. Ён патрабуе, каб даследчык жыў сярод людзей, якіх вывучае. Гэтыя людзі павіны быць яму цікавымі і паважанымі ім. У такім выпадку, як правіла, носьбіты традыцыі адкрытыя і шчырыя з тымі, хто іх вывучае. Вось што казалі індзейцы пуэбла пра еўрапейцаў XIX стагоддзя: «Мы не разумеем белых. Яны заўсёды нечага дамагаюцца, увесь час хвалююцца, нешта высочваюць. Як гэта разумець? Мы не ведаем. Мы не здольны іх зразумець. У іх такія вострыя насы, такія тонкія жорсткія вусны, такія рысы ў іх на тварах. Мы думаем, што ўсе яны вар'яты» [Юнг, с. 218]. Гэта – адзін з найяскравых прыкладаў таму, што звычайна паміж носьбітам традыцыйнай культуры і навукоўцам-даследчыкам існуе культурны бар'ер, абумоўлены розным выхаваннем і светапоглядам, таму збіральніку заўсёды трэба быць вельмі карэктным і ўважлівым.

З б і р а л ь н і к фальклору – *асоба, якая выяўляе ў народным асяродку фальклорныя творы і фіксуе іх*. Можа быць як прафесіяналам, так і аматарам. Збіральнікі ствараюць фальклорныя архівы пры навуковых (архівы Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, Інстытута

расійскай літаратуры і мастацтва АН Расіі, Інстытута мастацтвазнаўства, фальклору і этнаграфіі АН Украіны) і навучальных (архіў кабінета народнай музыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, архіў ПНДЛМЭ Львоўскай музычнай акадэміі) цэнтрах, асабістыя прыватныя архівы і калекцыі фальклору. Сярод збіральнікаў еўрапейскага фальклору былі выбітныя літаратары (Вальтэр Скот, Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Мікалай Кацюбінскі) і кампазіртары (Мікалай Рымскі-Корсакаў, Карл Орф, Бэла Бартак, Ігар Стравінскі, Ларыса Сімаковіч).

Галоўная мэта збіральнікаў у XXI стагоддзі, калі ўжо існуюць буйныя архівы фальклору (дзе занатаваны падрабязна апісаныя фальклорныя помнікі) – спрыяць захаванню нематэрыяльнай культурнай спадчыны свайго народа праз выяўленне яшчэ не занатаваных фальклорных помнікаў і праз перадачу матэрыялаў даследаванняў асобам, якія займаюцца аднаўленнем, захаваннем і рэвіталізацыяй мясцовага рэгіянальнага фальклору – кіраўнікам дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў. Натуральна, гэта трэба рабіць, калі сам збіральнік не валодае фальклорнымі жанрамі (што сёння ўжо шкодзіць справе захавання фальклору). Калі ён займаецца выканальніцкай практыкай – ён павінны выкарыстоўваць свой архіў як аснову рэпертуара – свайго ці свайго калектыва. Фальклярыст Сяргей Старасцін сцвярджаў, што не ўяўляе, як можна не заспяваць і не заіграць фальклор пасля яго збірання. Сам ён выдатна асвалодаў манерай народных спеваў і выканальніцтвам на курскім ражку менавіта ў час фальклорных экспедыцый пры непасрэдным кантакце з носьбітамі.

**2. Палявыя даследаванні**

У экспедыцыях паўстае шмат праблем: фінансаванне, харчаванне, жытло, стан здароўя збіральніка, дазвол на даследаванне ад мясцовых улад і носьбітаў традыцыі). Але без палявых даследаванняў нельга называцца фальклярыстам, антраполагам, этнолагам. Менавіта праз палявую працу фальклярысты набываюць кваліфікацыю сапраўдных спецыялістаў: пашыраецца іх светапогляд, пераасэнсоўваюцца каштоўнасці, мацуецца кантакт з носьбітамі традыцыі. Калі няма кантакта з носьбітамі – няма

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якасных і навукова карысных вынікаў даследавання. Каб быць прынятымі ў асяродку людзей – аб'ектаў вывучэння, мы павіны наладзіць добрыя адносіны з імі. Даследчыкі павінны быць пільнымі пры выкарыстанні сабранай інфармацыі і сачыць, каб вынікамі даследаванняў маглі карыстацца і навукоўцы, і людзі, якіх яны вывучалі.

Да прафесійных палявых даследаванняў трэба загадзя рыхтавацца: знаёміцца з выдадзенымі па рэгіёну даследавання этнаграфічнымі матэрыяламі, складаць план экспедыцыі (з фармулёўкай кірунку, праблемы, гіпотэзы, сродкаў і метадаў даследавання), афармляць камандзіровачныя дакументы, замаўляць транспартныя сродкі на праезд, рыхтаваць відэа- і гуказапісываючую апаратуру і інфармацыйныя носьбіты (касэты, флэш-карты, дыскі, блакноты і асадкі і г.д.), размяркоўваць абавязкі паміж удзельнікамі фальклорнай экспедыцыі. Пра абавязкі і сферу дзейнасці кожнага з удзельнікаў экспедыцыі варта дамаўляцца загадзя: павінны быць вызначаны кіраўнік экспедыцыі, адказны за відэафіксацыю, аўдыёфіксацыю, пашпартызацыю фальклорных помнікаў, інтэрв'юіраванне носьбітаў, за бытавое забеспячэнне экспедыцыі, за падрыхтоўку і афармленне будучых матэрыялаў экспедыцыі.

**3. Методыка збіральніцкай працы**

Методыка збіральніцкай працы ў фалькларыстыцы – *сукупнасць навукова абгрунтаваных прыёмаў збірання і запісу фальклору, якімі карыстаюцца фалькларысты-прафесіяналы і аматары.* Асновы фалькларыстычных методык заклалі ў XIX стагоддзе Арэст Мілер, Пётр Кірэеўскі, Павел Шэйн, у XX стагоддзе іх удасканалілі Барыс і Юрый Сакаловы, Рыгор Шырма, Кірыл Чыстоў, Віктар Гусеў, Канстанцін Кабашнікаў, Зінаіда Мажэйка, Тамара Варфаламеева, Алена Боганева.

Методыка збірання фальклору ўсталёўвае *задачы* і акрэслівае *сферу дзейнасці* (арганізацыйна рэгулюе працэс фіксацыі) збіральнікаў, спрыяе авалодванню збіральнікамі *тэхнікай запісу* фальклору. У якасці задач, якія вырашае абраная методыка, можа быць пастаўлена: *франтальнае (сплашное) абследаванне рэгіёну* з выяўленнем і запісам усіх бытуючых у ім відаў і жанраў фальклору; *выяўленне і запіс твораў аднаго жанру*; *паўторны*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*запіс* і інш. У рабоце з інфарматарам (зараз часцей ужываецца дэфініцыя *этнафор*) збіральнік можа выкарыстоўваць наступныя прыёмы: *інтэрв'ю, апрос, анкетаванне, тэсты, апісанне* і інш.

**4. Асноўныя паняцці збірання фальклору**

Пры сістэмных палявых даследаваннях выкарыстоўваюцца спецыфічныя прыёмы, якія забяспечваюць прафесіяналізм збору і прэзентацыі помнікаў фальклору для іх будучага выкарыстання ў навуковай дзейнасці (архівізацыі, навуковых эдыцыях, прадстаўленні на навуковых форумах) і соцыякульурнай практыцы (аднаўленні, рэканструкцыі і рэвіталізацыі фальклору). Гэтыя прыёмы адлюстраваны ў асноўных паняццях збірання фальклору, (асноўных паняццях методыкі збіральніцкай працы) такіх, як *анкетаванне, франтальнае даследаванне рэгіёну, запіс паўторны, фіксацыя, расшыфроўка.*

У адрозненне ад спантаннай нефармальнай размовы ***анкетаванне*** – збіранне фальклору па загадзя створанаму апытальніку. Апытальнікі часам ствараюць для збору дадзеных у адным кірунку – спеўным, харэаграфічным, календарна-абрадавым і г.д. Пры ***франтальным даследаванні*** рэгіёну комплексна вывучаецца фальклорны матэрыял (паэтычны, музычны, драматычны, харэаграфічны, дэкаратыўна-ужытковы, характэрная манера выканання) паселішча, шэрагу населеных пунктаў, раёна ці мясцовасці. Пры гэтым экспедыцыі сумяшчаюцца са стацыянарнымі даследаваннямі з далучэннем мясцовых краязнаўцаў, настаўнікаў-філолагаў, культработнікаў. ***Запіс паўторны*** (фіксацыя ўжо вядомага навуцы помніка фальклору) у ідэале праводзіцца ад аднаго і таго ж выканаўцы праз час. Ён дапамагае даследаваць асаблівасці творчага метада этнафора, устойлівасць тэкста, характар вар'іравання і імправізацыі. З пэўнай доляй умоўнасці сюды можна аднесці запіс у гэтым жа населеным пункце ад іншых выканаўцаў, якія працягваюць традыцыю выканаўцы першага запісу. ***Фіксацыя*** фальклорнага тэкста ці мелодыі (працэс *ручнога* ці *тэхнаёмкага* запісу помніка народнай творчасці) праводзіцца як а)*слыхавы запіс* (нотамі ў працэсе выканання

музычнага твора), б) *знакавы запіс* (з дапамогай сістэмы сімвалаў для абазначэння харэаграфічных рухаў), в) *аўдыё-* ці *відэазапіс*. Патрабаванні да навуковай фіксацыі – захаванне фанэтыкі і сінтаксічнага строя маўлення; дыялектных адрозненняў ад літаратурных нормаў; музычных танальнасці, ладу, рытмікі і метра; улік выканаўчых прыёмаў; рэгістрацыя рэмарак этнафора; дакладная пашпартызацыя тэксту; дастатковая тэхнічная якасць запісу. ***Расшыфроўка*** (націраванне) – гэта т.зв. «белавы» запіс фальклорнага помніку з дапамогай літар ці нотных знакаў, без скарачэнняў і пропускаў («чарнавікоў»), характэрных пры палявой працы.

**Тэма 4. Навуковая спадчына заснавальніка славяназнаўства З. Даленгі-Хадакоўскага (1784 - 1825)**

*Пытанні*

1. Біяграфія З. Даленгі-Хадакоўскага
2. Даследчая дзейнасць З. Даленгі-Хадакоўскага

*Літаратура*


- Аксамітаў А. Ля вытокаў беларускага мовазнаўства: Са спадчыны Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага /А.Аксамітаў // Роднае слова. 1992. № 5.
- Аксамітаў А. С., Малаш Л. А. 3 душой славяніна: Жыццё і дзейнасць З. Я. Даленгі-Хадакоўскага/А.Аксамітаў. - Мн., 1991.


1. У 1801 скончыў Слуцкае павятовае вучылішча. У 1801—1804 праходзіў юрыдычную практыку ў Навагрудку. Працаваў у Мінску хатнім настаўнікам, прыватным адвакатам. У Мінскім архіве пазнаёміўся з выданнямі Статута ВКЛ, старажытнымі граматамі і актамі на старабеларускай, лацінскай і польскай мовах. У 1805 здаў экзамен па юрыспрудэнцыі і атрымаў патэнт на права кіравання маёмасцю, у 1807—09 працаваў каморнікам і аканомам маёнтка графа Ю. Несялоўскага, у бібліятэцы якога, пазней (у 1814—18) у бібліятэках А. Чартарыйскага ў Пулавах (Польшча) і Крамянецкага ліцэя пазнаёміўся з навуковымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выданнямі Варшавы, Вільні, Пецярбурга. Асаблівы уплыў на фарміраванне навуковых і грамадскіх поглядаў З. Даленгі-Хадакоўскага зрабілі працы польскага вучонага Т. Чацкага, французскіх асветнікаў Вальтэра, Ж.-Ж. Русо, П. Гольбаха.

Арыштаваны царскімі ўладамі 24.3.1809 за выказаную ў прыватным лісце прыхільнасць да антыпрыгонніцкіх ідэйНапалеона. Пасля 7 месяцаў зняволення ў Петрапаўлаўскай крэпасці быў пазбаўлены шляхецтва і накіраваны салдатам у Омск. У 1811 у Бабруйску імітаваў утапленне; уцёк у Варшаву, уступіў у французскую армію. Менавіта пасля паражэння французаў у вайне 1812 супраць Расіі мусіў хавацца і ўзяў псеўданім Даленга-Хадакоўскі. У 1813—1818 падарожнічаў па Беларусі, Польшчы, Украіне; працаваў у архівах і бібліятэках; даследаваў гарадзішчы; запісваў фальклор, дыялектную лексіку, абрады. 14.12.1818 упершыню ў Беларусі і Літве атрымаў ад Віленскага ўніверсітэтаадкрыты ліст (дазвол) на права раскопак. У 1818 выдаў сваю галоўную працу «Пра славяншчыну да хрысціянства», якая прынесла яму шырокую вядомасць. У 1819 стаў членам-карэспандэнтам Варшаўскага Таварыства сяброў навук, членам Пецярбургскага Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці; у 1820 — Маскоўскага Таварыства гісторыі і старажытнасцяў расійскіх. Адным з першых абгрунтаваў ідэю славянскай агульнасці ў дагістарычны час

2. З. Даленга-Хадакоўскі шмат падарожнічаў, збіраў прадметы матэрыяльнай культуры, запісваў фальклор, мясцовыя гаворкі. Першы сярод славянскіх вучоных звярнуўся да духоўнай культуры простага народа як крыніцы гісторыі. Упершыню ў славяназнаўчай яавуцы перанёс сістэму даследаванняў з помнікаў пісьменнасці на зямлю і яе помнікі. На гарадзішчах, якія раскопваў у Полацку, Віцебску, Тураве, Бабруйскім павеце, каля Брэста, Гомеля, Магілёва, у в. Старое Сяло Віцебскага павета бачыў помнікі высокаарганізаванага духоўнага жыцця славян, імкнуўся па іх вызначыць мяжу рассялення старажытных славян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Згодна з распрацаванай ім тэорыяй гарадзішчаў усе старажытныя землі славяншчыны падзяляліся на ўчасткі плошчай каля 1 кв. мілі, у цэнтры якіх было гарадзішча, а навакольныя паселішчы мелі аднакарэнныя назвы. На гарадзішчах, што размяшчаліся высока над ракой або возерам і былі абнесены валам, выконваліся рэлігійныя дзействы (ахвярапрынашэнні, урачыстасці, гульні) пад кіраўніцтвам жраца або князя. З. Даленга-Хадакоўскі адзначыў адносную роўнасць членаў абшчыны, размеркаванне рэлігійных і ваенных функцый племянных правадыроў. Падабенства назваў славянскіх паселішчаў таксама, на яго думку, сведчыць аб спрадвечным адзінстве славян. Гарадзішчы даследчык лічыў выключна славянскай з'явай і на падставе сваёй тэорыі і этнамоўных даных спрабаваў устанавіць межы старажытнага рассялення славян і лакалізацыю іх асобных плямён ад Урала і Камы да Эльбы і ад Адрыятыкі да Паўночнай Дзвіны.

Адзін з першых абгрунтаваў ідэю славянскай агульнасці ў дагістарычны час. Яго мэтай было імкненне раскрыць этнагенез славян і напісаць гісторыю агульнаславянскага перыяду, выкарыстаўшы для гэтага археалагічныя, тапанімічныя, этнаграфічныя і фальклорныя даныя. Склаў карту старажытнага рассялення славян, узняў пытанне аб прарадзіме славян і іх сувязях з балцкімі народамі. Крытыкуючы ў «Даследаваннях адносна рускай гісторыі» (1819) некаторыя палажэнні «Гісторыі дзяржавы Расійскай» М. Карамзіна, удакладніў межы рассялення крывічоў (ад Пскова і Смаленска да Гродна і Нёмана), а таксама палачан, літоўцаў, аспрэчваў нарманскую тэорыю паходжання рускай дзяржавы, не дапускаў неабгрунтаванай мадыфікацыі мінулага, некрытычнага выкарыстання прац замежных аўтараў. Адзначыў у працах Карамзіна больш за 20 памылковых сцвярджэнняў і фактаў, звязаных з гісторыяй Беларусі (межы паміж беларускімі, літоўскімі і рускімі пасяленнямі, тэрыторыя рассялення ўсходнеславянскіх плямён у IX ст., месца знаходжання Нямігі, дзе адбылася бітва, апісаная ў «Слове пра паход Ігаравы», і інш.). Вельмі карысным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лічыў тапанімічны і гідранімічны матэрыял, у якім захаваўся ўвесь слоўнік першапачатковых карэнных выразаў.

Вывучаў старажытныя шляхі зносін на Беларусі: Кіева з Полацкам па Дняпры, Бярэзіне, Свіслачы, Ушчы, Віліі, па р. Нарач і воз. Нарач праз сістэму іншых азёр у Дзісну і Заходнюю Дзвіну, Заслаўя з Нёманам праз Пціч і Усу, якім карысталіся германцы, а таксама магчымыя шляхі зносін паміж дрыгавічамі, валынянамі і крывічамі па Прыпяці. Грунтоўна прааналізаваў «Спіс рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» і прадатаваў час яго напісання 1430 годам. У працы «Пра славяншчыну да хрысціянства» (1818) упершыню спрабаваў апісаць старажытнаславянскі побыт, культуру і народную творчасць у дахрысціянскі перыяд, намеціў план комплекснага даследавання славянскіх і кантактных з ім народаў. У «Праекце вучонага падарожжа па Расіі для вытлумачэння старажытнай славянскай гісторыі» (1820) і «Гістарычнай сістэмы Хадакоўскага» (апубл. 1838) абгрунтаваў прынцып збору фальклору і дыялектнай лексікі, упершыню ў славістыцы паказаў ролю тапанімікі для гістарычных даследаванняў, склаў рэестр агульнаславянскіх тапонімаў, у т.л. беларускіх, вызначыў тэрыторыю пашырэння беларускай мовы.

З. Даленгу-Хадакоўскаму належыць першая спроба сістэматычнага ўсвядомленага запісвання з элементамі навуковай пашпартызацыі славянскага фальклору. Яго навуковая і збіральніцкая дзейнасць была ўзорам для еўрапейскіх даследчыкаў П. Шафарыка, І. Сразнеўскага, П. Кірэеўскага, К. Тышкевіча,Я. Тышкевіча, К. Вуйціцкага, Ю. Крашэўскага, І. Ракавецкага, Л. Галамбёўскага і праграмай для навукова-літаратурных аб'яднанняў Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіны.

**Тэма 5 Віленскі ўніверсітэт як цэнтр навукі і грамадазнаўчай думкі**

*Пытанні*

1. З гісторыі ўніверсітэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Культура Беларусі ў канцы XVIII - першай чвэрці XIX ст.

3. Унёсак інтэлігенцыі ў беларусазнаўства.

*Літаратура*

1 Аксамітаў А. Ля вытокаў беларускага мовазнаўства: Са спадчыны Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага /А.Аксамітаў // Роднае слова. 1992. № 5.

2 Куль-Сяльвестрава, С. Культура Беларусі ў канцы XVIII - сярэдзіне XIX ст. /С. Куль-Сяльвестрава. – рэжым доступу: http://jivebelarus.net/culture/culture-belarus-at-18-19-century.html

1. Віленскі ўніверсітэт – адна з лепшых у Еўропе вышэйшая навучальная ўстанова беларуска-літоўска-украінскай дзяржавы (былога Вялікага Княства Літоўскага), заснаваная ажно ў 1579 годзе езуітамі. Гэта навучальная ўстанова прайшла эвалюцыю ад калегіуму езуітаў на 160 навучэнцаў праз акадэмію (1579, прывілей Стэфана Баторыя) і Галоўную школу ВКЛ (секулярызацыя Эдукацыйнай камісіі 1781) да ўніверсітэта (акт Аляксандра I 1803).

**Віленскі езуіцкі калегіум**

На аснове парафіяльнай школы езуіты 27 верасня 1570 года заснавалі ў Вільні калегіум, разлічаны на 160 навучэнцаў.

**Віленская акадэмія**

Мовай выкладання ў акадэміі была лаціна, як тады было прынята ў Еўропе, а выкладчыкі паходзілі з розных частак Рэчы Паспалітай. Першым рэктарам стаў Пётр Скарга. Акадэмія першапачаткова складалася з двух факультэтаў — філасофскага і тэалагічнага. У 1641 кароль і вялікі князь Уладзіслаў Ваза выдаў прывілей на заснаване медыцынскага і юрыдычнага факультэтаў — у тым жа годзе юрыдычны факультэт быў створаны.

У 1735—1737 гг. пасаду рэктара займаў Кароль Бартольд.

Віленская акадэмія была адзінай вышэйшай школай у ВКЛ. Да найбольш вядомых вучоных, звязаных з гэтым перыядам вучэльні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

належаць Мацей Сарбеўскі — паэт, які пісаў па-польску і па-лацінску, Войцех Віюк-Каяловіч — гісторык, Марцін Смігleцкі — аўтар папулярнага па ўсёй Еўропе падручніка логікі. Акадэмія была важным цэнтрам контррэфармацыі ў ВКЛ. У XVIII ст. у акадэміі распрацаваныя правілы літоўскай мовы і ўпершыню распачаты друк на ёй у межах ВКЛ. У 1753 адкрытая абсерваторыя, а пры ёй — фізічны і астраномічны факультэты.

У 1773 Ордэн езуітаў быў скасаваны, а акадэмія перайшла ва ўладанне дзяржавы.

**Галоўная школа Вялікага княства Літоўскага**

Пасля скасавання Ордэна іезуітаў (1773) Віленская акадэмія ў 1781 ператвараецца ў Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага (лац.: *Schola Princips Magni Ducatus Lithuaniae*) — свецкую вучэльню, рэфармаваную Адукацыйнай камісіяй. Пачынаецца выкладанне па-польску і па-літоўску на некаторых факультэтах — літаратуры і гісторыі Польшчы і Літвы, прыродных і матэматычных навук. Гэты перыяд час пэўнага росквіту навучальнай установы, хаця пры нацыянальна-культурным заняпадзе ў ВКЛ школа і была паланізаваная. У той жа час школа мела найлепшы ў Рэчы Паспалітай медыцынскі факультэт, створаны прыехаўшым з Вены Ёганам Петэрам Франкам.

**Галоўная віленская школа**

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай пераіменавая на Галоўную віленскую школу і на нейкі час страціла свой былы статус і веліч.

**Імператарскі Віленскі ўніверсітэт**



Вялікі двор Віленскага ўніверсітэта і касцёл Св. Янаў (1840-1850-я)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісаным 4 (16) красавіка 1803 года імператарам Расійскай імперыі Аляксандрам I актам Галоўная віленская школа пераўтворана ў Імператарскім Віленскім універсітэтам і робіцца цэнтрам адукацыі для васьмі губерняў Віленскай,Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Валынскай, Падольскай, Кіеўскай.

Некаторы час, да паўстання 1830—1831 гг., універсітэт зазнае час росквіту. Да найбольш вядомых вучоных гэтага часу, звязаных з універсітэтам, належацьЯн Снядэцкі, Анджэй Снядэцкі, Іаахім Лялевель, Міхал Ачапоўскі, Сімонас Даўкантас, Іозеф Франк. Вучыліся тут Адам Міцкевіч, Юліуш Славацкі. Колькасць студэнтаў узрасла ад 290 у 1804 да 1321 у 1830. У 1823 годзе вучэльня стала найбуйнейшай у Расіі і Еўропе, пераважаючы па колькасці студэнтаў Оксфардскі ўніверсітэт.

Напачатку XIX ст. універсітэт складаўся з 4 факультэтаў: фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычны (з багаслоўем), літаратурны з мастацтвамі. Было 32 кафедры, выкладалася 55 прадметаў. Да Універсітэта належылі: батанічны сад, анатамічны музей, клініка, фізічная і хімічная лабараторыі, бібліятэка на 60000 тамоў.

2. Культура Беларусі ў канцы XVIII - першай чвэрці XIX ст. была цесна звязана з культурамі суседніх народаў. У многіх галінах - выяўленчым мастацтве, літаратуры, тэатры, навуцы яна дасягнула еўрапейскіх вышынь. У гэты час фарміраваліся яе самабытнасць, непаўторныя традыцыі. Але працэс развіцця культуры Беларусі скажаўся і стрымліваўся палітыкай царскіх улад.

У канцы XVIII - першай чвэрці XIX ст. гэта палітыка спрыяла інтэнсіўнай паланізацыі Беларусі, што закрывала беларускай культуры шлях да прафесіяналізацыі. Русіфікацыя, распачатая царскім урадам у другой чвэрці стагоддзя і асабліва ўзмацніўшаяся пасля паўстання 1830 - 1831 гг., зноў не пакідала беларусам месца і магчымасцяў для развіцця нацыянальнай культуры. Царскі ўрад, не забараняючы афіцыйна беларускую мову, перакрываў ёй шлях да прыгожага пісьменства. Асабліва моцна пашкодзіла станаўленню новай беларускай мовы забарона друкаваць на лацінцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выдадзеная ў сувязі з цэнзурным разглядам перакладу "Пана Тадэвуша" В.Дуніна-Марцінкевіча. Такім чынам, даволі вялікае кола беларускіх пісьменнікаў, якія выйшлі з польскамоўнага асяроддзя і карысталіся лацінкай, былі пазбаўлены магчымасці друкаваць свае творы. Беларуская мова разглядалася царскімі ўладамі як адзін з дыялектаў мовы рускай і дазвалялася толькі ў фальклоры.

У канцы XVIII - першай палове XIX ст. ў культурным жыцці Беларусі вызначылася шмат новых з'яў і працэсаў. Змены, якія адбываліся ў розных галінах культуры ў гэты перыяд, былі абумоўлены як логікай самога гісторыка-культурнага працэса, так і новымі з'явамі ў эканоміцы, палітычным і сацыяльным жыцці грамадства. Фактарамі, якія ў гэты час аказвалі найістотнейшы ўплыў на фарміраванне новых культурных працэсаў, былі эканамічнае развіццё Беларусі, складванне буржуазных адносін у нетрах феадальнага ладу, утварэнне беларускай нацыі, каланіяльная палітыка расійскага самаўладдзя, актыўны нацыянальна-вызваленчы рух, інтэнсіўнае ўзаемадзеянне з культурамі іншых народаў.

Найбольш характэрнай праявай новага этапу ў развіцці культуры Беларусі была яе дэмакратызацыя. Яна праявілася ва ўзнікненні новых формаў арганізацыі культурнага жыцця, якія рабілі культурныя каштоўнасці больш даступнымі (перыядычня друк, камерцыйны тэатр, мастацкія выстаўкі, ланкастарскія школы і інш.), а таксама ў змене ідэйнага ладу культуры (развіццё рэалізму ў літаратуры і мастацтве, звяртанне да традыцыйнай культуры, фальклору і г.д.). Ідэйны змест культуры значна ўзбагачаецца і ўскладняецца, адбываецца хуткая змена ідэйна-стылявых кірункаў (**класіцызм**, **сентыменталізм**, **рамантызм**, **рэалізм**). Культура становіцца ў гэты час полем вострай і напружанай ідэалагічнай барацьбы, а самі творы літаратуры і мастацтва - сродкамі такой барацьбы.

3. Вызначальнай з'явай гісторыка-культурнага працэса на Беларусі ў канцы XVIII - першай палове XIX ст. было паступовае фарміраванне беларускай нацыянальнай культуры. Пасля гэтага паступова ўводзілася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руская мова. Нягледзячы на існаванне прыгонніцтва, саслоўны падзел грамадства, іншыя праявы феадальнага ладу, якія стрымлівалі працэс складвання новай беларускай культуры, а таксама насуперак памкненням улад затрымаць беларускую культуру на ўзроўні фальклору,уздымаецца новая хваля беларускага нацыянальнага адраджэння. Свайго найвышэйшага ўзроўню яна дасягнула ў 40-50-я гг. У гэты час закладваюцца тыпалагічныя, характэрныя рысы культуры беларусаў, пачынаецца яе прафесіяналізацыя, ствараюцца нацыянальны тэатр, літаратура, іншыя галіны мастацтва, навукі, асветы.

Адной з найбольш важных галін духоўнага жыцця ў канцы XVIII - першай палове XIX ст. была асвета. У гэты час у сістэме адукацыі адбываюцца значныя змены, якія праявіліся ў стварэнні сістэмы свецкай адукацыі і павелічэнні колькасці навучальных устаноў розных тыпаў. Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі царскі ўрад захаваў агульны кірунак асветніцкай палітыкі, распрацаванай у часы Адукацыйнай камісіі. У 1802 г. пачалася школьная рэформа, якая на тры дзесяцігоддзі вызначыла стан асветы на Беларусі. У 1803 г. Галоўная літоўская школа была перайменавана ў Віленскі універсітэт, які з'яўляўся навучальным і адміністрацыйным цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, у якую ў гэты перыяд уваходзілі Беларусь, Літва і частка Украіны. Ва ўніверсітэце дзейнічалі тайныя студэнцкія арганізацыі філарэтаў, філаматаў. У 1823 годзе па справе аб прыналежнасці да іх былі арыштаваныя і пасля доўгатэрміновага трымання за кратамі высланыя ў розныя гарады Расіі дзясяткі навучэнцаў, сярод якіх і Адам Міцкевіч. Адам Чартарыйскі быў адхілены ад універсітэту, яго месца заняў Мікалай Навасільцаў (1768—1838).

Акрамя вышэйназваных навучальных устаноў на Беларусі ў першай трэці XIX ст. дзейнічала сетка вучылішчаў пры каталіцкіх кляштарах і базыльянскіх манастырах. Яны давалі сярэднюю адукацыю і прыраўноўваліся да павятовых вучылішчаў ці гімназій. Сярод гэтых навучальных устаноў вылучалася Полацкая езуіцкая акадэмія, якая па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзроўні адукацыі набліжалася да вышэйшай навучальнай установы. Аднак у 1820 г. езуіты былі выгнаны з Расійскай імперыі, а на месцы Полацкай акадэміі створаны кадэцкі корпус. Колькасць навучальных устаноў пры каталіцкіх кляштарах і базыльянскіх манастырах на працягу першых дзесяцігоддзяў XIX ст. скарачалася па загаду ўлад, а ў 1832 г. яны былі пераўтвораны ў свецкія навучальныя ўстановы.

У 1821 г. на тэрыторыі Беларусі пачалося распаўсюджванне школ узаемнага навучання (ланкастарскіх). Адной з першых такіх школ была школа для сялян, адкрытая ў Шчорсах Храптовічам. Але ўжо цераз пяць гадоў гэтыя школы былі забаронены і з'явіліся зноў толькі ў канцы 30-х гг. XIX ст.

Асобныя навучальныя ўстановы існавалі ў гэты час для яўрэяў, якія складалі тады значную частку гарадскога насельніцтва Беларусі. Адукацыя гэтай часткі гараджан мела пераважна рэлігійны характар.. У 1844 г. была праведзена рэформа яўрэйскіх навучальных устаноў, уведзены першы, не лічачы яўрэйскай мовы, свецкі прадмет - руская мова.

На Беларусі працавалі таксама прыватныя вучылішчы і пансіянаты. Жаночая адукацыя адбывалася менавіта праз гэтыя навучальныя ўстановы і хатніх настаўнікаў.

У першай чвэрці XIX ст. сістэма асветы на Беларусі, асабліва ў заходняй яе частцы, была значна спаланізавана. Польская мова з'яўлялася асноўнай мовай выкладання, дзеці вывучалі польскую гісторыю і літаратуру. Сітуацыя стала паступова змяняцца пасля раскрыцця тайных таварыстваў у навучальных установах. Уводзіцца выкладанне рускай мовы ў якасці абавязковага прадмета, польская гісторыя замяняецца гісторыяй Расіі. У гэты час змяняецца кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі і універсітэта. Новы куратар М.Навасільцаў пачынае праводзіць паступовую русіфікацыю універсітэта, замяняе "нядобранадзейных" выкладчыкаў. Але Віленскі універсітэт і пасля рэпрэсій сярэдзіны 20-х гг. не страчвае свайго значэння як галоўнай навучальнай ўстановы і навуковага асяродка Беларусі і Літвы. Тут

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнічаюць чатыры факультэты - фізіка-матэматычны, медыцынскі, маральна-палітычных навук, літаратуры і прыгожых мастацтваў, а таксама настаўніцкая і духоўная семінарыі. Штогод на ўсіх аддзяленнях універсітэта вучылася больш за 1 тыс. чалавек, тут меліся выдатная бібліятэка, батанічны сад, астранамічная абсерваторыя, анатамічны музей, лабараторыі. Універсітэт меў еўрапейскую славу, вакол яго гуртаваліся лепшыя сілы мясцовай інтэлігенцыі.

Пасля паўстання 1830 - 1831 гг. царскі ўрад падвяргае сістэму адукацыі новым пераўтварэнням. 1 мая 1832 г. Мікалай I падпісвае ўказ аб закрыцці Віленскага універсітэта. Гэта было не толькі пакаранне за ўдзел студэнтаў у паўстанні, але і імкненне знішчыць "гнездо вольнодумства", якім улады справядліва лічылі універсітэт. Выкладанне ва ўсіх тыпах навучальных установ пераводзіцца на рускую мову. На ўсходзе Беларусі польская мова выключаецца з праграмы выкладання, на захадзе выкладаецца толькі як асобны прадмет па скарочанай праграме. Настаўнікі, якія не валодаюць рускай мовай, адхіляюцца ад выкладання. Сярод іншых важных падзей у галіне асветы неабходна адзначыць адкрыццё ў 1840 г. ў Горы-Горках земляробчай школы, якая ў 1848 г. была пераўтворана ў земляробчы інстытут, а таксама адкрыццё кадэцкага корпуса ў Брэсце.

У канцы 50-х гг. на тэрыторыі Беларусі пачынаюць адкрывацца "училища для поселянских детей" - пачатковыя школы для сялян, якія ўтрымліваліся часткова на сродкі дзяржавы, а часткова - праваслаўным святарствам і самімі сялянамі. Вясковых дзяцей вучылі рускай мове, пачаткам арыфметыкі, малітвам. Адной з галоўных мэт гэтых школ была русіфікацыя беларускага сялянства і прыцягненне яго да праваслаўя. Адкрыццё такіх школ, падтрыманае дзяржавай, мела масавы характар. Толькі ў Гродзенскай губерні з 1859 па 1862 г. было адкрыта 223 такіх школы. Аднак з-за нізкага ўзроўню выкладання яны не давалі і не маглі даваць паўнацэннай адукацыі сялянскім дзецям. Большасць з гэтых школ існавала толькі на паперы. Не лічачы гэтых пачатковых школ для сялян, у пачатку 60-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

х гг. XIX ст. на Беларусі налічвалася 167 навучальных устаноў усіх тыпаў, у тым ліку адна вышэйшая, 12 сярэдніх, 45 прыватных і дзяржаўных жаночых вучылішчаў, 21 духоўнае вучылішча. Пачатковых школ для сялян у 1863 г. налічвалася згодна са справаздачамі чыноўнікаў навучальнай акругі больш за 700. Але колькасць вучняў у навучальных установах Беларусі была невялікай: адзін вучань прыходзіўся на 200 чалавек насельніцтва.

Навуковае жыццё Беларусі ў першай палове XIX ст. было звязана з дзейнасцю выкладчыкаў Віленскага універсітэта, Горы-Горацкага земляробчага інстытута, а таксама з даследаваннямі энтузіястаў-аматараў.

У Віленскім універсітэце значнага развіцця дасягнулі дакладныя навукі. Выдатны ўклад унёс у матэматыку і астраномію Ян Снядэцкі, які працяглы час быў рэктарам універсітэта. Дзякуючы яму ў Вільні была адкрыта астранамічная абсерваторыя, яго падручнік па сферычнай трыганаметрыі лічыўся найлепшым у Еўропе і быў выдадзены ў Лейпцыгу. Брат Яна Снядэцкага Андрэй - выдатны біёлаг і хімік - таксама працаваў ва універсітэце. Яго пяру належыць фундаментальная праца "Тэорыя арганічных рэчываў", дзе Андрэй Снядэцкі на падставе эмпірычных даных біялогіі стварыў стройную навуковую тэорыю арганічнай хіміі.

Выкладчыкі універсітэта ўнеслі значны ўклад у развіццё медыцыны, фізіялогіі, гісторыі, літаратуры і іншых навук. Гэтыя галіны пазначаны імёнамі прафесара батанікі і заалогіі С.Юндзіла, прафесара медыцыны А.Бекю, фізіёлага М.Гамаліцкага, прававедаў І.Даніловіча і Ю.Ярашэвіча, мовазнаўцы І.Лабойкі.

Не страцілі і сёння сваёй навуковай вартасці працы прафесара універсітэта І.Лялевеля, які быў заснавальнікам рамантычнай школы польскай гістарыяграфіі, а ў 30-я гг. стаў адным з кіраўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі, у Літве і Польшчы.

У Горы-Горацкім земляробчым інстытуце выдатныя вынікі былі дасягнуты ў галіне хіміі і біялогіі. Тут працавалі пачынальнік хімічнай навукі на Беларусі К.Д.Шміт, выдатны хімік і педагог І.Цютчаў і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значных поспехаў дасягнулі ў канцы XVIII - першай палове XIX ст. гістарычная навука, этнаграфія, археалогія, краязнаўства. Як асобная галіна ведаў пачало складвацца беларусазнаўства. Гэтыя галіны навуковых ведаў пазначаны знакамітымі імёнамі Т.Нарбута, З.Даленгі-Хадакоўскага, А.Кіркора, П.Шпілеўскага, К.Калайдовіча, М.Балінскага, Р.Зянькевіча і іншых даследчыкаў. Значную ролю ў развіцці гістарычнай навукі, краязнаўства і этнаграфіі адыгралі браты Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы. Па ініцыятыве Я.Тышкевіча былі створаны Віленскі музей старажытнасцяў і Віленская археалагічная камісія. Напачатку 60-х гг. у Віленскім музеі налічвалася больш за 10 тыс. адзінак захавання, у тым ліку выдатная нумізматычная калекцыя, археалагічныя матэрыялы, гравюры, карціны, рукапісы. У бібліятэцы музея, якая мела больш за 20 тыс. тамоў, знаходзіліся першадрукі, старажытнейшыя рукапісныя кнігі, сабраныя з розных мясцін Беларусі і Літвы. Віленская археалагічная камісія, пакуль яе ў 1865 г. не закрылі па загадзе Мураўёва, займалася выяўленнем і друкаваннем старажытных дакументаў, летапісаў. Яна выдавала "Записки Виленской археологической комиссии", дзе друкаваліся не толькі гістарычныя крыніцы, але і навуковыя рэфераты мясцовых даследчыкаў. Цікаўнасць да вывучэння мінулага Беларусі, яе культуры, мовы і народных традыцый сведчыла аб працэсе нацыянальнага адраджэння беларусаў, аб складванні беларускай нацыі, якая такім чынам усведамляла сябе ў часе і прасторы.

Адметнай рысай культурнага жыцця Беларусі ў першай палове XIX ст. з'яўлялася інтэнсіўнае развіццё літаратуры і журналістыкі. Першая палова XIX ст. была часам станаўлення новай беларускай літаратуры. У большасці з напісаных імі твораў адчуваецца выразнае сацыяльнае гучанне, імкненне да адлюстравання самабытнасці беларускага народа.

## Тэма 6 Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Я.Чачота, У.Сыракомлі і Ю.Крашэўскага

*Пытанні*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Я.Чачота.

2. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына У.Сыракомлі.

3. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Ю.Крашэўскага.

*Літаратура*

1 Аксамітаў А. Ля вытокаў беларускага мовазнаўства: Са спадчыны Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага /А.Аксамітаў // Роднае слова. 1992. № 5.
2 Куль-Сяльвестрава, С. Культура Беларусі ў канцы XVIII - сярэдзіне XIX ст. /С. Куль-Сяльвестрава. – рэжым доступу: http://jivebelarus.net/culture/culture-belarus-at-18-19-century.html

**1. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Я.Чачота.**

Ян Антоні Чачот (1796 - 1847) паэт, фальклярыст, этнограф, адзін з найбуйнейшых дзеячоў беларуска-польскага фальклёрна-літаратурнага сумежжа XIX ст.

Ян Чачот сабраў каля тысячы аўтэнтычных народных песень і выдаў іх у шасьці зборніках[50]. Па вяртаньні з высылкі, наладзіўшы кантакты з памочніцамі-карэспандэнткамі і ў выніку назапасіўшы багаты фальклёрны матэрыял, Ян Чачот падрыхтаваў іх да друку пад агульнаю назваю «Сялянскія песьні…». У сваіх выданьнях паэт вызначаў канкрэтную асьветніцкую задачу: выклікаць у пануючых клясаў і адукаванай публікі роднага краю цікавасьць да духоўнага жыцьця сялянства, зьвярнуць увагу на маральна-этычную зьместоўнасьць і эстэтычную каштоўнасьць сялянскай песьнятворчасьці, прывіць ім павагу да здабыткаў народнае культуры. У прадмове да свайго зборніка ён заклікаў недакладна пачаць зьбіраньне беларускага фальклёру:

У першых зборніках Ян Чачот публікаваў «крывіцкія» песьні ў перакладах на польскую мову, аднак у выданьні «Сялянскія песьні з-над Нёмана і Дзьвіны» 1844 году ён апублікаваў дзевятнаццаць арыгінальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускіх песень «з тэкстам арыгіналу». Працягам працэсу збліжэньня Яна Чачота зь беларускім словам стаў апошні зборнік «Сялянскіх песень…», выдадзены ў 1846 годзе. У яго ўвайшлі арыгінальныя валачобныя, вясеньнія, купальскія, калядныя, дажынкавыя ці летнія, вясельныя, хрэсьбінныя і іншыя беларускія народныя песьні. Да таго ж тут быў зьмешчаны верш «Да мілых мужычкоў», напісаныя Чачотам па-беларуску.

Фальклярыстычна-вэрсыфікацыйная праца Яна Чачота мела даволі шырокі рэзананс сярод перадавой грамадзкасьці. Зборнікі «Сялянскіх песень…», якія выдаваліся ім на працягу дзевяці гадоў (1837—1846), выклікалі зацікаўленыя водгукі ў пэрыядычным друку. Сучасьнікі паэта прыхільна ставіліся да яго дзейнасьці, аднак вынікі яе ўспрымалі і ацэньвалі па-рознаму.

Мовазнаўчая дзейнасьць. Ян Чачот меў магчымасьць грунтоўна азнаёміцца з двума асноўнымі масівамі беларускіх гаворак: паўночна-ўсходнім дыялектам альбо надзьдзьвінскай гаворкай (праца на Лепельшчыне) і паўднёва-заходнім альбо наднёманскай гаворкай (дзяцінства на Наваградчыне). У сваёй лексыкаграфічнай працы «Некаторыя крывіцкія ідыёмы (уласназвы) з Наваградзкага павета» і ў прадмовах да «Сялянскіх песень з-над Нёмана і Дзьвіны» беларускую мову, у пераважнай бальшыні выпадкаў, паэт называе «крывіцкім дыялектам» альбо «славянакрывіцкай мовай». Такім чынам, Я. Чачот працягвае традыцыю ўжываньня тэрміна «крывіцкі» ў дачыненьні да насельніцтва Беларусі. Разумеючы ўсю сукупнасьць беларускіх гаворак як адно цэлае, часам раўназначна ўжывае тэрмін «язык» і «мова» і ставіць «крывіцкі дыялект» нароўні з польскім, рускім і ўкраінскім:

Ян Чачот упершыню паставіў пытаньне аб прынцыпах будучага «крывіцкага» правапісу. Ён зазначае, што цяжкасьць заключаецца ў немагчымасьці прымірыць вымаўленьне і этымалёгію:

Публіцыстыка. Ян Чачот таксама выявіў сябе ў якасьці публіцыста і глыбокага мысьляра. У архіве філяматаў захаваўся тэкст ягонае прамовы на паседжаньні таварыства 7 траўня 1821 году «Пра будучае прызначэньне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Таварыства філяматаў, пра варыянты яго сёньняшняй будовы, пра тое, наколькі адпавядаюць яны нашым мэтам», а таксама артыкулы «Думкі для ніжэйшай клясы» і «Думкі, якія павінна пашыраць вышэйшая кляса». У гэтых працах аўтар разважаў над тым, як пашырыць гуманістычныя ідэі філяматаў у асяродзьдзі суайчыньнікаў, а таксама ў ідэалістычна-рамантычным духу фармуляваў стрыжнёвыя паняцьці філямацкага гуманізму: што такое шчасьце, хто такі сапраўдны грамадзянін, дзеля чаго мусіць існаваць рэлігія, якую шкоду грамадзтву нясуць маральная распушчанасьць, празьмернасьць і раскоша, якую карысьць даюць ашчаднасьць, працавітасьць, якім чынам можна пашырыць асьвету ў родным краі, якія навукі найбольш патрэбныя гэтаму краю і якія існуюць шляхі паляпшэньня хатняга выхаваньня.

Моўныя адметы. Польская мова Яна Чачота ў паэтычных творах і карэспандэнцыі паэта зазнала моцны ўплыў народнае гаворкі Наваградчыны, тым самым набыўшы яскравы рэгіянальны лексычны закрас, што выявілася ў вялікай колькасьці правінцыяналізмаў і зваротаў. Як адзначае Станіслаў Станкевіч, паэт сьвядома не пазьбягаў уплыву на сваю творчасьць мясцовага фальклёру.

**2. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына У.Сыракомлі.**

Уладзісла́ў Сырако́мля (сапраўднае імя Людвік Уладзіслаў Францішак Кандратовіч (1823 - 1862) паэт, драматург і краязнаўца. Мовамі ягоных твораў былі польская і беларуская.

Зьвяртаўся да гісторыі краю, вераваньняў, звычаяў, вуснай паэзіі беларускага народу, паэтызаваў гераічнае мінулае продкаў. Дэбютаваў вершам «Паштальён» (1844), паводле пачутай у Міры гісторыі («народнай гутаркі»). Пераклад «Паштальёна» на расейскую мову паэтам Л. Трэфалевым зрабіўся папулярнай у Расеі народнай песьняй «Когда я на почте служил ямщиком…».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як добры знаўца фальклёру, вуснай паэзіі беларусаў раскрыўся ў «Кароткім дасьледаваньні мовы і характару паэзіі русінаў Менскай правінцыі» (1856). Вывучэньню Беларусі прысьвяціў гістарычна-краязнаўчыя працы «Вандроўкі па маіх былых ваколіцах» (1853), «Менск: беглы агляд сучаснага стану Менску» (1857), «Нёман ад вытокаў да вусьця» (1861) і інш.

Падтрымліваў цесны зьвязак зь менскім літаратурным асяродзьдзем. За антыцарскія вершы быў арыштаваны. Пісаў па-польску, зь беларускамоўных твораў захаваліся толькі два — верш «Добрыя весьці» (1848, 1861) і лірычная мініятура «Ужо птушкі пяюць усюды».

Зьяўляецца аўтарам некалькіх п’есаў, якія ставіліся віленскім тэатрам. З драматычных твораў У. Сыракомлі найбольшай папулярнасьцю карысталася п’еса «Kasper Kaliński».

Перакладаў на польскую мову творы разнастайных расейскіх, французскіх, украінскіх, нямецкіх і лацінскіх паэтаў. Сярод найбольш значных працаў — пераклады твораў Гётэ, Гайнэ, Лермантава, Шаўчэнкі, Някрасава, Бэранжэ і іншых. Творы У. Сыракомлі лічацца аднымі з найлепшых перакладаў паэзіі ў гісторыі польскай мовы.

Зьяўляецца аўтарам двухтомнай «Гісторыі літаратуры ў Польшчы» (1851—1852) і іншых твораў.

## 3. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Ю.Крашэўскага.

Юзаф Крашэўскі (1812 - 1887) беларускі і польскі пісьменнік, гісторык і фальклярыст. Быў прафесійным мастаком, музыкантам. Пісаў па-польску, лічыцца адным з найвялікшых польскіх пісьменнікаў. Пачынальнік польскай рэалістычнай прозы. Член Польскай АН у Кракаве (1872), Ганаровы член Чэшскай АМ (1873).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Юзаф Крашэўскі напісаў больш за 600 тамоў твораў: 223 раманы і аповесці, навуковыя працы па гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, літаратуразнаўстве, філасофіі і інш.

Наватарская канцэпцыя чалавека-працаўніка выяўлена ў цыкле аповесцей «Уляна» (1843), «Хата за вёскай» (1855), «Гісторыя калка ў плоце» (1860) і інш. Вострая крытыка шляхты і арыстакратыі ў сацыяльна-бытавых раманах «Чарадзейны ліхтар» (1843—44), «Два светы» (1856), «Могілкі» (1874) і інш. Падзеі паўстання 1863—64 адлюстраваны ў раманах «Дзіця Старога Горада» (1863), «Мы і яны» (1865), «Дзядуля» (1869) і інш. Для раманаў «Апошняя з слуцкіх князёў» (1841), «Сеймавыя сцэны» (1875), «Кунігас» (1882), «Маці каралёў» (1883), «Кароль у Нясвіжы. 1784» (1887) і інш. характэрны зварот да мінуўшчыны Беларусі, дакументальнасць. Сярод лепшых гістарычных раманаў — саксонская трылогія «Графіня Козель» (1874), «Бруль» (1875), «З часоў Сямігадовай вайны» (1876), а таксама «Старое паданне» (1876) — першы твор з цыкла 29 раманаў, прысвечаных гісторыі Рэчы Паспалітай.

Аўтар зборнікаў «Паэзія» (т. 1—2, 1838) і «Гімны смутку» (1857), паэтычнай трылогіі з гісторыі Літвы «Анафеляс» (1840—45), 20 драматычных твораў, у т.л. камедый з дзеяннем у Нясвіжы «Кастэлянскі мёд» (1860), «Пане Каханку» (1867).

У падарожных нарысах «Пінск і Піншчына» (1837), «Успаміны пра Палессе, Валынь і Літву» (1840), «Карціны з жыцця і падарожжаў» (1841—42), «Друскенікі» (1848), этнаграфічным нарысе «Адзенне сялян і мяшчан з ваколіц Брэста, Кобрына, Пружан» (1860) апісаў беларускія мясціны і жыхароў Беларусі. Аўтар гістарычных прац «Вільня ад яе пачатку да 1750 г.» (т. 1—4, 1840—42), «Старажытная Літва. Яе гісторыя, законы, мова, вера, звычаі, песні...» (1847—50), «Барысаў» (1848), «Польшча ў час трох падзелаў» (т. 1—3, 1873—75) і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 7. Даследаванні беларускай міфалогіі П.М.Шпілеўскага (1823 – 1861)**

*Пытанні*

1. Творчы шлях П.М.Шпілеўскага.

2. Народазнаўчая спадчына П.М.Шпілеўскага.

3. Крытыка даследаванняў П.М.Шпілеўскага.

*Літаратура*

1 Шпілеўскі, П. Падарожжа па Палесьсі і Беларускім Краі / П.Шпілеўскі. - Мінск, 1993.

2 Шпілеўскі, Павел. Беларусь у абрадах і казках / П. Шпілеўскі /пераклад з рускай Аляксандра Вашчанкі. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. – 304 с.

**1. Творчы шлях П.М.Шпілеўскага.**

Павел Міхайлавіч ШПІЛЕЎСКІ (1823 – 1861) — беларускі этнограф, публіцыст, літаратурна-мастацкі крытык, пісьменнік і перакладчык.

Нарадзіўся ў сям'і святара. У 1837—1843 вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі, у 1843—1847 — у Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Акадэмію скончыў са званнем кандыдата багаслоўя, быў прызначаны выкладчыкам славеснасці ў Варшаўскае павятовае духоўнае вучылішча. Праз пяць гадоў пераехаў у Санкт-Пецярбург. Са снежня 1853 працаваў пакаёвым наглядчыкам у Галоўным педагагічным інстытуце, а з красавіка 1855 — настаўнікам у школе пры экспедыцыі падрыхтоўкі дзяржаўных папер.

**2. Народазнаўчая спадчына П.М.Шпілеўскага.**

Зьмясьціў цікавыя зьвесткі з гісторыі местаў, мястэчак і вёсак Беларусі, апісаньні побыту, павер’яў, абрадаў і звычаяў беларускага народу, становішча сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. Адзначыў сумленнасьць, сьціпласьць, кемлівасьць і працавітасьць беларускага селяніна, самабытнасьць беларускай мовы. Запісаў і надрукаваў паданьне пра Мянеска,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пра паходжаньне Менску. Зьбіраў зьвесткі пра беларускую мову з мэтаю напісаць граматыку, але не закончыў гэтую працу.

Як этнограф і мовазнавец, П. Шпілеўскі вядомы найперш па наступных працах:

- «Белорусские поверья»
- «Белоруссия в характерических описаниях и фантастических поверьях»
- «Исследование о вовколаках на основании белорусских поверий»
- «Белорусские пословицы»
- «Словарь белорусского наречия»
- «Краткая грамматика белорусского наречия»
- «Заметки белоруса о белорусском языке»

Тры апошнія працы ніколі не выдаваліся, іх рукапісы захоўваюцца ў рукапісным аддзеле Бібліятэкі Акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.

**3. Крытыка даследаванняў П.М.Шпілеўскага.**

А. Тапароў, Т. Іванова, Л. Лапцеў і Е. Леўкіеўская ў сваёй сумеснай кнізе *«Рукописи, которых не было: Подделки в области славянского фольклора»*сумняваюцца ў дакладнасці звестак П. Шпілеўскага па беларускім фальклоры. Яны прыходзяць да высновы, што істотная, калі не пераважная частка прыведзеным ім 52-х духаў і багоў — былі па сутнасці выдуманыя ім. Ён знаходзіў боствы ў памылкова вытлумачаных прымаўках, песнях, формулах праклёну, атаясамліваў персанажаў беларускай дэманалогіі са славянскімі ці антычнымі багамі. Пачаўшы працу фальклярыста ў вельмі маладым узросце, ён ставіўся да фальклору хутчэй за ўсё як аматар, а не як сапраўдны навуковец, карыстаўся матэрыялам вольна, рабіў галаслоўныя сцвярджэнні.

Расійскія навукоўцы размеркавалі персанажаў П. Шпілеўскага на 3 групы: рэальныя, часткова рэальныя і цалкам выдуманыя. Атрымалася, што назвы калектыўнай працы ці каляндарных тэрмінаў (каляда, талака, шчадрэц,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

купала) ці назвы прыродных з'яў (жыж, зюзя, знічка) у Шпілеўскага ператварыліся ў багоў. Нешта было пазычана ад папярэднікаў у галіне міфатворчасці (Лада, Ляля, Чур-Бог), нешта выдумана (Кумяльган, Бордзя, Любмел і, магчыма, Цёця і Жыцень).

Пры гэтым працы П. Шпілеўскага па беларускай міфалогіі дасюль выкарыстоўваюцца пры складанні энцыклапедый, школьных падручнікаў, напісання навуковых прац, беларускую міфалогію яго версіі выкладаюць школьнікам.

## Раздзел III. Даследаванне народнай культуры ў 50 – 70-я гг. XIX ст.

### Тэма 8. Я.Баршчэўскі (1794 – 1851) і «Шляхціц Завальня», дзейнасць Яўстаха Тышкевіча (1814 – 1873) і «Апісанне Барысаўскага павета» (1847)

*Пытанні*

1. Творчы шлях Я.Баршчэўскага.
2. Народазнаўчая спадчына Я.Баршчэўскага.
3. Творчы шлях Я. Тышкевіча.
4. Народазнаўчая спадчына Я.Тышкевіча.

*Літаратура*

1 Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Укл., прадм. М. Хаўстовіча / Я.Баршчэўскі. — Мн., 1998.

2 Каханоўскі, Г.Руплівец нашай старасветчыны / Г.Каханоўскі, А.Каханоўскі. — Мн.: Навука і тэхніка, 1991.

2 Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 3 т. / рэд. Г. П. Пашкоў і інш. Т. 2: Кадэцкі корпус — Яцкевіч. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2005. — 788 с.: іл.

**1. Творчы шлях Я.Баршчэўскага**

Я.Баршчэўскі (1794 – 1851) – беларускі польскамоўны пісьменнік і беларускамоўны паэт, выдавец.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядомы за свой найбунейшы твор «Шляхціц Завальня» (на польскай мове). За жыццё напісаў таксама тры вершы на беларускай мове. Лічыцца адным з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры.

Нарадзіўся ў фальварку[1] Мурагі Полацкага павета Віцебскай губерні (цяперашні Расонскі раён Віцебскай вобласці)[2] у сям'і грэкакаталіцкага святара, якая, як мяркуецца, належала да шляхетнага роду. Вучыўся ўПолацкім езуіцкім калегіуме[1], дзе набыў вядомасць чытальніка і вершапісца, выступаў з уласнымі арацыямі і вершамі, у 1809 напісаў паэму ў класічным стылі «Пояс Венеры» (не захавалася; мова, на якой быў напісаны твор, невядома, магчыма польская або латынь). Студэнцкія канікулы часцей за ўсё праводзіў у падарожжах па наваколлях возера Нешчарда. Збіраў беларускі фальклор, апісваў курганы і гарадзішчы[1].

Дзякуючы сваёй схільнасці да паэтычных экспромтаў быў жаданым госцем на сямейных урачыстасцях вясковай шляхты. Першыя вядомыя вершы, напісаныя па-беларуску — «Дзеванька» (прысвечаны любімай дзяўчыне, Максімовіч) і «Бунт хлопаў». Таксама займаўся жывапісам — маляваў пейзажы і карыкатуры, якія карысталіся папулярнасцю сярод мясцовых жыхароў.

Пасля заканчэння Полацкага калегіума (у 1812 ў ператворанага ў акадэмію) прыблізна ў 1816 годзе, працаваў настаўнікам і гувернёрам у розных месцах на малой радзіме. Падарожнічаў па Беларусі, збіраў фальклор.

## 2. Народазнаўчая спадчына Я.Баршчэўскага

У 1840—1844 Баршчэўскі разам з іншымі членамі літаратурнага гуртка, які складаўся галоўным чынам з выхадцаў з Беларусі[1] займаўся выданнем штогадовага альманаха «Niezabudka» («Незабудка») (1840-44)[1] на польскай мове. Падтрымліваў творчыя сувязі з членамі гуртка і яго карэспандэнтамі — пісьменнікамі Вінцэнтам Давідам, Станіславам-Аўгустам Ляховічам, журналістам і крытыкам Р. Падбярэзскім, літаратуразнаўцам і гісторыкам Ю. Барташэвічам, мастакамі Казімірам і Рудольфам(руск.) бел. Жукоўскімі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фалькларыстам І. Храпавіцкім, пісьменнікамі Л. Шцюрмерам, В. Рэутам, Т. Лада-Заблоцкім, А. Грозай(руск.) бел., Л. Грот-Спасоўскім. Сярод самых блізкіх сяброў Баршчэўскага сучаснікі называлі Г. Шапялевіча, знаёмага з паэтам яшчэ з часоў вучобы ў Полацкай калегіі. Рэдкалегія часопіса мела кантакты з віленскім «Дэмакратычным таварыствам» (1836—1838), прапагандавала (праз Ф. Лаўцэвіча) забароненыя вершы.

На старонках «Незабудкі» Баршчэўскі друкаваў галоўным чынам апавяданні ў вершах. Ад класіцызму паступова перайшоў да рамантызму. У 1843 у часопісе «Rocznik literacki» («Літаратурны штогоднік») упершыню былі надрукаваныя яго беларускія вершы — «Дзеванька», «Гарэліца», магчыма ім апрацаваная (аўтарства цалкам не даказана) народная песня «Зязюля».

У 1844—1846 выдаў свой галоўны твор — кнігу «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» (тамы 1-4, на польскай мове, гравюры Р. Жукоўскага(руск.) бел.), асобныя часткі якога раней друкаваліся ў часопісах «Rocznik literacki» і «Athenæum». Матэрыяльную дапамогу ў выданні кніг Баршчэўскага аказаў віленскі пісьменнік А. Здановіч. У часопісе «Рубон» у 1847 годзе выйшла другая частка аповесці «Драўляны дзядок і мадам Інсекта».

Асноўным тварэннем аўтара з'яўляецца зборнік фантастычных твораў з жыцця беларускай глыбінкі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» у 4-х тамах (1844—1846). Творы напісаныя пад відавочным уплывам беларускага народнага фальклору. Баршчэўскі выкарыстаў сюжэты казак і легенд «дзікага паўночнага краю Беларусі», апаэтызаваў родныя мясціны, у тым ліку і возера Нешчарда, каля якога знаходзілася вёска Мурагі, дзе прайшло яго дзяцінства.

Апавяданні Баршчэўскага нагадваюць па сваім містычным настроем творы Гогаля. Паэма Я. Баршчэўскага «Пояс Венеры» не захавалася.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Большая частка твораў напісана на польскай мове, аднак у іх пісьменнік звяртаўся да беларускіх паданняў, фальклорных сюжэтаў і вобразаў («Дзве бярозы», «Курганы», «Зарослае возера» і інш.). Захавалася толькі тры яго творы напісаныя аўтарам непасрэдна па-беларуску: «Дзеванька», «Гарэліца», «Бунт хлопаў» («Рабункі мужыкоў», прысвечаны сялянскім хваляванням на Полаччыне ў 1812[1]). Некалькі легенд са «Шляхціча Завальні…» былі перакладзены і выдадзены ў 1916 годзе ў газеце «Гоман» у Вільні[1]. Цалкам жа твор быў пераведзены і выдадзены на беларускай толькі ў 1990 годзе.

Аўтар «Нарыса паўночнай Беларусі» (1843).

### 3. Творчы шлях Я. Тышкевіча

Я.Тышкевіч (1814 – 1873) – беларускі археоляг, гісторык, этнограф, краязнаўца, музэязнаўца; адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалёгіі[1]. Ганаровы членПецярбурскай акадэміі навук, член Дацкага таварыства аматараў паўночных старажытнасьцяў, СтакгольмскайКаралеўскай акадэміі выяўленчага мастацтва і старажытнасьцяў, Лёнданскага археалягічнага інстытуту.

З 1824 году навучаўся ў Віленскай гімназіі пад апекай прафэсараў унівэрсытэту Я. Вашкевіча й К. Асмалоўскага. Перапыніўшы тут навучаньне, у 1831 годзе скончыў Менскую гімназію. Потым амаль 2 гады вучыўся самастойна, «дабіраючы» веды ў пецярбурскіх бібліятэках.

Не зважаючы на свае графскія тытулы, браты Яўстах і Канстантын, а часам і бацька, бралі ў рукі рыдлёўкі і з дапамогай навакольных сялянаў раскопвалі старажытныя курганы. Часам, пераапрануўшыся ў простае сялянскае адзеньне, яны хадзілі па вясковых хатах, каб паслухаць і запісаць народныя песьні, легенды, паданьні, шчырую гутарку сялянаў пра побыт, паўдзельнічаць у абрадах. Захоплены загадкамі старажытнага сьвету, Я. Тышкевіч вырашыў грунтоўна разабрацца ў тыпах гістарычных помнікаў на роднай зямлі і высьветліць, ці ёсьць у іх заканамернасьць і сувязь з культурай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плямён, што некалі жылі на Беларусі. Гэта захапленьне археалёгіяй прыйшло да яго ў 20-гадовым веку.

Аналізуючы пахавальны абрад славянаў і іх суседзяў (летувісаў, латышоў), прыйшоў да высновы пра іх блізкасьць (трупаспаленьне, падабенства інвэнтару і яго разьмяшчэньне). Гэтыя высновы, падмацаваныя пазьнейшымі археалягічнымі дасьледаваньнямі, і сёньня зьяўляюцца пануючай думкай пра адзінства паходжаньня славянскай і балцкай культураў на Беларусі.

Тэрмін «гарадзішча» і вытворныя ад яго (*гарадок, гародня, горад*) лічыў славянскімі і выказаў думку, што самі гарадзішчы не абавязкова зьяўляюцца абарончымі ўмацаваньнямі, а хутчэй абрадавымі. Замкі лічыў абарончымі аб’ектамі і іх этымалёгію выводзіў ад слова «замыкаць».

Каб папоўніць свае веды ў старажытнай гісторыі й пазнаёміцца з мэтадамі дасьледаваньняў замежных калег у археалёгіі, у 1843 годзе накіраваўся на стажыроўку ў Данію, Фінляндыю, Швэцыю. Гэта быў першы і адзіны выпадак у 1-й палове XIX ст., калі беларускі навуковец-археоляг паехаў за мяжу пераймаць досьвед калег. Мэтад вядомага дацкага археоляга К. Томсэна падзелу старажытнасьцяў на тры эпохі-вякі (каменны, бронзавы, жалезны) Я. Тыўкевіч узяў на ўзбраеньне пры сваіх дасьледаваньнях і пры сыстэматызацыі старажытнасьцяў у Лагойскім музэі (з 1842), а пазьней і ў Віленскім музэі старажытнасьцяў. Вынікам паездкі за мяжу была яго своеасаблівая кніга-справаздача «Лісты пра Швэцыю» (т. 1—2, 1846).

Выдаў працу «*Археалёгія ў Літве*» (1872), у якой акрэсьліў шырокі абсяг для дасьледаваньняў помнікаў Літвы (Беларусі).

Вынікам дзейнасьці Я. Тышкевіча на Барысаўшчыне было грунтоўнае «*Апісаньне Барысаўскага павета…*» (1847). Для гэтай кнігі ён некалькі гадоў зьбіраў першакрыніцы па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, літаратуры, мастацтве,археалёгіі, тапаніміцы, фальклёры, шукаў памочнікаў-суаўтараў. Сярод іх былі К. Адамовіч, П.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чачот, З. Далэнга-Хадакоўскі, Ф. Чаховіч, В. Твардоўскі, Я. Ваньковіч, К. Тышынскі, В. Гарноўскі і, вядома, брат Канстантын. Амаль 10 гадоў ён ствараў гэту ўнікальную краязнаўчую кнігу, дзе кожны факт, кожная дата выверaныя, дабрасумленна прааналізаваныя й аргумэнтаваныя.

**4. Народазнаўчая спадчына Я.Тышкевіча**

Працуючы ў галіне археалёгіі, этнаграфіі й краязнаўства, грунтоўна займаўся й фальклёрам. Пры апісаньні вясельля, абрадаў (Дзяды, Каляды, Радаўніца, Спас) і ўсяго цыкля гаспадарчага гадавога календара ліцьвінаў імкнуўся растлумачыць сувязь паганскіх абрадаў, элемэнты якіх замацаваліся і ў хрысьціянскіх вераваньнях. Малюючы народныя ўрачыстасьці, падкрэсьліваў, што багатае духоўнае жыцьцё літоўскага (беларускага) селяніна часта не супадае з матэрыяльным. У запісах Я. Тышкевіча сабрана каля 450 прымавак і прыказак. Ён сьцьвярджаў: «*Народная паэзія дае нам магчымасьць пазнаць пачуцьці народа, а прымаўкі — пазнаёміцца зь яго розумам*». Падборкі літоўскіх прымавак і прыказак з камэнтарамі навукоўцаў неаднаразова зьмяшчаў у часопісе «*Biblioteka Warszawska*». Трапнымі літоўскімі прымаўкамі й прыказкамі, легендамі й паданьнямі праілюстраваў і сваю кнігу «*Ўзоры хатняга сумеснага жыцьця ў Літве*» (1844, дапрацаваны варыянт у 1864), дзе выклаў свае погляды на культуру шляхты ранейшых стагодзьдзяў.

У кнізе «*Нашы краі*» зьмясьціў нарыс пра магната Радзівіла. У 1850 годзе ён выдаў у Вільні працу «*Археалягічныя дасьледаваньні помнікаў мастацкіх рамёстваў і да т. п. у старажытнай Літве й Літоўскай Русі*». З 1847 году працаваў у Менску як членец камісіі па зборы й выданьні старажытных актаў, грамат і прывілеяў 16—18 ст. гарадоў Менскай губэрніі. У 1855 арганізаваў і ўзначаліў Віленскую археалягічную камісію і Музэй літоўскай археалёгіі ў Вільні.

**Тэма 9. Дзейнасць РГТ. Праграма для збору этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Пытанні*

1. Стварэнне паўночна-заходняга аддзела таварыства.

2. Першы перыяд існавання паўночна-заходняга аддзела рускага геаграфічнага таварыства.

3. Другі перыяд існавання паўночна-заходняга аддзела рускага геаграфічнага таварыства.

*Літаратура*

1. Алексеев Л.В. Археология и краеведение Беларуси, XVI - 30-е гг. XX в./Под редакцией Б.А. Рыбакова. - Мн.: Бел. навука, 1996. - 206 с.

2. Беларуская фалькларыстыка/Г.А. Пятроўская, У.К. Цішчанка, У.А. Васілевіч і інш. - Мн.: Навука і тэхніка, 1989. - 415 с.

3. Гісторыя Беларусі: У 6 т.Т. 4. Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII - чатак XX ст.) /М.Біч, В. Яноўская, С. Рудовіч і інш; Рэдкал М. Касцюк і інш. - Мн. 2005. - 519.; іл.

4. Довнар-Запольский М.В. История Белоруссии /М.В. Довнар-Запольский. - 2-е изд. - Мн.: Беларусь, 2005. - 680 с.

**1. Стварэнне паўночна-заходняга аддзела таварыства**

Геаграфічнае таварыства было створана ў Санкт-Пецярбургу ў 1845 годзе. Яго навуковая дзейнасць была накіраваная на збор, апрацоўку, распаўсюджванне геаграфічных, этнаграфічных і статыстычных звестак аб Расіі. Еўразія ў той час складалася з набору імперый (Аўстра-Венгерскай, Брытанскай, Расійскай, Асманскай і г.д.), у кожнай з якіх жыла шмат народаў і этнасаў, розных па культуры і фальклоры. Каб даведацца пра побыт і культуру гэтых народаў (каб імі лепш кіраваць) імперскія ўлады часцяком фінансавалі краязнаўчую і этнаграфічную дзейнасць. Расія падтрымлівала гэтую тэндэнцыю: у 1850 г. адчыняюцца розныя аддзелы Рускага геаграфічнага таварыства. Першым па часе ўзнікнення з’яўляецца Каўказскі аддзел у Тыфлісе, другім - Сібірскі ў горадзе Іркуцку, трэцім -

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паўночна-заходні ў горадзе Вільня, чацвёртым - Арэнбургскі ў горадзе Арэнбурзе і пятым - Паўднева-заходні ў Кіеве.

Першай рускай навукова-беларусазнаўчай грамадзянскай арганізацыяй на Беларусі быў Паўночна-заходні аддзел Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства. Увесь час свайго існавання ен знаходзіўся ў Вільні, з'яўляючыся дапаможнай часткай таварыства. Ініцыятыва ўтварэння такога аддзелу ў Вільні належыла тагачаснаму сакратару Рускага геаграфічнага таварыства Ф.Р. Остен Сакену. У гэтай справе пэўную ролю адыграла таксама экспедыцыя Рускага геаграфічнага таварыства на Беларусь у 1867 - 1870 гг.

З той прычны, што зменанае патрабаванне аб тым, каб у члены аддзелу маглі абірацца толькі рускія людзі, супярэчыла пэўнаму параграфу статута самаго Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, ад яго адмовіліся, палічыўшы, што асабовы склад заснавальнікаў аддзела паклапоціцца аб захаванні "рускасці" ў складзе аддзела. Палажэнне аб стварэнні Паўночна-заходняга аддзела Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства было зацверджана царом 26 лютым (16 сакавіка) 1867 г. У красавіку 1867 года часовы камітэт па адкрыццю Паўночна-заходняга аддзела пачаў сваю работу. Былі праведзены пасяджэнні камітэта, дзе вырашаліся пытанні аб членах аддзелу і яго адкрыцці.

Адкрыцце Паўночна-заходняга аддзелу адбылося 20 чэрвеня 1867 года ў будынку Віленскай публічнай бібліятэкі (24 мая 1867 года свае дзверы адчыніла Віленская публічная бібліятэка, а 13 чэрвеня ў ей пабываў сам імператар Аляксандр II.). На першым пасяджэнні быў абраны старшыня - І.П. Карнілаў.

Мэты аддзелу дакладна выяўлены ў першых трох параграфах палажэння, а уласна:

**1.** Для найбольш паспяховай дапамогі мэце Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, засноўваецца ў Вільні асобны аддзел таварыства пад назвай Паўночна-заходні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**2.** Паўночна-заходні аддзел Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства, пад кіраўніцтвам галоўнага начальніка краю, займаецца пераважна вывучэннем гэтага краю ва ўсіх тых стасунках, якія складаюць прадмет заняткаў Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства і асабліва даследаванні па археаграфіі, археалогіі, гісторыі, статыстыкі і этнаграфіі.

## 2 Першы перыяд існавання паўночна-заходняга аддзела рускага геаграфічнага таварыства

Дзейнасць Паўночна-заходняга аддзелу Рускага геаграфічнага таварыства можна падзяліць на два перыяды. Першы з іх пачынаецца з 1867 г. і заканчваецца ў 1877 г., калі дзейнасць аддзелу зусім спынілася. Другі - ад 1910 да 1915 г., калі аддзел зачыніўся па прычыне захопу Вільні немцамі. Такім чынам, амаль 35 год, ад 1874 да 1910 г., аддзел фактычна не існаваў.

Дзеля таго, што праца ў этнаграфічнай сэкцыі вялася адзінкамі, аддзел не спраўляўся нават з распрацоўкай усіх атрыманных ім этнаграфічных апісанняў з месц. Праўда, былі некаторыя адзіночныя выпадкі друкавання лепшых апісаньняў у "Виленским Вестнику", але амаль уся маса іх засталася ў матэрыялах аддзелу. Апрача працы па збіранню матэрыялаў, было вырашына пачаць справу па стварэнню этнаграфічнай карты Беларусі.

У 1873 годзе было ўзнята пытанне аб скліканні з’езду членамі аддзела і сакратарамі губернскіх статыстычных камітэтаў. Была распрацавана праграма з’езду, а ў 1874 годзе адбыўся і сам з’езд. У ім прымала ўдзел 25 чалавек, з якіх 6 - прадстаўнікі губернскіх статыстычных камітэтаў. З’езд абмеркаваў пытанні аб статыстыкі: яўрэйскага насельніцтва краю, медыцыны, крымінальнай, прамысловай і сельска-гаспадарчай статыстыкі; аб мясцовых промыслах, аб пашырэнні сеткі метэаралагічных станцый і інш. З’езд прыняў шэраг пастаноў у накірунку развіцця дзейнасці аддзела, дапамозе яму статыстычных камітэтаў і г.д. У тым жа 1874 годзе вышлі ў Вільні "Протоколы Виленского Статистического Съезда 1874 г.".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Урэшце, адной з вялікіх прац аддзелу ў першым перыядзе яго існавання зяўляецца перапіс насельніцтва г. Вільні, які зроблены аддзелам 18, 19 і 20 красавіка 1874 г. У гэтай працы прымалі ўдзел 195 чалавек. Матэрыялы перапісу распрацоўваліся ў 1875 і 1876 г. г. і надрукаваны ў 1881 г. Гэтай працай і скончыўся першы перыяд дзейнасці аддзелу.

У першым перыядзе дзейнасці Паўночна-заходняга аддзела асабістага друкаванага органа не было, таму журналы пасяджэнняў аддзелу публікаваліся ў цэнтральных "Известиях Императорского Русского Географического Общества", а інфармацыя аб працы - пераважна ў "Виленском Вестнике".

Аддзел меў і свае сродкі. Так, у 1871 г. ён меў у аддзяленні дзяржаўнага банку звыш 300 руб. Апрача таго, пэўныя сумы аддзел атрымліваў ад таварыства і ўлады, напрыклад, на пошук бурага вуглю каля Гародні-ад гродзенскага губарнатара - 300 руб. і ад таварыства - 400 р. і інш.

У першы перыяд дзейнасці аддзел падтрымліваў сувязь з аналагічнымі арганізацыямі ў Расіі і за межамі: Парыжскім геаграфічным таварыствам і інш.

Аднак у 1874 г. дзейнасць Паўночна-заходняга аддзела прыпынілася, бо рускія даследчыкі пераважна абыякава ставіліся да беларускай мінуўшчыны і не маглі з інтарэсам вывучаць край, а мясцовых даследчыкаў амаль не было. Але прайшоў ладны час, умовы змяніліся, і ў 1899 - 1902 г. г. былі зроблены спробы аднавіць аддзел, але спробы гэтыя не далі ніякіх вынікаў.

## 3 Другі перыяд існавання паўночна-заходняга аддзела рускага геаграфічнага таварыства

У 1910 году папячыцель Віленскай навучальнай акругі Р.В. Лявіцкі склікаў пасяджэнне зацікаўленых асоб у ліку каля 32 чалавек, якое і аднавіла Паўночна-заходні аддзел Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства па палажэнню 1867 году. У даным выпадку, як і пры самым заснаванні аддзелу, ініцыятыва аднаўлення належыла не мясцовым дзеячам, а П.П. Сямёнаву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяньшанскаму і віцэ-старшыні Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства. Р.В. Лявіцкі, як сапраўдны член Таварыства, узяўся ажыцяўляць яе на месцы. Па думцы аднаўленцаў аддзелу, галоўнай мэтай яго павінна стаць дзейнасць па ўсебаковым вывучэнні былога Паўночна-заходняга краю. Але тады ж была выказана і канкрэтная практычная мэта аддзелу - даводзіць, што гэты край сапраўды рускі ў процівагу "польскаму погляду на гэты край, як на край польскі, або, прынамсі, ня рускі". Такім чынам, адноўлены аддзел захаваў не толькі сваё палажэнне, але і свае палітычныя тэндэнцыі. Дзейнасць яго цягнулася да верасня 1915 году - часу захопу Вільні немцамі. Нажаль, за 1913 і за 1915 год існавання аддзелу няма пэўных даных. Таму будуць паказаны пераважна вынікі працы аддзелу за 1910 - 1912 гг.

Асаблівых дасягненняў на працягу другога перыяду існавання аддзелу секцыі не мелі. Быць можа, гэта ў пэўнай меры залежала ад таго, што ўся ўвага аддзелу належала пераважна выданню сваіх "Записак" на рускай мове. З паасобных пытанняў працы секцый трэба адзначыць:

Як правіла аддзел кожны год пасылаў дзве экспедыцыі: адну гістарычную і адну этнаграфічную, але зачастую іх адбывалася больш. Так, у 1910 годзе адбыліся наступныя экспедыцыі: комплексная ў Барысаў, для запісу народных мелодый, фальклорная і г.д. і дзве археалагічныя. У 1911 годзе было зроблена 5 экспедыцый: комплексная ў Гомель, для запісу народных мелодый, дзве археалагічныя і этнаграфічная. У 1912 годзе - 2 экспедыцыі: этнаграфічная і для запісу народных мелодый. У некаторых экспедыцыях прымала ўдзел па некалькі чалавек. Каштоўныя вынікі экспедыцый дакладываліся на сходах і апавяшчаліся ў "Записках" аддзелу.

З матэрыялаў экспедыцый, а таксама, з матэрыялаў атрыманных з месц і інш, у аддзеле быў створаны архіў, які к часу зачынення аддзелу ў 1915 годзе складаўся з вельмі каштоўных звестак: сотні апісанняў, фатаграфіі і інш для пазнання Беларусі. Гэта было амаль што самым каштоўным вынікам працы аддзела.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актыўнымі прадстаўнікамі Паўночна-заходняга аддзелу з'яўляліся М.А. Дзмітрыеў, Ю.Ф. Крачкоўскі, М.Я. Нікіфароўскі, Е.Р. Раманаў, В.Г. Сакалоў, А.М. Семянтоўскі, П.В. Шэйн і інш.

Даступных для ўсіх і вельмі каштоўным вынікам другога перыяду існавання аддзелу справядліва лічыць выданне ім пры ўдзеле Віленскага таварыства аматараў прыродазнаўства "Записки Северо-Западного Отдела Императорского Русского Географического Общества" на расійскай мове. Іх вышла 4 кніжкі, агульнасцю 1378 старонак. Рэдактарам выдання з'уляўся Дз. І. Даўгяла. У выданні асвятлялася дзейнасць аддзела, змяшчаліся матэрыялы па этнаграфіі, фальклору, археалогіі, генеалогіі, гісторыі, геаграфіі і інш., друкаваліся рэцэнзіі і агляды літаратуры. Увогуле, "Записки" не былі пазбаўлены афіцыйнай ідэалогіі, але гэта адзіныя кніжкі, якія выдаваліся ў той час навуковымі арганізацыямі на Беларусі. У іх есць вельмі багаты фактычны матэрыял, які і зараз з'яўляецца вельмі актуальным.

**Тэма 10. Народазнаўчая дзейнасць Адама Кіркора (1818 – 1886), ІІІ том выдання «Маляўнічая Расія» (1882) і Паўла Шэйна (1826 – 1900), яго праграма збірання вуснай народнай творчасці (1867) як даследчыкаў-ліберала ў**

*Пытанні*

1. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Адама Кіркора.
2. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Паўла Шэйна.

*Літаратура*

- Новиков Н. В. Павел Васильевич Шейн. — Мн., 1972.
- Живописная Россия. Т. 3. Ч. 1: Литовское Полесье. Ч. 2. Белорусское Полесье. СПб., 1882 (факсымільнае перавыданьне: Мн., 1993).

**1. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Адама Кіркора.**

Адам Кіркор (1818 – 1886) — беларускі грамадзкі дзяяч лібэральнага кірунку, этнограф, публіцыст, выдавец, гісторык, краязнавец, археоляг,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратуразнавец. Чалец-карэспандэнт Імпэратарскага археалягічнага таварыства (1856), чалец Расейскага геаграфічнага таварыства (1857) і Акадэміі ведаў у Кракаве (1873).

Навучаўся ў Магілёўскай і Віленскай гімназіях. Выдаваў у Вільні ў 1843—1858 гадах навукова-літаратурныя альманахі «Радэгаст», «Разумовыя дзеньнікі», «Віленскі альманах», часопіс «Віленскі зборнік». У апошнім зьмяшчаў свае працы па гісторыі, этнаграфіі і археалёгіі Літвы.

Быў чальцом Віленскай археалягічнай камісіі, кіраўніком Віленскага музэю старажытнасьцяў, якому ахвяраваў уласную археалягічна-этнаграфічную калекцыю, сабраную ў час экспэдыцыі па Менскай і Віленскай губэрнях. Праводзіў археалягічныя раскопкі ў Ашмянскім, Барысаўскім, Вялейскім, Віленскім, Лідзкім, Менскім, Навагра дзкім іСьвянцянскім паветах, дасьледаваў каля 1000 курганоў.

У 1859 годзе заснаваў уласную друкарню, якая выдала шмат навуковых і мастацкіх кнігаў. Рэдагаваў газэту «Виленский вестник» (1859—1865). У 1863 прыцягваўся да сьледзтва ў зьвязку з удзелам у паўстаньні ягонай жонкі А. Маеўскай, на варшаўскай кватэры якой хаваўся кіраўнік паўстанцкага ўрада Р. Траўгут. Страціў магчымасьць працаваць у Вільні; пераехаў у Пецярбург. Тамака разам з М. Юматавым у 1868—1871 выдаваў газэту «Новое время». Чытаў з 1872 лекцыі па гісторыі славянскіх літаратураў, у тым ліку беларускай, у Кракаўскім прамыслова-тэхнічным музэі. Яму належаць публікацыі «Рэшткі язычніцкіх звычаяў на Беларусі», «Пра этнаграфічную мяжу літоўскай і славянскай народнасьцяў у Літве» і інш.

Адзін зь першых пазнаёміў навуковы сьвет Расеі і Польшчы з культурай беларусаў, адлюстраваў іх гістарычныя і этнаграфічныя своеасаблівасьці, даў этнічную і сацыяльна-побытавую характарыстыку, адзначыў самастойнасьць беларускай мовы. У кнізе «Пра літаратуру братніх славянскіх народаў», якая ўбачыла сьвет у 1874, выказаў ідэю пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускую культуру як цэласную гістарычную зьяву ў адзінстве пісьмовых і фальклёрных відаў творчасьці.

Аўтар мэмуараў «Літоўскія абразкі» (1874), «Зь віленскіх успамінаў» (1884), «Успаміны з 1860—1863» (1884—1885).

А. Кіркор увайшоў у гісторыю беларускай этнаграфіі і фалькларыстыкі як аўтар дзвюх грунтоўных прац «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню», апублікаваную ў 3-м выпуску «Этнаграфічнага зборніка» за 1858 г. і «Беларускае палессе», надрукаваную ў «Маляўнічай Расіі», (т. 3, ч. 2, 1882). У першай з іх А. Кіркор змясціў 227 песень (большая частка паўтарае публікацыі Я. Тышкевіча і Я. Чачота). У гэтай жа працы ѐн разгледзеў звычаѐвае права сялян і іншыя этнаграфічныя праблемы. У другой працы ѐн найбольшую ўвагу звярнуў на адлюстраванне ў фальклорных творах слядоў мінулага, элементаў язычніцтва. Асабліва захапіўся ѐн міфалогіяй. А. Кіркор значна пашырыў галерэю міфалагічных істот П. Шпілеўскага божышчамі. Як міфолаг, А. Кіркор усіх жывѐл у казках лічыў багамі: ваўка – дэманам холаду, казу – увасабленнем багіні грамаўніцы, якая валодае жыццяздольнай сілай. Некаторыя міфічныя істоты, якіх А. Кіркор аднѐс да язычніцкіх багоў, ѐн характарызаваў і па знешняму выгляду і па дзеянню, напрыклад: Зюзя – гэта сівы стары, які насылае ўзімку люты мароз (менавіта нібы яго клікалі на каляды есці куццю і кідалі праз акно яму лыжку кашы). Заслугай А. Кіркора з'яўляецца першае грунтоўнае апісанне культуры беларусаў Віленскай губерні і Палесся. Ён не згаджаўся з тымі даследчыкамі, якія паказвалі беларусаў і літоўцаў разумова абмежаванымі: «Беларусаў і літоўцаў нам наогул стараюцца паказаць разумова тупымі, амаль недарэкамі. А паслухайце, як яны дарэчы ўставяць вам вострае славечка, як, пры ўсѐй пакорлівасці і як быццам знарок пры дзівакаватых паводзінах, калі лаюцца, прымусяць вас пачырванець або замоўчыць незнарокам сказанай у размове прыказкай, з дзяцінства завучанай і на ўсялякі выпадак удала выкарыстанай», – адзначаў ѐн у «Этнаграфічным поглядзе на Віленскую губерню». Даследчык высока ацэньваў беларускія паданні, вясельную паэзію і яе сувязь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з разнастайнымі абрадамі і звычаямі, адзначаў захаванне рэшткаў язычніцтва ў святах каляд і купалля, дзядоў, дажынкаў. Аднак паслядоўная прыхільнасць яго да міфалагічнай школы нярэдка перашкаджала аб'ектыўнаму асвятленню з'яў.







Адам Кіркор

Павел Шэйн

**2. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Паўла Шэйна.**

Павел Шэйн (1826 – 1900) — педагог, этнограф, фалькларыст — збіральнік беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці.

Нарадзіўся ён у сям'і магілёўскага яўрэя-гандляра. Благі стан здароўя прымусіў бацькоў уладкаваць сына ў Нова-Екацярыненскую бальніцу ў Маскве, дзе ён прыняў лютэранства і, такім чынам, парваў з бацькамі, якія трымаліся іўдаізму. П. Шэйн атрымаў званне хатняга настаўніка і пачаў займацца прыватнай педагагічнай дзейнасцю. У 1865—1872 працаваў выкладчыкам нямецкай і рускай моў у Віцебскай гімназіі, а ў 1873—1879 настаўнічаў у Шуі, Зарайску, Калузе. Яшчэ ў 1850-х пад уплывам славянафілаў ён пачаў збіраць фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Праз некаторы час Шэйн пераехаў у Пецярбург дзе пад кіраўніцтвам Акадэміі навук заняўся навуковай работай. Яшчэ ў 1859 ён надрукаваў свой першы збор рускіх былін і гістарычных песень, запісаных у Корсунскім павеце Сімбірскай губерні. У 1870 выйшаў яго зборнік «Рускія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народныя песні», у 1898—1902 — праца ў двух тамах «Вялікарус у сваіх песнях, абрадах, звычаях, вераваннях, казках, легендах і да т.п.», якой ён завяршыў выданне рускага фальклору.

Дзейнасць П. Шэйна ў Паўнона-Заходнім краі пачалася ў сяр. 1860-х, калі ён апынуўся ў Віцебску. Тут ён пачуў беларускую мову, якой да гэтага часу не ведаў, і атрымаў магчымасць пазнаёміцца з ужо існуючымі зборнікамі беларускіх народных твораў. Два гады Шэйн вывучаў асаблівасці мовы і побыту беларусаў, а ў 1867 распрацаваў падрабязную «Праграму для збірання помнікаў народнай творчасці», якую разаслаў створанай ім шырокай сетцы карэспандэнтаў з розных куткоў Паўнона-Заходняга края. Ужо да 1869 ён сабраў значную колькасць беларускіх песень, галоўным чынам Віцебскай губерні, дапоўніў іх і прадставіў у геаграфічнае таварыства ў пач. 1870-х даволі аб'ёмны том пад назвай «Беларускія песні». Гэта была самая буйная праца сярод аналагічных зборнікаў 1860-1870-х. У ёй сабрана звыш 1000 беларускіх народных песень з апісаннем тых абрадаў, пры якіх яны выконваліся, некалькі казак, паданняў, запісаў прыкмет і забабонаў. У зборніку прыводзяцца апісанні радзінных і хаўтурных абрадаў, некалькі апісанняў абрадаў дзядоў. З каляндарных абрадаў запісаны: калядныя, велікодныя, юр'еўскія, купальскія, талочныя, жніўныя. Але асноўная каштоўнасць зборніка ў песенным матэрыяле. Акадэмік Я. Карскіадзначыў, што гэта адзін з лепшых збораў твораў беларускай народнай песні. У ім упершыню быў так шырока прадстаўлены песенны рэпертуар Віцебшчыны. П. Шэйн з дапамогай карэспандэнтаў назапасіў вялікую колькасць апісанняў народных звычаяў і абрадаў, якія пазней выйшлі пад назвай «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга края» (т. 1-3, 1887—1902). У гэта выданне ўключаны матэрыялы з усіх губерняў Паўночна-Заходняга края, а таксама з суседніх, дзе жыло этнічна беларускае насельніцтва. Тут атрымалі адлюстраванне амаль усе бакі духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў. Гэта песні абрадавыя, бытавыя, бяседныя, жартоўныя і так званыя разгульныя, апісанні абрадаў і звязаныя з імі песні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзесяткі галашэнняў. Вясельная калекцыя П. Шэйна па багаццю не мела сабе роўных сярод дарэвалюцыйных выданняў беларускага фальклору. Звяртае на сябе ўвагу раздзел народных прывітанняў, пажаданняў, праклёнаў, лаянак, замоў. У самай працы над 3-ім томам «Матэрыялаў…», калі да даследчыка прыйшлі слава і прызнанне, П. Шэйн памёр. Акрамя названых прац ён быў аўтарам шэрага артыкулаў, рэцэнзій, нататак, якія змяшчаў у навуковых выданнях. Працы П. Шэйна, нягледзячы на часам тэндэнцыйны падыход да духоўнай спадчыны беларускага народа, — каштоўная крыніца фальклорна-этнаграфічных звестак пра побыт і культуру беларусаў 2-ой пал. 19 ст.

**Тэма 11. Навуковая спадчына Пятра Бяссонава (1828 – 1898) і Івана Насовіча (1788 – 1898) як даследчыкаў беларускага фальклору, арыентаваных на заходнерусізм**

*Пытанні*

1. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Паўла Бяссонава.
2. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Івана Насовіча.

*Літаратура*

- Смалянчук А. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864—1917. Гродна, 2001, —322 с.
- *Гуліцкі М. Ф.* Нарысы гісторыі беларускай лексікаграфіі (XIX — пачатак XX стст.). — Мн., 1978.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**1. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Пятра Бяссонава.**

Пётр Бяссонаў – рускі славянафіл, гісторык літаратуры, публікатар славянскага, у тым ліку беларускага фальклору, этнолаг і публіцыст. Нарадзіўся ў Маскве, у сям'і святара, скончыў Маскоўскую духоўную семінарыю і гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Вясной 1865 быў прызначаны на пасаду старшыні Віленскай археаграфічнай камісіі, працаваў дырэктарам Віленскага рэальнага вучылішча і дырэктарам

Віленскай I гімназіі. Аднак пры ім праца ў Археаграфічнай камісіі застыла. Лічыў, што беларускія землі – «заходняя Расія», і ў 1866 накіраваў у III аддзяленне Запіску аб мерах прадухілення новага паўстання. Ён раіў аслабіць уплывы рымска-каталіцкага духавенства, далучаць каталікоў да праваслаўя, зрабіць адукацыю народа выключна ўрадавай справай, замяніць усіх «чыноўнікаў-палякаў» рускімі, прыцягнуць у край магчыма большую колькасць рускіх землеўладальнікаў. Пасля выдалення з Вільні Бяссонаў служыў бібліятэкарам у Маскоўскім універсітэце, стаў прафесарам кафедры славянскіх «гаворак» Харкаўскага ўніверсітэта.

Апублікаваў зборнік балгарскіх песен, зборнік духоўных вершаў «Калики перехожие» (Масква, 1861—1863), «Детские песни», куды ўвайшла частка беларускіх песен, сабраных П. В. Кірэеўскім (Масква, 1868). Апошняя кніга — першы зборнік рускага дзіцячага фальклору. Яна выклікала цікавасць даследчыкаў і аматараў народнай творчасці і фальклору да збірання і вывучэння дзіцячага фальклору. Найбольш каштоўным укладам у беларусістыку і вынікам дзейнасці Бяссонава ў Вільні стаў зборнік «Беларускія песні» (Масква, 1871). У зборнік увайшлі валачобныя, юр'еўскія, куставыя, мікольскія, пятроўскія, купальскія, калядныя і масленічныя песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ











Пётр Бяссонаў

Іван Насовіч

**2. Творчы шлях і народазнаўчая спадчына Івана Насовіча.**

Іван Насовіч – беларускі мовазнавец-лексікограф, фалькларыст і этнограф. Скончыў Магілёўскую гімназію і духоўную семінарыю (1812). Працаваў выкладчыкам, інспектарам Аршанскага, выкладчыкам, рэктарам Мсціслаўскага духоўных вучылішчаў (1813—1822), загадчыкам, наглядчыкам, выкладчыкам Дынабургскай гімназіі, Маладзечанскага і Свянцянскага дваранскіх вучылішчаў (1822—1843). У 1843 выйшаў у адстаўку, пераехаў у Мсціслаў і заняўся навуковай працай. Шмат падарожнічаў па Паўночна-Заходнім краі. Супрацоўнічаў з Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Пецярбургскай АН, Археаграфічнай камісіяй, Аддзяленнем этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства.

Склаў першы гістарычны слоўнік беларускай мовы «Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, выбраных з Актаў, што адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі» (Увараўская прэмія 1865, рукапіс захоўваецца ў Бібліятэцы РАН у Санкт-Пецярбургу), дзе растлумачаны каля 13 тыс. слоў. Асноўная навуковая праца І. І. Насовіча тлумачальна-перакладны «Слоўнік беларускай гаворкі» (1870, Дзямідаўская прэмія 1865), у які ўвайшло боль за 30тыс. слоў, запісаных аўтарам у Магілёўскай, Віцебскай, Мінскай і Гродзенскай губернях. Аўтарству І. І. Насовіча належыць гістарычна-лінгвістычны нарыс «Аб плямёнах да часоў Рурыка, што засялялі беларускую тэрыторыю» (рукапіс захоўваецца ў Бібліятэцы РАН у Санкт-Пецярбургу), дзе ён м. інш. даводзіў, што назвы плямёнаў «дрыгавічы», «радзімічы», «крывічы» і інш. паходзяць ад беларускіх народных слоў. Пакінуў гісторыка-мемуарную працу «Успамінаў майго жыцця» (рукапіс захоўваецца ў Інстытуце мовазнаўства НАН Беларусі, паводле інш. звестак у бібліятэцы Расійскай АН у Пецярбургу). Таксама аўтар артыкулаў, прысвечаных песеннай культуры беларусаў. Пераклаў з лацінскай мовы 3-томную працу А. Тэйнера «Старажытныя помнікі, што асвятляюць гісторыю Польшчы і Літвы», у якой адлюстраваны ўзаемадачыненні Польшчы і ВКЛ, асветлена гісторыя беларускіх зямель з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1217 да 1696 г. Як і Бяссонаў, лічыў Беларусь «заходняй Расіяй», але не ўдзельнічаў у захадах супраць самавызначэння беларусаў.

Значнымі былі фальклорна-этнаграфічныя працы І. І. Насовіча, галоўная сярод якіх – «Зборнік беларускіх прыказак» (1867, залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства), дзе – 3,5 тыс. прыказак, прымавак, прыгаворак, праклёнаў, скорагаворак і інш. блізкіх да іх паняццяў. У зборніку раскрываецца сэнс прыказак, выяўляецца іх паходжанне, даюцца эквіваленты з рускай мовы, а ў многіх выпадках і з інш. моў. Потым выйшлі зборнікі «Беларускія прыказкі і прымаўкі» (1868), «Беларускія прыказкі і загадкі» (1868), «Беларускія песні» (1873, больш за 350 тэкстаў), вядомы рукапіс зборніка «Легенды, паданні, быліны, байкі, анекдоты» не выяўлены і інш. зборнікі. Зборнікі адкрываюцца прадмовамі аўтара, у якіх І. І. Насовіч выказваў свае погляды на беларускую народную вусна-паэтычную творчасць.

## Раздзел V. Беларуская фалькларыстыка ў XX-XXI стст.

### Тэма12. Школы і накірункі даследаванняў у фалькларыстыцы канца xix ст.

Пытанні па тэме

1. Культурна-гістарычная школа ва ўсходнеславянскай фатькларыстыцы.

2. Антрапалагічная (этнаграфічная) школа: ідэі эвалюцыянізму ва ўеходнеславянскай фалькларыстыцы.

3. Метадалогія эвалюцыянізму ў даследаваннях М. Доўнар-Запольскага і іншых даследчыкаў традыцыйнай культуры беларусаў.

Літаратура па тэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Швед, І.А. Уводзіны ў фальклярыстыку : вучэбна метадычны дапаможнік : у 2 ч. Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. пушкіна. Брэст :БрДУ. 2009. -4.1. 92 с. 2010.- 4.2. - 114с.

Ліс, А. С. Гісторыя збірання і вывучэння беларускай каляндарна-абрадавай творчасці А. С. Ліс Каляндарна-абрадавая паэзія /. А. С. Ліс |і інш.]. - Мінск: Бел. нав.. 2001.- С. 7-60.

Восточнославянскій фольклор: Слов. науч и нар. терминологии редкол.: К. П. Кабашннков н др. Мн. : Навука і тэхніка. 1993. 478 с.

Ва ўсходнеславянскай і ўласна беларускай фальклярыстыцы гэтага перыяду пераасэнсоўваюцца і практычна пераадольваюцца ідэі міфалагічнай школы, атрымлівае некаторае развіццё культурна-гістарычная школа, развіваюцца на беларускім матэрыяле ідэі антрапалагічнай (этнаграфічнай) школы.

Да заслуг культурна-гістарычнай школы адносяцца: па-першае, уклад у распрацоўку гісторыка-генетычнай метадалогіі; па-другое, спроба стварэння гісторый нацыянальных літаратур; па-трэцяе. падрыхтоўка прынцыпаў параўнальна-гістарычнага літаратуразнаўства і псіхалагічнай школы; па-чацвёртае, назапашванне вялізнага гісторыка-культурнага матэрыялу, вопыту тэксталагічнага аналізу твораў і навуковага крыніцазнаўства. Наогул жа, і гэта. відаць, самае галоўнае, прадстаўнікі культурна-гістарычнай школы ўслед за міфолагамі ўнеслі метадалогію ў гісторыю літаратуры і тым самым развілі і падмацавалі навуковы характар гэтай галіны літаратуразнаўства.

Самым значным прадстаўніком культурна-гістарычнай школы ў Расіі быў акадэмік Аляксандр Пыпін - аўтар фундаменталыііых прац у галіне гуманітарыстыкі. На культурна-гістарычную метадалогію арыентаваўся ў асноўным і акадэмік Мікалай Ціханраваў . Асабліва многа М. Ціханраваў зрабіў для збору, сістэматызацыі і выдання старажытнай рускай летапіснай спадчыны, а таксама твораў рускага драматычнага пісьменства.

Ідэі культурна-гістарычнай школы істотна паўплывалі на літаратурна-мастацкую крытыку і публіцыстыку Беларусі канца XIX

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачатку XX стст., на тагачасную беларускую фалькларыстыку і этнаграфію (А. Багдановіч. У. Дабравольскі, М. Доўнар-Запольскі). Многае ад культурна-гістарычнай школы ўзялі М. Багдановіч і М. Гарэцкі. Паслядоўнікам культурна-гістарычнай школы з'яўляўся таксама I. Замоцін.

Паралельна з засваеннем ідэй гістарычнай школы, з сярэдзіны 1870 х гг. асэнсоўваюцца ідэі эвалюцыянізму. сфармуляваныя брытанскімі сацыяльнымі антраполагамі Э.Б. Тайларам, Дж. Фрэзерам, Г. Спэнсарам. Гісторыя развіцця чалавецтва разглядаецца паслядоўнікамі эвалюцыянізму як частка гісторыі развіцця прыроды, што дазваляе сістэматызоўваць з'явы культуры па відах і размяркоўваць эвалюцыйнымі радамі ад простых да больш складаных. Сярод тэорый эвалюцыяністаў найбольшую папулярнасць набываюць гісторыя шлюбна-сямейных адносінаў і гісторыя рэлігійных вераванняў.

На аснове распрацоўкі ідэй эвалюцыянізму ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы фарміруецца антрапалагічная (этнаграфічная) школа. Галоўнай у яе ідэя дыскрэтнага саманараджэння фальклорных матываў і сюжэтаў, якая даказвае ідэнтычнасць стадый эвалюцыі, што праходзяць у сваім развіцці розныя народы.

Да выдатных прадстаўнікоў тэорыі саманараджэння сюжэтаў. развітай у кантэксце антрапалагічнай (этнаграфічнай) школы, чые працы непасрэдна паўплывалі на развіццё айчыннай фалькларыстыкі. належаў В. Мангарт Праграма В. Мангарта, апублікаваная ў 1867 г. у дадатку да выдання «Древности Московского археологического общества» натхніла П. Шэйна як даследчыка. У знак глыбокай пашаны ў 1890 г. у «Этнографическом обозрении» збіральнік і выдавец фальклору апублікуе спецыяльны артыкул «Вільгельм Мангарт (з успамінаў этнографа)».

З сярэдзіны 1890-х гг., адзначае даследчык эвалюцыянізму ў айчыннай этнаграфіі А. Махнач. узмацняецца навуковая ўвага да эвалюцыі сацыяльных інстытутаў і матэрыяльнай культуры беларускага народа. З'яўляюцца працы М. Нікіфароўскага, М. Доўнар-Запольскага, Я. Ляцкага, А. Багдановіча,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'ектам вывучэння ў якіх выступаюць архаічныя з'явы традыцыйнай культуры беларусаў. Менавіта выяўленне названымі даследчыкамі рэліктаў міфалагічнай свядомасці дало падставы ў асобных гістарыяграфічных працах адносіць іх да міфалагічнай школы. Сапраўды, спадчына міфалагічнага кірунку ў іх не пераадолена ў поўнай меры.

Аб уплыве заходнееўрапейскага эвалюцыянізму сведчыць выкарыстанне А.Багдановічам і М. Доўнар-Запольскім даследчыцкіх схем брытанскіх эвалюцыяністаў. Базавыя тэарэтычныя палажэнні, у прыватнасці, канцэпцыя «перажыткаў». у нарысе А. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (1895) узяты аўтарам непасрэдна з працы Э. Тайлара, пра што сведчаць яго біяграфічныя дадзеныя. Пры гэтым. у пытаннях генезісу міфалагічных уяўленняў беларусаў А. Багдановіч. як пазней і Я. Карскі. зыходзяць з установак салярна-метэаралагічнай тэорыі міфа. У той час як развіццё першабытных форм рэлігійных вераванняў трактуецца імі ў духу эвалюцыянізму. «Вобразы багоў уяўляюць вынік культурнай эвалюцыі асобных народаў -піша Я. Карскі. -<...> Аднак у непадзельных яшчэ індаеўрапейцаў ужо быў закладзены трывалы падмурак міфалогіі. Галоўным боствам было неба. <...> іншыя з'явы і сілы прыроды таксама займалі ў рэлігіі сваё месца. аднак параўнальная міфалогія яшчэ не паспела дакладна вызначыць іх сэнс».

Галоўным фактарам захавання міфалагічнай свядомасці ў перажытачных формах культуры Я. Ляцкі лічыць язычніцкі дуалізм. У працы «Уяўленні беларуса пра нячыстую сілу» (1890) ён сцвярджае. што ў падсвядомасці народа «прырода ўвасабляе барацьбу двух пачаткаў дабра і зла, святла і цемры, шкоды і карысці». Пад уплывам хрысціянства, паводле аўтара, дуалізм трансфармуецца і прыводзіць да палярызацыі светапоглядных установак. Вераванні. звязаныя з «добрымі багамі - апекунамі» увасабляюцца ў хрысціянскім Богу і «выразніках яго волі святых», а ўяўленні пра злыя сілы прыроды ўвасабляюцца ў дэманалагічных персанажах. «Пад «нечысцю», «поганню» беларус разумее наогул любое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праяўленне нячыстай сілы, прычым паняцце пра чорта <...> не змешваецца з паняццем аб падуладных яму сілах – дамавіках, лесавіках. вадзяніках, русалках - што жывуць выключна на зямлі, у той час як сам чорт можа знаходзіцца і на зямлі. і «на тым свеце»«.

Этнаграфічныя матэрыялы М. Доўнар-Запольскі інтэрпрэтаваў з пазіцый метадалогіі эвалюпыянізму. Яго праца «Беларускае вясе.т.те ў ку.тьтурна-рэлігійных перажытках» (1893) прысвечана традыпыйнай для эвалюцыянізму праб.темс эвалюцыі шлюбна-сямейных адносінаў. У ёй аўтар асэнсоўвае фатьк.торна-этнаграфічныя магэрыя.ты па бе.тарускім вяселлі. сабраныя ім падчас экспедыцыі ў 1890 1891 гг. у Ігуменскі, Бабруйскі. Рэчыцкі. Мазырскі і Пінскі паветы (апублікаваныя ўпершыню ў часопісе «Впленскнй весттпік» (1890)). Паводле гіўтара. тое. пгго ў старажытнай культуры выступала дамінуючай формай, галоўнай, «жывой думкай». у пазнейшай культуры захоўваецца як перажытак, помнік «аддаленай традыцыі». «Увесь абрад. - піша аўтар пра беларускае вясе.т.те. - адбываецца ў абставінах. якія маюць характар рэлігійных перажыткаў».

У многіх этапах вясельнага абраду (сватанні, запоінах, заручынах, пасадзе, каравайным абрадзе) М. Доўнар-Запольскі бачыць праяўленне «мінулага значэння». Напрыклад, у пасадзе вылучаецца культ хатняга ачага і культ продкаў, да праяўленняў якога адносіцца «абход вакол стала, які замяніў сабой старажытны ахвярнік і пакланенне куту, куды перанесена месцазнаходжанне духаў продкаў; ужываемая пры падпальванні валасоў грамнічная свечка, што захоўваецца ўвесь год за абразамі. - запалены агонь на ахвярніку». Да «культурна-рэлігійных перажыткаў», увасобленых у пасадзе, М. Доўнар-Запольскі адносіць таксама звычай падразання валасоў нявесты, пакрывання галавы маладой на пасадзе, выкарыстанне сімвалаў пладароддзя: хлебнай дзяжы і авечай скуры ды інш. Аўтар рэканструюе стадыяльнасць працэсаў фарміравання таго ці іншага этапа вясельнай абраднасці. Напрыклад, звычай падстрыгання і падпальванпя валасоў нявесты, які трактаваўся інфарматарамі М. Доўнар-Запольскага як страта

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цнатлівасці і пераход дзяўчыны пад уладу мужа, узыходзіпь, паводле аўтара, да першабытнага абраду скрадання нявесты, у кантэксце якога падразанне і падпальванне валасоў увасабляе падначалены статус дзяўчыны наогул.

Такім чынам, у рэчышчы ідэй эвалюцыянізму М. Доўнар-Запольскі і іншыя даследчыкі сцвярджаюць існаванне значнай колькасці рэліктавых з,яў культуры ў традыцыйнай культуры беларусаў.

**Тэма13. Даследчык народнай культуры е.р. раманаў. «беларускі зборнік» (1886 - 1928)**

Пытанні па тэме

1. Біяграфічныя звесткі пра Е.Р. Раманава.
2. Е.Р. Раманаў як збіральнік вуснай народнай творчасці і наватар методыкі яе збірання.
3. Гісторыя публікацыі выпускаў «Беларускага зборніка». Тэматычнае багацце матэрыялаў.

Літаратура па тэме

Романов, Е. Р. Белорусскій сборнпк / Е. Р. Романов. Кнев. 1866. Т.1. Вып. 1 н 2;

Внтебск. 1887. Вып. 3; Вптебск. 1891. Вып. 4; Внтебск. 1891. Вып. 5; Внльня. 1901.

вып.6: Внльня. 1910. вып. 7; Внльня. 1912. вып. 8. 9; Мн.. 1928. Вып. 10.

Беларуская фальклnetwork: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60- х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Е. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка. 1 989. - С. 82 -94.

Бандарчык, В.К. Еўдакім Раманавіч Раманаў / В. К. Бандарчык. Мн.: 1961. - 305 С. Раманаў Еўдакім Раманавіч // Асветнікі зямлі бе.тарускай. Х пач. XX ст.: энцыкл. давед. Мн.,2001. С. 348-349;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Еўдакім Раманавіч Раманаў (30 жніўня 1855. м. Нова-Беліца, Гомельскі павет, Магілёўская губерня 20 студзеня 1922. Стаўрапаль) беларускі этнограф, фалькларыст і археолаг. Нарадзіўся ў беднай мяшчанскай сям'і. У 1867 паступіў у Гомельскую прагімназію, нягледзячы на нястачу сродкаў. У 1869 памірае маці, Е. Раманаў застаецца сіратою, каб мець магчымасць працягваць вучобу, займаецца рэпетытарствам. У 1870 г. спрабуе паступіць у Магілёўскую гімназію. але нягледзячы на паспяхова здадзеныя ўступныя экзамены «не аказалася вакансій». Няўдачай скончылася спроба паступіць вольным слухачом ва ўніверсітэт. Здаў экзамены на атрыманне звання народнага настауніка экстэрнам. У 1872 г. семнаццацігадовы Н. Раманаў накіраваны на працу ў Еерасімаўскае народнас вучылішча Аршанскага павета Магілёўскай губерні Працаваў настаўнікам.

З самага пачатку Е. Р. Раманаў спалучаў педагаі ічную, этнаграфічную і навуковую дзейнасць, у якой важнае месца займала і мовазнаўчая тэматыка. На жаль, не ўсе сабраныя ім моўныя матэрыялы і завершаныя мовазнаўчыя даследаванні былі апублікаваны, не ўсе нават захаваліся ў рукапісах. Займаўся збіраннем твораў вусна- паэтычнай творчасці і даследаваннем культуры і быту беларускага народа. У 1877 Е. Р. Раманаў паведамляў Расійскай акадэміі навук, што за пяць гадоў настаўніцкай працы ім сабрана 2000 беларускіх слоў і з гэтага матэрыялу складзена «Спроба беларускага слоўніка», а ў якасці ўводзін да яго - «Кароткая беларуская граматыка». Аддзяленнсм рускай мовы і славеенасці Акадэміі навук даследчыку прапанавалі аформіць свой слоўнік як дапаўненне да слоўніка І.І. Насовіча. На працягу наступных пяці гадоў Е. Р. Раманаў збіраў не зафіксаваныя Г.І. Насовічам словы на тэрыторыі Магілёўшчыны, лексікаграфічна апрацоўваў іх.

Далейшая праца над слоўнікам была спынена. бо Е. Р. Раманаў пачаў падрыхтоўку да друку сваёй асноўнай фальклорна-этнаграфічнай працы «Беларускага зборніка», своеасаблівай энцыклапедыяй побыту, творчасці. матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа XIX - пач. XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Планавалася выдаць матэрыялы ў 15 кнігах. (Пры жыцці Е. Р. Раманава выйшла 9 тамоў (1886-1912). 10 том выпусціў Інбелкульт (1928), падрыхтаваныя 1114 тамы загінулі ў Другую сусветную вайну, лёс 15 тома невядомы).

Назапашаны за час многіх гадоў працы над складаннем беларускага слоўніка фальклорны матэрыял падштурхнуў даследчыка да грандыёзнай задумы - выдання шматтомнага збору беларускіх народных твораў і этнаграфічных апісанняў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Але з друкаваннем зборніка ўзнікла нямала перашкод і цяжкасцей. Расійская акадэмія навук адмовіла складальніку ў матэрыяльнай падтрымцы выдання першага выпуска «Беларускага зборніка», спасылаючыся на ўжо апублікаваны зборнік П.В. Шэйна. Безуважна ставіліся да выдання кнігі і на радзіме.

І толькі з дапамогай сяброў і знаёмых Е.Р. Раманаў выдрукаваў першы і другі выпускі (адной кнігай) «Беларускага зборніка» у 1886 г. у Кіеве. У прадмове да кнігі складальнік разглядае публікацыі беларускіх вусна-паэтычных твораў папярэднікамі і рэзка крытыкуе П. Гільтэбранта, П. Шэйна і іншых складальнікаў, ухваляе зборнік ІП. Бяссонава. Разнастайнасць і навізна змешчаных матэрыялаў была высока ацэнена вучонымі, але і крытыкавалася за непаслядоўнасць класіфікацыі твораў, незахаванне строфікі песень (па словах Е.Р. Раманава з-за недахопу паперы).

Значна лепш падрыхтаваны трэці выпуск «Беларускага зборніка» (1887), у які ён уключыў 141 буйны празаічны твор і болып 40 малых празаічных жанраў. Яны сістэматызаваны па раздзелах: «Жывёльны эпас», «Казкі міфічныя», «Казкі бытавыя, сатырычныя і гумарыстычныя». Народнай прозе прысвсчаны і чацвёрты выпуск (1891). У гэтым жа годзе выйшаў у свет і пяты выпуск «Беларускага зборніка», у ім апублікаваны замовы, батлеечныя тэксты, духоўныя вершы.

Шосты выпуск «Беларускага зборніка» выйшаў у 1901 г. У ім былі змешчаны народныя казкі. Невялікі па аб'ёму, але значны па каштоўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сёмы выпуск, у якім апублікаваны песні і прыпеўкі з нотамі падрыхтаванымі М.М. Чуркіным. Звыш 1200 песень уключыў Раманаў у восьмы выпуск (1912). У кнізе даюцца апісанні абрадаў, каляндарных і сямейных і пры гэтым прыводзяцца пэўныя песні. Складальнік прадмовы акцэнтуе ўвагу на беларускім вяселлі і называе яго своеасаблівай операй. Каштоўныя думкі выказаў Раманаў у адносінах арэалу народных песень.

Дзевяты выпуск «Беларускага зборніка» быў выдадзены ў 1912 г. у Вільні. У ім ск.іадальнік змясціў узоры народных гаворак (прафесіяна;іыіых жаргонаў і інпг).

Археалагічныя і этнаграфічныя калекцыі Е. Р. Раманава ўзбагацілі многія айчынныя і замежныя музеі. Цяпер у Эрмітажы захоўваецца 1017 экспанатаў Е. Р. Раманава, у Музеі антрапалогіі і этнаграфіі імя Пятра І АН Расіі 1007, у Дзяржаўным музеі этнаграфіі народаў СССР звыш 1100, у Гісторыка-этнаграфічным музеі Акадэміі навук Літоўскай ССР – 242, якія даюць багацейшыя матэрыялы для вывучэння гісторыі Беларусі, Літвы і Латвіі. За гэты перыяд Е. Р. Раманаў надрукаваў каля 60 артыкулаў, нарысаў. рэцэнзій і заметак па беларускай этнаграфіі, археалогіі, гісторыі і філалогіі. Адкрыцці вучонага добра дакументаваныя і апрацаваныя, яны пакладзены ў аснову наступных даследаванняў па археалогіі. Па ініцыятыве Е.Р. Раманава і пры яго актыўным удзеле былі заснаваны Віцебскі, Магілёўскі і Віленскі этнаграфічныя музеі (куды даследчык перадаў шмат уласных знаходак), неаднаразова наладжваліся выстаўкі.

Дзейнасць Е.Р. Раманава адзначана Малым і Вялікім залатымі медалямі, а таксама дыпломамі навуковых таварыстваў. Лаўрэат імянных прэмій Расійскай акадэміі навук.

Адзначаныя і іншыя навуковыя працы сведчаць аб тым вялікім укладзе, які ўнёс Е.Р. Раманаў у беларускую фалькларыстыку і этнаграфію, а таксама ў лінгвістыку і археалогію. У фалькларыстыцы Раманаў адзін з першых апублікаваў найбольшую колькасць дакладна запісаных самім песень, казак, замоў, прыпевак і твораў іншых жанраў, якія з'яўляюцца важнай крыніцай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для вывучэння духоўнай культуры народа. Раманаў - не толькі буйны збіральнік вуснай народнай творчасці, але наватар методыкі яе збірання і сістэматызацыі (тры асноўныя групы, сярод якіх менавіта чарадзейна-фантастычныя творы. лічацца найбольш інфарматыўнымі ў плане рэканструкцыі архаічных вераванняў). Ужытыя Раманавым прынцыпы запісу казак былі, бясспрэчна, наватарскімі. Значэнне трэцяга выпуску «Беларускага зборніка» ў гісторыі фалькларыстыкі ў тым, што гэта было першае асобнае выданне беларускіх народных казак. Да гэтага часу беларуская казка друкавалася ў агульных фальклорных зборніках. і вядома толькі 13 публікацый: у А.М. Афанасьева 9 тэкстаў, у П.В. Шэйна.

Дзейнасць Е.Р. Раманава аказала вялікі ўплыў на далейшае развіццё беларускай этнаграфіі і фалькларыстыкі.

**Тэма 14. Навуковая спадчына м. Федароўскага. «люд беларускі» (1891-1981).**

Пытанні па тэме

1. М. Федароўскі і Беларусь: біяграфія даследчыка.
2. Еісторыя публікацыі яго фундаментальнай працы «Люд беларуекі».
3. Багацце фальклорных матэрыялаў «Люду беларускага».

Літаратура па тэме

Саламевіч, І. У. Міхал Федароўскі / Янка Саламевіч. - Мн. : Выш. шк.. 1972. 383с.

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Е. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У. А. Васілевічі інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. Мн.: Навука і тэхніка, 1989. - С. 119-134.

Федароўскі, М. Люд беларускі. Вяселле. / М. Федароўскі. - Уклад., прадм. і пер. з польскай мовы І. У. Саламевіча. - Мн.: Полымя. 1991. 142 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міхал Федароўскі - беларускі і польскі фалькларыст, этнограф, археолаг. Нарадзіўся 1 верасня 1853 г. ў Варшаве. Бацька яго Адольф прымаў актыўны ўдзел у паўстанні 1863 - 1864 гг..

У 1870 г. скончыў прагімназію ў Варшаве. Пачынае паглыблена вывучаць філасофію, літаратуру. З-за кволага здароўя (з 13 год хварэў на сухоты) сваякі прадраклі яму прафэсыю «гаспадара». працаўніка на зямлі. Таму на працягу 1870-1874 гг. юнак праходзіць сельскагаспадарчае навучанне пад Варшаваю, кароткую вучобу вольнага слухача на агранамічным аддзяленні Пятроўска-Разумоўскай акадэміі пад Масквой.

Вывучэнне фальклору ў Польшчы. У 1875 -1877 гг. Федароўскі працуе ў маёнтках аграрыя і прыродазнаўцы М. Палескага ў Олькускім павеце недадёка ад Кракава. Пачынае збіраць этнаграфічныя матэрыялы ў ваколіцах Севежа. За два гады малады даследчык назапасіў горы матэрыялу і напісаў двухтомпую працу «Люд ваколіц Жарак. Севежа і Піліцы. яго звычаі, спосаб жыцця, абрады, паданні. чары. забабоны, песні. забавы. прыказкі, загадкі і ўласцівасці мовы» (выйшла ў 1888 - 89 гг.)

Пад канец 1877 г. пераехаў у ваколіцы Пружан. У Беларусі ён правядзе 27 год. Увосень 1 878 г. скончыў апісанне вясельнага абраду ў Ваўкавыскім павеце. Гэта цэлая манаграфія на 144 старонках рукапісу, якая паказала вяселле беларусаў ад пачатку да канца з усімі яго дэталямі. Апісанне ілюструюць 208 песень.

Пачаўшы работу ў Беларусі, Федароўскі найперш вывучыў мову народа, даследаваў асаблваеці дыялектаў, з сялянамі любіў гаварыць па-іхняму (пасля нават крытыкаваў сваіх калег-этнографаў М. Дзьмітрыева і П. Шэйна за няўвагу да мовы беларусаў). Ён збіраў прадметы матэрыяльнай культуры (купляў у сялян па вёсках, на кірмашах, даставаў праз знаёмых) і рабіў запісы твораў культуры духоўнай - беларускага фальклору.

У 1884-1894 гг. Федароўскі арандаваў фальварак Косін у Ваўкавыскім павеце. Гэты пэрыяд быў самым інтэнсіўным часам збіральніцкай дзейнасці этнографа. Задумаўшы стварыць усебаковае даследванне пра беларускі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народ. Федароўскі запісваў усё: паданні і казкі, вераванні і забабоны. жарты і показкі, прыказкі і загадкі, песні і прыпеўкі: занатоўваў разнастайныя факты і здарэнні з мясцовага жыцця, апісваў абрады, народныя промыслы, прадметы матэрыялытай культуры. Але першай любоўю Федароўскага-збіральніка з поўным правам можпа назваць песню. За першае дзесяцігоддзе працы ў Беларусі ён запісаў некалькі тыеяч гэкстаў народных песень. Увесь гэты час шукаў у памочнікі музыку, каб збіраць і мелодыі.

Праз Я. Карловіча ў 1889 г. Федароўскі ўстанавіў кантакт з Акадэміяй навук у Кракаве, якая выказала гатоўнасць надрукаваць сабраныя матэрыялы.

У 1891 г. рукапіс першага тому быў гатовы. Аўтар назваў яго «Люд беларускі на Русі Літоўскай. Матэрыялы да славянскай этнаграфіі, сабраныя ў 1877 -1891 гг. Міхалам Федароўскім. Т. I Вера, вераванні і забабоны люду ваколіц Ваўкавыска. Слоніма, Ліды і Саколкі» . Выйшаў ён толькі ў 1897 г. Сюды ўвайшло 2835 запісаў пра вераванні беларусаў, звязаныя з Богам і святымі. міфічнымі істотамі. прыродай і чалавекам. адносінамі чалавека да прырод,. духоўпага свету, да людзей і сябе самога. з ушанаваннем прадметаў, матэрыялы пра сямейныя, таварыскія, юрыдычныя звычаі, пра гаспадарчы і прамысловы занятак насельніцтва.

Першы том «Люду беларускага» атрымаў высокую ацэнку вучоных – расейскіх,. Польскіх, украінскіх, чэскіх. Дзесяць гадоў Кракаўская Акадэмія шукала сродкі, каб выдаць рукапісы наступных тамоў. Другі том выйшаў у 1902 г. У ім надрукавана 410 казак, паданні пра мясцовасці. Трэці том выйшаў у 1903 г. У яго ўвайшлі гістарычныя і мясцовыя паданні, апавяды. бытавыя казкі і показкі. Федароўскі дадаў сюды і магэрыялы са Слуцкага і Наваградзкага паветаў .

Чацьвёрты том «Люду беларускага» выйшаў з друку ў 1935 г.. ужо пасля смерці Федароўскага. З 28 000 картак-запісаў Федароўскага Ч. Пяткевіч – этнограф, даследчык рэчыцкага Палесся - адабраў 13 231 нумар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выданнс стала неператўзыдзеным зборнікам беларускіх прыказак і прымавак, фразеалагізмаў.

Песні са збораў Федароўскага ўвайшлі ў 5, 6 і 8 тамы «Люду беларускага». якія выйшлі ў 1958. 1960 і 1981 гг. (сёмы том з'яўляецца дадаткам да пятага і шостага).

У канцы XIX - пачатку XX ст. Федароўскі выбіраецца чальцом шматлікіх навуковых установ і таварыстваў. Шматлікія станоўчыя водгукі на яго тамы «Люду беларускага» робяць імя Федароўскага вядомым і за мяжою.

Інтэнсіўная збіральніцкая. навуковая і выдавецкая праца прывяла да таго, што Федароўскі занядбаў гаспадарку і апынуўся перад фактам разарэння. Панёсшы велізарныя страты. у 1904 г. Федароўскі мусіў пакінуць Беларусь.

Ён апынуўся ў горадзе свайго дзяцінства Варшаве, дзе Федароўскі не забывае пра Беларусь. Збірае пра яе матэрыялы на месцы, каб папоўніць свае этнаграфічныя папкі. Цесны кантакт у яго з Вільняй, з рэдакцыяй «Нашай нівы», якую ён выпісвае. Праз «Нашу ніву» ён набывае беларускія выданні, календары.

У 1921 г. М. Федароўскі стаў навуковым супрацоўнікам аддзела этналогіі Інстытута антрапалагічных навук. Адразу ж пачаў рыхтаваць выданне далейшых тамоў «Люду беларускага». 3 1922 г. стан здароўя Федароўскага пагоршыўся. 10 чэрвеня 1923 г. Міхала Федароўскага ня стала. Пахаваны ён на Павонзкаўскіх могілках у Варшаве.

Выдатны збіральнік і даследчык беларускіх народных твораў Міхал Федароўскі ўвайшоў у гісторыю фалькларыстыкі як адзін з буйнейшых народазнаўцаў. уклад якога ў развіццё навукі можна супаставіць з працамі П.В. ІІІэйна, Е.Р. Раманава, У.М. Дабравольскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 15. Даследаванні у. М. Дабравольскага .«смаленскі этнаграфічны зборнік» (1891-1903)**

Пытанні па тэме

1. Фальклорна-этнаграфічная дзейнасць У.М. Дабравольскага.

2. Матэрыялы «Смаленскага этнаграфічнага зборніка» ў кантэксце кампаратывісцкага вывучэння культуры беларусаў і рускіх.

Літаратура па тэме

Шлюбскі, А. Этнаграфічная дзейнасць Дабравольскага / Ал. Шлюбскі. - Мн.. 1928.

Гуліцкі М. Ф. Дабравольскі Уладзімір Мікалаевіч // Бсларуская мова. Энцыклапедыя.

Мн..1994. -С. 172 173;

Беларуская фальклnetwork фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60- х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Ціпшанка, У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд. А. С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка. 1989. - С. 1 85 198.

Уладзімір Мікалаевіч Дабравольскі (11 жніўня 1856, в. Краснасвяцкае Прудкаўскай вол. Смаленскага пав. Смаленскай губерні -7 мая 1920. Смаленская вобл.) беларускі і рускі краязнавец, этнограф і мовазнавец.

Нарадзіўся ў сям'і чыпоўніка-двараніна. У 1868-1876 гг. вучыўся ў Смаленскай гімназіі, у 1880 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта. Працаваў выкладчыкам Смаленскай жаночай гімназіі, а з 1883 г. перабраўся ў свой маёнтак, збіраў этнаграфічны, фальклорны і лінгвістычны матэрыял.

Падтрымліваў сувязь з А. А. Шахматавым. Я. Ф. Карскім. У. І. Ламанскім. І. В. Ягічам. Трагічна загінуў на Смаленшчыне.

Краязнаўчай работай зацікавіўся яшчэ студэнтам, слухаючы лекцыі Ф. І. Буслаева, Ф. Я. Корша. У. Ф. Мілера. Выдаў «Смаленскі этнаграфічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зборнік» (т. 1-4, 1891-1903), напісаў шмат артыкулаў мовазнаўчага характару. Яго самая каштоўная праца ў галіне мовазнаўства «Смаленскі абласны слоўнік» (1914), у якім распрацавана 16 560 артыкулаў з дыялектнымі словамі руска-беларускага памежжа. Праца складалася на падставе матэрыялаў для «Смаленскага этнаграфічнага зборніка». таму ілюстрацыямі ў ёй служаць і ўрыўкі з апісанняў абрадаў, звычаяў, побыту.

У гістарыяграфіі прызнаецца, што самай значнай працай даследчыка з'яўляецца чатырохтомны «Смаленскі этнаграфічны зборнік» (1891-1903) . У ім змешчаны надзвычай багаты рускі і беларускі фальклорна-этнаграфічны матэрыял.

Першая частка «Смаленскага этнаграфічнага зборніка» (1891) прысвечана празаічным народным творам - апавяданням, дегендам. паданням. казкам чарадзейным. сацыялыіа-бытавым, пра жывёл, а таксама замовам.

Упершыню ўключаны ў фальклорны зборнік апавяданні, успаміны (мемараты), якія выразна адлюстроўваюць быт і погляды сялянства, іх інтарэсы і псіхалогію. Вельмі цікавыя па сваім змесце замовы, сярод традыцыйных Дабравольскі прыводзіць таксама ўзоры замоў выразнага сацыяльнага гучання («Замова. каб быць апраўданаму на судзе». «Чары на поспех у судзе». «Ад несправядлівага абвінавачвання» і іпііі.). У першую частку ўвайшлі таксама чарадзейныя казкі (39 тэкстаў).

У другой частцы зборніка (1893) апублікаваны сямейна-абрадавыя песні, у тым ліку змешчана 18 хрэсьбінных і 680 вясельных песень. Апісанні пахавальных абрадаў уключаюць 14 галашэнняў, якія надзвычай ярка абмалёўваюць рэальнае цяжкое становішча сям'і, што заставалася без кармільца.

У трэцяй частцы зборніка (1894) апублікаваны парэміі (прыказкі, прымаўкі. трапныя выслоўі. заклінанні, прыкметы). У чацвёртую частку «Смаленскага этнаграфічнага зборніка» (1903) увайшлі апісапні ігрышчаў, каляндарна-абрадавыя песні, дзіцячыя, пазаабрадавыя, гістарычныя песні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

духоўныя вершы. У асобны раздзел вылучаны песні пра Сценьку Разіна. Касцюшку і інш.

Спадчына У.М. Дабравольскага выкарыстоўвалася многімі этнографамі XIX і XX стст. не згубіла яна навуковай каштоўнасці ў наш час. Яна дае багаты матэрыял для кампаратывісцкага вывучэння культуры рускіх і беларусаў. Разам са зборнікамі Раманава з Магілёўшчыны, Нікіфароўскага і Шэйна з Віцебшчыны і Міншчыны склалі цэлую эпоху ў развіцці айчыннай фалькларыстыкі.

**Тэма 16. Навуковая спадчына м.я. нікіфароўскага**

Пытанні па тэме

1. Біяграфія М.Я. Нікіфароўскага.

2. Змест і значэнне працы М.Я. Нікіфароўскага «Нарысы Віцебскай Беларусі».

3. Жанравае багацце зборніка М.Я. Нікіфароўскага «Простанародныя прыкметы і павер'і, прымхлівыя абрады і звычаі, легендарныя паданні пра асобы і мясціны».

4. Белетрызаваныя нарысы М.Я. Нікіфароўскага па беларускай дэманалогіі «Нячысцікі. Збор простанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу».

Літаратура па тэме

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60- хгадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. Мн.: Навука і тэхніка. 1989. С. 198-220.

Пятроўская, Г.А. Пачынальнік беларускага народазнаўства М.Я.Нікіфароўскі. -Мн. : Навука і тэхніка. 1991. - 72 С.

Нікіфароўскі Мікалай Якаўлсвіч // Энцыкл. гісторыі Беларусі : у 6 т. Мн.. 1999. - Т.5. С. 326 -327.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мікалай Якаўлевіч Нікіфароўскі (17 мая 1845. в. Вымна Веліжскага павета - 1910) выдатны збіральнік і даследчык народных звычаяў і абрадаў, складальнік змястоўных зборнікаў фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў.

У 1991 г. Галіна Аляксандраўна Пятроўская публікуе сваю працу «Пачынальнік беларускага народазнаўства М.Я. Нікіфароўскі», у якой створаны выразны і вельмі «чалавечы» партрэт збіральніка, цытуюцца яго лісты і ўспаміны.

Нарадзіўся М.Я. Нікіфароўскі ў в. Вымна Веліжскага павета (сёння - Віцебскі раён) у беднай сям'і. Маці імкнулася даць дзецям пачатковую адукацыю, выдаткоўвала на гэта, як успамінаў потым славуты збіральнік, апошнія грошы. Першымі настаўнікамі Нікіфароўскага былі выпадковыя людзі: адстаўны салдат, хросны бацька, пісьменны падлетак, манах, сельскі святар. Хлопчык ідзе ў людзі праз царкоўную навуку: спявае ў архірэйскім хоры, паступае ў духоўнае вучылішча, потым у Віцебскую семінарыю. У семінарыі, рыхтуючыся да духоўнага сану, малады Нікіфароўскі збірае матэрыялы для змагання, як гэта належыць святару, з перажыткамі паганства. У будучым тое, з чым семінарыст Нікіфароўскі хацеў змагацца. стане галоўным аб'ектам яго навуковага зацікаўлення і шчырага чалавечага захаплення.

У 1867 г. пачынаецца настаўніцкая дзейнасць Нікіфароўскага, якая працягнецца 43 гады. Большую частку жыцця М.Я. Нікіфароўскі працуе менавіта ў навучальных установах Віцебска на невысокіх пасадах.

У жыцці сціплы чалавек. сваю настаўніцкую місію М.Я. Нікіфароўскі рэалізоўваў і тады, калі заахвочваў навучэнцаў да збірання фальклору. Тут варта нагадаць, што М.Я. Нікіфароўскі быў шматгадовым і вельмі плённым карэспандэнтам П.В. Шэйна. Менавіта Нікіфароўскаму ў значнай меры абавязаны сваёй папулярнасцю і навуковай каштоўнасцю фалькдорна-этнаграфічныя зборнікі Шэйна. Дасланае М.Я. Нікіфароўскім склала значную частку трох тамоў «Матэрыялаў» П.В. Шэйна (1887-1902), пра што падрабязна пісалі яшчэ ў пачатку XX ст. Я.Ф. Карскі і У.К. Стукаліч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку 1990-х гг. М.Я. Нікіфароўскі знаёміцца з Я.Ф. Карскім і неўзабаве актывізуе самастойную даследчыцкую дзейнасць, практычна адразу пачынаюць выходзіць яго грунтоўныя прапы.

Серыя нарысаў з сямі частак пад агульнай назвай «Нарысы Віцебскай Беларусі» (1892 - 1899). Асноўная ўвага надаецца сацыяльна-эканамічнаму становішчу і побытавай культуры розных груп насельніцтва Віцебшчыны (старцы, музыкі, паншчынныя сяляне, "пітушчыя і прапойцы" і інш.) у час прыгонніцтва. «Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку» (1895) - найбуйнейшае ў XIX ст. даследаванне матэрыяльнай культуры і вытворчай дзейнасці сялян Віцебшчыны. Уключае апісанне народнай кулінарыі, традыцыйнага касцюма, характарыстыку земляробства, рамёстваў, промыслаў, прылад працы, тыпаў паселішчаў і гаспадарчых пабудоў. Капітальнай прапай М.Я. Нікіфароўскага стаў таксама зборнік «Простанародныя прыкметы і павер'і, прымхлівыя абрады і звычаі. легендарныя паданні пра асобы і мясціны» (1897), у якім апублікавана больш за дзве тысячы фальклорных адзінак (прыкмет, павер'яў, забабонаў, абрадаў, звычаяў, апісанняў сродкаў народнай медыцыны і ветэрынарыі, а таксама аповедаў).

Белетрызавапыя нарысы «Нячысцікі. Збор простапародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу» (Віцебск. 1995. 2 - е выд. 1907) разгорнутае апісанне паходжання. Іерархіі, лакалізацыі і функцый дэманалагічных істот. Здаецца, што аўтар кіруецца жаданнем паказаць іх вялізную колькасць, разнастайнасць і ўсюдыіснасць.

Навуковая дзейнасць Мікалая Якаўлевіча Нікіфароўскага была вельмі плённай і самаадданай. Дзякуючы яго працам сёння мы маем багаты фактычны матэрыял па многіх з'явах традыцыйнай культуры Віцебшчыны: калядная гульня «Жаніцьба Цярэшкі», пахавальны абрад. галашэнні і сістэма дзён памінання продкаў, народна-медыцынскія практыкі, прыкметы. павер'і і засцерагальныя дзеянні, дэманалогія, загадкі, прыпеўкі і многае іншае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М.Я. Нікіфароўскі, паводле Г.А. Пятроўскай. быў «прадстаўніком сапраўднай нацыянальнай інтэлігенцыі, дзейнасць якой абумоўлівалася і была выклікана да жыцця ростам нацыянальнай свядомасці беларускага народа».

**Тэма 17. Даследчык усходнеславянскай культуры м.а. янчук**

Пытанні па тэме

1. Біяграфічныя звесткі пра М.А. Янчука.

2. Дзейнасць М.А. Янчука ў ТАПАЭ. «Праграма для збірання этнаграфічных звестак».

3. Унёсак М.А. Янчука ў вывучэнне народнай музыкі і песні.

Літаратура па тэме

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60 х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. I. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інга. Пад рэд А. С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка. 1989. - С. 241-255.

Петровская. Г.А. Не погасла звезда: Жізненный н творческнй путь Н. А. Янчука. Мн.: Наука і техннка. 1987. - 78 с.

Янчук Мікалай // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / Рэдкалегія: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. - Мн.: БелСЭ, 1989. - С. 554.

Імя Мікалая Андрэевіча Янчука (1859-1921) выдатнага беларускага. украінскага і рускага этнографа, фалькларыста, літаратуразнаўцы і музыказнаўцы, трывала ўвайшло ў гісторыю беларускай культуры. Ен быў адным з тых нямногіх прадстаўнікоў навукі, хто на стыку стагоддзяў і ў першыя гады савецкай улады горача адстойваў маладую беларускую культуру і дапамагаў ёй стаць на ногі. Нарадзіўся М.А. Янчук у сям'і прыгоннага селяніна ў в. Карніца Канстанцінаўскага павета Седлецкай губерні (зараз тэрыторыя Полшчы).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для выхавання і адукацыі М.А. Янчука важнае значэнне меў той факт, што ўсе ў сям'і Янчукоў былі пісьменнымі, бацькі былі стойкімі паслядоўнікамі ўніі.

У фарміраванні поглядаў і атрыманні адукацыі Мікалая Янчука вялікую ролю адыграла сям'я Я.М. Гарднера камісара на сялянскіх справах у г. Беле. Дырэктар гімназіі І.П. Стронін, імкнучыся хоць чым-небудзь дапамагчы лешпаму вучню гімназіі, рэкамендаваў яго ў якасці хатняга настаўніка ў гэтую сям'ю. Жонка Гарднера Раіса Аляксандраўна ведала замежныя мовы, любіла музыку і прыахвоціла да заняткаў мовамі і спевамі Мікалая. Пазней М. Янчук не раз з удзячнасцю ўспамінаў пра заняткі музыкай, што ў далейшым саслужыла яму немалую службу як фалькларысту-збіральніку. У 1879 г. разам з сям'ёй Гарднера Янчук пераехаў у Маскву і быў прыпяты ў гімназію. Пасля М. Янчук паступіў у Маскоўскі ўніверсітэт і з трэцяга курса пачаў займацца на славяна-рускім аддзяленні старажытнарускай літаратурай і народнай славеснасцю ў вядомага вучонага прафесара М.С. Ціханравава, які аказаў на М. Янчука вялікі ўплыў, дапамог яму знайсці свой шлях у навуцы.

Пасля заканчэння ўпіверсітэта ў 1885 г. М.А. Янчука пакінулі пры кафедры. М. Янчука прынялі ў Таварыства аматараў прыродазнаўства. антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце (ТАПАЭ), а неўзабаве запрасілі стаць сакратаром аддзела этнаграфіі пры ТАПАЭ, старшынёй якога ў той час быў вядомы вучоны Ус.Ф. Мілер.

Будучы сябрам ТАПАЭ, Янчук горача зацікавіўся і антрапалогіяй, вывучыў прыёмы антрапаметрыі і ўлетку 1886 г. быў накіраваны ў камандзіроўку ў Беларусь і Літву для антрапалагічных даследванняў. Вынікі гэтай паездкі былі надзвычай добрыя: ён напісаў грунтоўныя этнаграфічныя нарысы «Па Мінскай губерні» (1889).

Першыя ж апублікаваныя навуковыя працы М.А. Янчука выявілі яго надзвычайныя здольнасці да тэарэтычнага асэнсавання з'яў быту і духоўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры народа і паставілі яго ў адзін рад з лепшымі вучонымі-этнографамі і фалькларыстамі таго часу.

Як сакратар Этнаграфічпага аддзела ТАПАЭ Янчук імкнуўся скіравапь збіранне фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў у навуковае русла, даць рэкамендацыі, як правільна гэта рабіць. І пад яго рэдакцыяй выйшла аб'ёмістая «Праграма для збірання этнаграфічных звестак» (1889), якая была надрукавана таварыствам у двух выданнях і хутка распаўсюдзілася па ўсёй Расіі. Пры складанні «Праграмы...» мелася на ўвазе ахапіць па магчымасці ўсе народы, што насялялі Расію, іх жыццё, побыт, народную творчасць. Распрацоўка «Праграмы...» патрабавала вялікай падрыхтоўчай работы, таму што трэба было даць вельмі падрабязную інструкцыю для збіральнікаў.

«Праграмай...» прадугледжваўся збор звестак геаграфічных, гістарычных, антрапалагічных, пра жыллё, адзенне, ежу, побыт, сямейныя звычаі, вераванні, мову, мастацтва і інш. Збіранне вуснапаэтычных твораў не адрывалася ад апісання абрадаў і звычаяў.

Адна з першых буйных прац М.А. Янчука, прысвечаных Беларусі «Па Мінскай губерні (Нататкі з паездкі ў 1886 годзс)». Спачатку па частках пататкі публікаваліся ў газеце «Мннскпй лнсток» за 1 886 1 887 гг., а потым выйшлі асобнай кнігай (1 889).

Пры паездцы ў Беларусь Янчук ставіў дзве мэты: антрапалагічныя і этнаграфічныя даследванні - вывучэнне асабліваспей фізічных тыпаў беларуса, папаўненне звестак пра побыт, звычаі, абрады, светапогляд, мову беларусаў, што ён спадзяваўся ажыццявіць шляхам дакладнага запісу песень, розных павер'яў, забабонаў, звычаяў і г.д. Вялікую каштоўнасць маюць песні з нотамі, часткова запісаныя самім М.А. Янчуком, часткова яго карэспандэнтамі.

М.А. Янчук гаворыць аб негатыўных адносінах грамадскасці да народнай музыкі як «сумнай». манатоннай і аднастайнай. Але, зазначае ён, у народнай музыцы шмат «прыгажосці, сілы, грацыі». «Услухайцеся. напрыклад. у якую-небудзь веснавую песню, якую маладая беларуская

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяўчына спявае дзе-небудзь у полі, сярод расквітнеўшай прыроды: гэта суцэльнае трыумфаванне. якое нястрымна льецца з грудзей, поўных радасці, кахання і пяшчоты; гэта сапраўдны гімн вясне. да якога вам так і хочацца далучыць свой слабы голас, толькі баішся ўнесці дысгармонію ў гэтыя вясёлыя. поўныя жыцця і сілы гукі», - піша М.А. Янчук.

Ад гарадскога насельніцтва, на думку даследчыка. пераходзіць да сялян погляд, што «старадаўнія народныя песні смешныя, непрыгожыя і, што спяваць іх у прысутнасці другіх сорамна».

У дадатку да працы вучоны змясціў 158 песень. Сістэматызаваў іх па функцыянальна-этнаграфічным прынцыпе: вясельныя. радзінныя і хрысцінныя, пасядзелкавыя, калядкі і шчадроўкі, масленічныя, велікодныя, веснавыя, купальскія, жніўныя і пакосныя, летнія, гістарычныя і розныя. Паўней і лепш за іншыя прадстаўлены вясельныя - 48 песень.

Каштоўнасць зборніка Янчука павялічваееца дзякуючы нотным прыкладам. Дасведчанасць у апублікаваных раней народных песнях. знаёмства са зборнікамі народных песень выявіў аўтар у заўвагах да тэкстаў. Ён параўноўвае змешчаныя ім тэксты з творамі са збораў П. Шэйна, П. Бяссонава, Е. Раманава, Я. Чачота.

М.А. Янчук цікавіўся беларускім нацыянальным адраджэннем. падтрымліваў кантакты з рэдакцыяй «Нашай нівы». Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі М.А. Янчук чытаў курс беларускай і ўкраінскай літаратур у Маскоўскім універсітэце, удзельнічаў у рабоце камісіі па арганізацыі Беларускага ўніверсітэта пасля адкрыцця БДУ ў 1921 г. стаў прафесарам кафедры беларускай літаратуры і этнаграфіі. У 1918 - 21 гг. сябра Беларускага навукова-культурнага таварыства ў Маскве. Падчас вяртання з Мінска ў Маскву ў 1921 г. даследчык захварэў на тыф і памёр. Пахаваны ў Маскве.

**Тэма 18. Фальклярыстычная дзейнасць м.в. доўнар-запольскага**

Пытанні па тэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Біяграфія М.В. Доўнар-Запольскага.

2. Беларускае народнае вяселле ў даследаваннях М. Доўнар-Запольскага.

3. «Песні пінчукоў»: жанравы склад, значэнне зборніка.

Літаратура па тэме

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванпе народнай творчасці ў 60-х гадах XIX пачатку XX ст. / Аўт. Г.А. Пятроўская, І. К. Цішчанка. У.А. Васілсвіч і інш. Пад рэд А.С. Фядосіка. Мн.: Навука і тэхніка, 1989. С. 233 241.

Доўнар-Запольскі Мітрафан Віктаравіч // Беларускі фальклор: энцыклапедыя. Мн.: 2005. -Т.1. - С. 433-434.

Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі (2 чэрвеня 1867 г., Рэчыца Мінскай губерні -30 верасня 1934, Масква) выдатны беларускі і ўкраінскі гісторык, этнограф, грамадскі дзеяч, які ўнёс вялікі ўклад у вывучэнне побыту, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

М. Доўнар-Запольскі паходзіў з дробнага беззямельнага дваранства, з сям'і калежскага сакратара. Доўнар-Запольскія адлічвалі свой радавод з XVI ст. і былі разгалінаваны на шэсць родаў,1 кожны з якіх карыстаўся гербам «Побуг».

У шаснаццацігадовым узросце М. Доўнар-Запольскі робіць перпіыя крокі ў краязнаўчых даследаваннях. У 1883 г. у папулярным расійскім альманаху «Заря» з'яўляецца яго першая нататка «из Мозыря», у 1885 г. ён друкуе ўжо пять замалёвак. У Мазырскай прагімназіі праз аднаго з супрацоўнікаў П. Шэйна М. Доўнар-Запольскі далучаецца да збору і апрацоўкі статыстычных звестак аб Паўночна-Заходнім краі. За 1888 г. гімназіст М. Доўнар-Запольскі апублікаваў шэсць даследчыцкіх матэрыялаў, у тым ліку і першую сваю брашуру «Белорусская свадьба и свадебные песнн: (Этнографнческнй этюд)» і аб'ёмны нарыс «Белорусское прошлое». у якім праглядвалася цэльная канцэпцыя гісторыі Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля заканчэння Мазырскай прагімназіі і Кіеўскай класічнай гімназіі Мітрафан Доўнар-Запольскі паступае ў Кіеўскі ўніверсітэт. Пераадолеўшы шматлікія нялёгкія перашкоды, ён чытаў лекцыі ў якасці прыват-дацэнта ў Маскоўскім універсітэце, пазней працаваў прафесарам Кіеўскага ўніверсітэта.

У 1888 г. у Кіеве выйшла кніга «Беларускас вяселле і вясельныя песні». Грунтоўпа даследаваў М. Доўпар-Запольскі розныя праблемы абраду і асобныя этапы вяселля ў наступных працах: «Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках». «Сватаўство і дружына жаніха ў беларускім вяселлі». «Рыгуальныя значэнні каравайнага абраду ў беларусаў» і інш.

М. Доўнар-Запольскі актыўна збіраў фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Напрыклад. у 1890 і 1892 гг. ён ажыццявіў паездкі ў Пінскі, Мазырскі, Рэчыцкі, Бабруйскі, Чэрвеньскі, Мінскі паветы і сабраў шмат песень, запісаў абрады сялян і іншыя звесгкі аб побыце, матэрыяльнай і духоўнай культуры. У 1895 г. ён апублікаваў «Песні пінчукоў» (Кіеў) з падзагалоўкамі: «Беларускае Палессе. Зборнік этнаграфічных матэрыялаў, сабраных М. Доўнар-Запольскім. Вып. I ».

У прадмове ён ахарактарызаваў асаблівасці гаворкі пінчукоў, іх стаўленне да песень і спеваў, растлумачыў прынцыпы публікацыі, прычыны, ча.му змясціў апісанне толькі вяселля і інш. Матэрыялы зборніка размеркаваны па дзвюх частках: А. Песні абрадавыя і Б. Лірычныя песні. У дадатку змешчаны: «Вяселле ў Пінскім павеце». «Песні. запісаныя ў сяле Чырвонай Волі Лахвінскай валасці Мазырскага п.». «Песні з Лашанскай вол. Гродзенскай губ.». У каментарыях адзначаюцца варыянты твораў, хто і дзе іх апублікаваў, у многіх выпадках прыводзяцца і адрозненні.

Зборнік каштоўны перш за ўсё дакладнасцю запісаў (песні Доўнар-Запольскі запісаў з голасу), вялікай колькасцю твораў (561 песня ў асноўных частках і 40 змешчаны ў дадатку), іх кваліфікаванай характарыстыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яго праца «Беларускае вяселле ў культурна-рэлігійных перажытках» (1893) прысвечана традыцыйнай для эвалюцыянізму праблеме эвалюцыі шлюбна-сямейных адносінаў. У ёй аўтар асэнсоўвае фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы па беларускім вяселлі, сабраныя ім падчас экспедыцыі ў 1890-1891 гг. у Ігуменскі. Бабруйскі, Рэчыцкі. Мазырскі і Пінскі паветы. «Увесь абрад. - піша аўтар пра беларускае вяселле, - адбываецца ў абставінах. якія маюць характар рэлігійных перажыткаў».

У многіх этапах вясельнага абраду (сватанні, запоінах, заручынах. пасадзе, каравайным абрадзе) М.В. Доўнар-Запольскі бачыць праяўленне «мінулага значэння». Напрыклад, у пасадзе вылучаецца культ хатняга ачага і культ продкаў, да праяўленняў якога адносіцца «абход вакол стала, які замяніў сабой старажытны ахвярнік, і пакланенне куту, куды перанесена месцазнаходжанне духаў продкаў; ужываемая пры падпалызанні валасоў грамнічная свечка, што захоўваецца ўвесь год за абразамі. - запалены агонь на ахвярніку». Да «культурна-рэлігійных перажыткаў», увасобленых у пасадзе, М.В. Доўнар-Запольскі адносіць таксама звычай падразання валасоў нявесты, пакрывання галавы маладой на пасадзе, выкарыстанне сімвалаў пладароддзя: хлебнай дзяжы і авечай скуры ды інш. Аўтар рэканструюе стадыяльнасць працэсаў фарміравання таго ці іншага этапа вясельнай абраднасці.

У 1924 г. М.В. Доўнар-Запольскі абіраецца правадзейным сябрам Інстытута беларускай культуры. У 1925 г. даследчык пераязджае ў Мінск, дзе пачынае працу ў Інстытупе беларускай культуры, а таксама ў БДУ Адным з першых крокаў навукова-арганізацыйнай дзейнасці вучонага на радзіме стала ініцыятыва стварэння Археаграфічнай камісіі пры Гісторыка-археалагічнай секцыі Інбелкульта, якую ён сам і ўзначаліў.

У немагчымасці трымаць вучонага пад кантролем улады канчаткова пераканаліся пасля несанкцыянаванай сустрэчы навукоўца з адным з беларускіх паслоў у польскім сейме. «Справа Доўнар-Запольскага» зноў была разгледжана на закрытым пасяджэнні ЦК Кампартыі Беларусі, якое

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастанавіла неабходным «арганізаваць ад'езд М.В. Доўнар-Запольскага з БССР». Восенню 1926 г. вучоны пакідае Мінск.

Апошні перыяд свайго жыцця М.В. Доўнар-Запольскі пражыў у Маскве, па-ранейшаму працягваючы вельмі актыўнае жыццё. У Маскве М. Доўнар-Запольскі не пакідаў спроб падтрымліваць навуковыя кантакты з Беларуссю, якія сустракаліся афіцыйным Мінскам катэгарычна адмоўна. З канца 20-х гадоў, з пачаткам сталінскага «вялікага пералому» ў краіне, стаўленне да старой інтэлігенцыі становіцца ўсё больш рэпрэсіўным. Ад'езд з Мінска дазволіў М.В. Доўнар-Запольскаму пазбегнуць лёсу сваіх паплечнікаў і вучняў, асуджаных у 1930 г. па сфальсіфікаванай справе «Саюза вызвалення Беларусі». Аднак на працягу 1930-1934 гг. усе яго працы падпалі пад жорсткую крытыку.

У 1934 г. М.В. Доўнар-Запольскі памёр ад сардэчнага прыступу. Цела яго было крэміравана, прах захаваны ў калумбарыі Данскіх могілак у Маскве.

Сёння імя гэтага выдатнага дзеяча належыць пляядзе славутых сыноў Беларусі. Даследчыкаў, якія запачаткавалі навуковае вывучэнне яе гісторыі і куьтуры.

**Тэма 19. Фальклорна-этнаграфічныя працы а.к. сержпутоўскага**

Пытанні па тэме

1. Біяграфічныя звесткі пра А.К. Сержпутоўскага.
2. Унёсак А.К. Сержпутоўскага ў вывучэнне Палесся.

Літаратура па тэме

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-хгадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка. 1989. - С. 295 308.

Касько, У.К. Сцяжынкамі казкі / Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў. Мінск:Універсітэцкае, 1999. С. 5-22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданпі беларусаў Слуцкага павета. Мінск:Універсітэцкае, 2000. 270 с.

Аляксандр Казіміравіч Сержпутоўскі (1864-1940) - выдатны беларускі этнограф, фальклярыст, мовазнаўца і публіцыст. Шлях А. Сержпутоўскага ў вялікае жыццё і навуку быў тыповым для беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі канца XIX - пачатку XX ст. Ён пачаўся ў сям' і малазямельнага беларускага селяніна са Слуцкага павета Мінскай губерні. Праз народнае вучылішча і Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю гэты шлях вёў Сержпутоўскага. як і многіх здольных юнакоў таго часу. на пасаду настаўніка народнага вучылішча. У школах Мазырскага і Слуцкага паветаў Мінскай губерні Сержпутоўскі адпрацаваў дзевяць гадоў, непасрэдна назіраючы жыццё люду беларускага Палесся.

У 1896 г. ён пераязджае ў сталіцу і пачынае вучыцца адначасова ў Пецярбургскім археалагічным інстытуце і на Вышэйшых юрыдычных курсах. 3 1906 г. пасля заканчэння інстытута ўсё яго жыццё звязана з этнаграфічным аддзелам Рускага музея, у фарміраванне фондаў якога А. Сержпутоўскі ўклаў дзесяцігоддзі працы.

Неўзабаве пасля пачатку вучобы выходзіць першы нарыс - «Белорусы-палешукі» (1908). у якім будучы этнограф спрабуе свае сілы ў апісанні архітэктуры, побыту. звычаяў і вераванняў сялян Мазыршчыны і Случчыны. У 1907 -1909 гг. на старонках часопіса «Живая старнна» друкуюцца нарысы Сержпутоўскага «Сябрына». «Толока». «Бонда», «Добыванне огня». «Колтун». «Ловля вьюнов» і іншыя. Узорам змястоўнага стылю даследчыка служыць адзін з першых нарысаў гэтай серыі - «0 завитках в Белоруссии» (1907), у якім апісваецца распаўсюджаная на Случчыне магічная практыка прычынення шкоды праз жыта. Ён чытаецца з вялікай цікавасцю, даючы магчымасць зазірнуць ў таямнічы свет народнага чарадзейства. Аўтар узгадвае аднаго з носьбітаў гэтай традыцыі - селяніна в. Чудзін Івана Санюка па мянушцы Порца. які валодаў, як казалі людзі. вялікай сілай адрабляць заломкі ці завіткі. Увага да асобы свайго інфарматара, бачанне ў ім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

індывідуальнасці зробіцца адзнакай аўтарскага збіральніцкага стылю Сержпутоўскага. Пазней ён апіша многіх таленавітых апавядальнікаў з народа, сваіх інфарматараў, за якімі ў фалькларыстыцы замацуецца назва «казачнікі Сержпутоўскага». Гэта - дзяды Рэдкі. Сасноўскі, Болбат, Савіцкі. дзядзькі Даніла Кулеш, Лявон Лябедзік, Азёмша, апавядалі Сержпутоўскаму і жанчыны - старая Бохмачыха і шляхцянка Умінская ды інш.

Найкашгоўнейшая частка спадчыны даследчыка - публікацыі беларускай народнай прозы: «Сказки и рассказы белорусов-палешуков» (1911). «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павету» (1926). Зборнік «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930) змяшчае надзвычай каштоўныя ў навуковым сэнсе апісанні вераванняў, самабытных звычаяў і абрадавых практык жыхароў гэтага ўнікальнага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна. Не цалкам захавалася парэміяграфічныя працы даследчыка, напісаныя па матэрыялах са Случчыны і Мазыршчыны (1908 і 1912 гг).

Зборнік 1911 г. стаў наватарскай з'явай у тагачаснай фалькларыстыцы. Вострая сатырычная скіраванасць сюжэтаў, выразнае сацыяльнае гучанне казак Сержпутоўскага разбуралі стрэрэатып пра фальклор беларусаў як выключна архаічны, не здольны да эвалюцыі. «Першае і самае галоўнае. - піша У. Касько, што адрознівала калекцыю казак Сержпутоўскага ад папярэдніх публікацый, - гэта новы падыход да збірання і вывучэння казачнай прозы беларусаў. Аляксандр Казіміравіч першым звярнуў увагу на новыя з'явы ў фальклоры. якія ўзніклі ў сувязі са зменамі ў жыцці беларускай вёскі канца XIX - пачатку XX ст. Аб гэтым сведчыць тое значнае месца, якое займаюць у зборніку вострыя па сваёй палітычнай і сатырычнай накіраванасці творы». Збіральніцкая канцэпцыя Сержпутоўскага была прагрэсіўнай. бо грунтавалася на дэмакратычных сацыяльных перакананнях укладальніка.

Як ужо адзначалася. цэлы перыяд жыцця вучонага з 1906 па 1930 гг. звязаны з этнаграфічным аддзелам Рускага музея ў Санкт-Пецярбургу. Менавіта тады разгортваецца яго вялікая экспедыцыйная дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З экспедыцый 1906-1910 гг. па Мінскай, Гродзенскай і Валынскай губернях Сержнутоўскі прывозіў адзенне, узоры народнага тэкстылю, земляробчыя прылады, музычныя, бандарныя інструменты, сродкі палявання і значную колькасць фотаздымкаў, на якіх - аблічча беларускіх сялян, сцэны сялянскага быту, пабудовы і прамысловыя заняткі жыхароў Палесся.

У рукапіснай працы «Полешуки-белорусы. Этнографпческпй очерк» абагулены вынік экспедыцый 1906-1910 гг у Мазырскі павет Мінскай губерні (сёння - Лунінецкі р-н Брэсцкай вобл). Некалькімі гадамі пазней гэты рэгіён быў даследаваны таксама І. Сербавым. Матэрыялы Сержпутоўскага і Сербава (тыпы сядзібнай забудовы, планіроўка. інтэр'ер сялянскага жытла) далі каштоўную фактычную аснову для сучасных этнографаў. Здзейсненая па тых жа месцах праз сто гадоў экспедыцыя супрацоўнікаў акадэмічнага інстытута. дазволіла прасачыць шляхі эвалюцыі архітэктуры сялянскага жытла ў вёсках Заходняга Палесся.

Сёння асоба і навуковая спадчына Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага асэнсаваны ў навуцы і засвоены ў культурнай практыцы. Самы значны ўнёсак ў даследаванне біяграфіі. навуковай і грамадскай дзейнасці. а таксама лёсу навуковай спадчыны нашага славутага збіральніка належыць У. Касько. Сучасным навукоўцам застаецца для вывучэння шмат прац Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага.

Вядомы, як спецыяліст па традыцыйнай культуры і фальклору беларускага Палесся, Сержпутоўскі вывучаў таксама бытавыя асаблівасці палякаў, украінцаў, рускіх. татараў, народаў Каўказа.

**ТЭМА 20. Дзейнасць Я.А. Ляцкага**

Пытанні па тэме

1. Асноўныя біяграфічныя звесткі.
2. Нарыс А.Я. Ляцкага «Альхавецкія пісьмы. Барысаўскі павет»: змест, навуковае значэнне.

Літаратура па тэме

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская фальклярыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У.А. Васілевіч і інш. Пад рэд А.С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка. 1989. - С. 220.....232.

У канцы 19 ст. беларуская фальклярыстыка ўступае ў якасна новы перыяд свайго развіцця - перыяд сапраўды навуковага даследавання ўсіх жанраў вуснай народнай творчасці і быту беларусаў. Гэтаму спрыялі працы групы маладых вучоных М. Янчука. М. Доўнар-Запольскага, А. Сержпутоўскага, Я. Ляцкага, выхадцаў з карэннага насельніцтва Беларусі, што моцна захапіліся родным краязнаўствам. Яны закончылі Пецярбургокі або Маскоўскі ўніверсітэты, атрымаўшы там грунтоўны курс навучання ў буйнейшых тагачасных філолагаў Пыпіна, Вянгерава, Ламанскага, Шахматава, вядомых сваімі прагрэсіўна-дэмакратычнымі поглядамі. Гарачым прыхільнікам беларусазнаўства заявіў сябе Я. А. Ляцкі.

Яўгеній Аляксандравіч Ляцкі (1868-1942) нарадзіўся ў Мінску ў дваранскай сям'і, зямельныя ўладанні якой знаходзіліся ў Барысаўскім павеце. Пасля заканчэння Мінскай гімназіі паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага ўніверсітэта, які скончыў у 1893. Самастойную дзейнасць ён распачаў захавальнікам этнаграфічнага аддела ў Рускім музеі, адначасова супрацоўнічаючы ў шэрагу навуковых і літаратурных часопісаў.

У 1922 г., карыстаючыся зручным момантам, выехаў за мяжу, у Чэхаславакію, дзе атрымаў званне прафесара і заняў кафедру гісторыі рускай мовы і літаратхры на філасофскім факультэтс Карлава ўніверсітэта ў Празе. У адрозненне ад іншых эмігрантаў Ляцкі цалкам прысвяціў сябе выкладанню, навуцы, культурна-асветніцкай справе. Адначасова за мяжой ён арганізоўвае выдавецтвы «Паўночныя агні» (Стакгольм) і «Полымя» (Прага).

Моцным захапленнем, чым філалогія. стала для Ляцкага ва ўніверсітэце народная творчасць, цікавасць да якой актывізаваў выкладчык рускай вуснай славеснасці і літаратуры прафесар У. Мілер, буйны тагачасны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міфолаг. Для пераважнай большасці студэнцкай моладзі, што паходзіла з дваранска-буржуазнага асяроддзя і гадавалася сярод гарадскіх муроў, збор і вывучэнне фальклору падаграваліся экзатычным уяўленнем аб духоўным і матэрыяльным жыцці сельскага жыхара.

Для Ляцкага ж народная паэзія не была нечым невядомым, незведанным. Яна ўвайшла ў яго свядомасць глыбока і моцна з самага маленства, якое цесна было звязана з сельскай мясцовасцю. У аўтабіяграфічных успамінах Ляцкі піша: «Дзяцінства маё прайшло ў сціплым маёнтку Барысаўскага павета Мінскай губерні сярод лясоў, што раскінуліся тады на велізарным абшары...Ад нашага маёнтка ішлі палявыя і лясныя дарогі ў некалькі вёсак і пасёлкаў, дзе жылі пераважна сяляне беларусы, што некалі належалі маім продкам. Уражанне ляснога шуму назаўсёды лучылася ў мяне з уражаннем беларускіх песень маёй нянькі, якіх яна ведала незлічаную колькасць... Я пачаў патроху ўслухоўвацца ў іх, а потым і запамінаць».

Захапленне Ляцкага беларускім фальклорам з гадамі настолькі ўзмацнілася, што падчас вучобы ў Мінскай гімназіі гэту страсць юнака не маглі не прыкмеціць настаўнікі. І хлапечае аматарства абярнулася сур'ёзнай справай. У выніку сустрэчы і знаёмства з Паўлам Шэйнам Ляцкі атрымаў першыя метадычныя навыкі па збіранню вуснай народнай творчасці. Шэйн жа праявіў вялікую цікавасць да асобы мінскага гімназіста як да магчымага свайго новага карэспандэнта на месцы. Ён адразу ж дае яму шэраг канкрэтных заданняў з тым, каб атрымаць неабходныя звесткі для папаўнення сваіх чарговых фальклорных тамоў.

У выніку кантактаў з разнастайным асяродзем і рэгіёнамі фальклорная калекцыя Ляцкага багата папоўнілася амаль усімі жанрамі вуснай паэзіі. Кожная экспедыцыя ўзбагачала ўяўленні збіральніка аб духоўнай культуры беларускага народа, аб асаблівасцях асобых фальклорных жанраў, рабілася здабыткам беларускай фалькларыстыкі другой паловы XIX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Агульным уражаннем аб экспедыцыі па зборы міфалагічных матэрыялаў на Барысаўшчыпе Ляцкі прысвяціў асобы нарыс «Альхавецкія пісьмы. Барысаўскі павет». надрукаваны крыху раней у той жа газеце «Минскнй листок» (1892, №47). Малады фальклярыст расказаў аб абставінах, у якіх яму давялося працаваць, аб вясковым побыце, зрабіў назіранні над рэпертуарам вескі і лёсам асобых жанраў вуснай народнай творчасці. Апрача міфалогіі Ляцкага ў беларускім фальклоры вабіла народная песня. На прапягу 1890-1891 гг. ён абследуе шэраг вёсак Барысаўскага павета, што знаходзіліся побач з бацькоўскім маёнткам Гайна. Тут ад мясцовых сялян яму ўдалося запісаць некалькі соцень абрадавых і пазаабрадавых песень, прыказак і прымавак. Аднак так здарылася, што голькі невялікую часгку з гэгых матэрыялаў Ляцкі надрукаваў праз чатырнаццаць гадоў. Астатнія матэрыялы знаходзяцца ў архівах РФ.

У невялічкім уступе збіральнік прызнаецца, што фальклорныя запісы ен рабіў галоўным чынам у дыялекталагічных мэта.х, таму невыпадкова імкнуўся дакладна перадаць асаблівасці мясцовай гаворкі. Усе песні Ляцкі размеркаваў па васьмі жанрава-тэматычных групах: 1) калыханкі. 2) хрэсьбінныя. 3) жніўныя, 4) жартоўныя і гульнёвыя, 5) любоўныя. 6) сіроцкія. 7) вясельныя і бяседныя у той паслядоўнасці, паводле яго прызнання, як запісваліся. Пашпартызацыя тэкстаў адсутнічае, што зніжае навуковае значэнне публікацыі. Пасля Я.Ф. Карскага сярод дарэвалюцыйных фальклярыстаў мы не ведаем больш дакладных у моўных адносінах запісаў вуснай народнай творчасці, у якіх так строга і паслядоўна былі захаваны асаблівасці беларускай мовы: аканне, яканне, дзеканне, цеканне, цвёрдасць шыпячых і р.

Сярод многіх фалькларыстычных пытанняў Ляцкага хвалявала праблема суадносін індывідуальнага і калектыўнага пачаткаў у народнай творчасці. Апрача тэарэтычных меркаванняў па агульных праблемах фалькларыстыкі Ляцкі, грунтуючыся на ўласным вопыце экспедыцый, сфармуляваў некаторыя новыя патрабаванні ў методыцы запісу твораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

фальклору. Гэтыя патрабаванні накіроўваліся на ўдасканаленне фіксацыі аўтэнтычнасці народных твораў, асабліва мелодыі песні.

**Тэма 21. А.Я. Багдановіч як міфолаг**

Пытанні па тэме

1. Навукова-публіцыстычная дзейнаспь Л.Я. Багдановіча. Супрацоўніцтва з П. Шэйнам.

2. Трактоўкі міфалагічнай свядомасці ў працы А.Я. Багдановіч «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў»

Літаратура па тэме Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60 х гадах XIX.....пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка, У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. Мн.: Навука і тэхніка. 1989. С. 282 287.

Богдановыч Адам (Адольф) Егоровнч // Биографнческнй справочннк Мн.:«Белорусская советская энциклопедпя» именн Петруся Бровкн. 1982. - Т. 5. 737 с. С.63.

Адам Ягоравіч Багдановіч (20 сакавіка 1862 г.. м. Халопенічы Мінскай губерні -16 красавіка 1940, Яраслаўль) этнограф і фальклpaрыст, мемуарыст і мовазнавец.

Даследчыкам фальклору Адам Багдановіч вядомы як аўтар дзвюх невялікіх нарадазнаўчых даследаванняў «Пра паншчыпу» (Гродна. 1894) і «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў» (Гродна 1895), а таксама пасмяротна выдадзеных яго мемуараў. А між тым гэта толькі невялікая частка з напісанага Адамам Багдановічам за пяцьдзесят гадоў навуковай і творчай дзейнасці. Дзесяткі яго артыкулаў, прысвечаных актуальным пытанням культурнага і грамадскага жыцця, раскіданы па розных перыядычных выданнях.

Асэнсавана і мэтанакіравана цікавіцца беларускай народнай культурай Багдановіч начаў у 1880 г., будучы навучэнцам Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, калі сюды з Віленскай навучальнай акругі быў дасланы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыяльны цыркуляр, які абавязваў настаўнікаў, каб яны ў час летніх вакацый займаліся «зборам тапаграфічных і геаграфічных звестак, вывучалі быт сялянства, запісвалі мясцовыя песні, казкі, абрады і звычаі і адсылалі б усё гэта дырэкцыі народных вучылішч або непасрэдна ў РГТ.

Працуючы сельскім настаўнікам у Ігуменскім павеце, Багдановіч пачаў актыўна дасыладь П.В. Шэйну шматлікія тэксты самых розных фальклорных жанраў. Нягледзячы на ўсю складанасць узаемаадносін. супрацоўніцтва Шэйна з Багдановічам усё ж прынесла багаты плён. Аглядаючы свае публікацыі ў шэйнаўскіх «Матэрыялах...», Адам Ягоравіч з поўнай падставай мог сказаць складалыніку: «Мне здаецца, што доля майго ўдзелу ў Вашым зборніку была настолькі значнай, што наўрад ці хто іншы даў Вам больш за мяне». Долю багдановічаўскага збіральніцкага ўдзелу лёгка падлічыць: яна складае 13 друкаваных аркушаў - цэлая кніга. Уклад Багдановіча ў беларускі фальклорна-этнаграфічны збор П. Шэйна па аб'ёме не меў сабе роўных сярод іншых збіральнікаў.

Першая фальклорная публікацыя Багдановіча з'явілася ў першым томе «Матэрыялаў...» П. Шэйна і была прадстаўлена даволі сціпла дзвюма шырока вядомымі ў народзе танцавальнымі песнямі «Падушачка». «Лявоніха» і 19 прыпеўкамі.

Удумлівым і сур'ёзным фалькларыстам заявіў сябе Багдановіч у другой частцы першага тома «Матэрыялаў...». дзе было надрукавана яго апісанне вясельнага абраду, што бытаваў у м. Халопенічы Мінскай губерні. Апісанняў беларускага вясельнага абраду ў друку да Багдановіча з'яўлялася нямала, але яго праца ў этнаграфічнай літаратуры была новым словам у многіх адносінах. бо аўтар глянуў на народнае вяселле вачамі не толькі фалькларыста, але і сацыёлага.

П.В. Шэйн ахвотна друкаваў Багдановіча. У другім томе сваіх «Матэрыялаў...» ён змяшчае яго цікавую калекцыю казак, легенд і небывальшчын (каля 20 нумароў), а таксама іншыя фальклорныя жанры і этнаграфічныя апісанні. Большасць казак і легенд міфалагічнага,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фантастычнага або царкоўна-рэлігійнага зместу. У аснове многіх з іх ляжыць прытча, у якую ўкладзены выразна дыдактычны сэнс. Навуковае значэнне публікацыі казачнай прозы Багдановіча ў тым. што яна значна пашырыла ўяўленне наогул аб усім жанры беларускай казкі.

Упершыпю ў гісторыі беларускай фалькларыстыкі Багдановіч паспрабаваў высветліць праблему вытокаў духоўных вершаў. І хоць у 1890-я гг. нарадаволец Адам Багдановіч адышоў ад рэвалюцыйнай і палітычнай дзейнасці, праблема сацыяльнага ўціску і бяспраўнага становішча беларускага сялянства яго не пераставала хваляваць. У 1894 г. у газеце «Гродненскне губернскне ведомостн» ён друкуе цыкл артыкулаў пад назвай «Пра паншчыну», прысвечаны прыгонніцтву ў Беларусі, якія пасля выдаў асобнай кнігай. Гэта фальклорна-этпаграфічны нарыс, напісаны ў форме мемуараў, у якіх рамізнік Кузьма Скалубовіч, былы прыгонны селялін, расказвае пра перажытае народам у часы нядаўпяй мінуўшчыны. Вуснамі селяніна Багдановіч уваскрашае жахлівую карціну прыгонніцтва ў Беларусі.

Ідэя навукова асэнсаваць беларускую міфалогію ў Багдановіча зарадзілася яшчэ папачатку збіральніцкай дзейнасці і была ўвасоблена ў працы «Перажыткі старажытных вераванняў у беларусаў» на старонках часопіса «Научное обозренне» (1894). Дапрацаваны і значна дапоўнены. гэты нарыс у наступным годзе выйшаў асобным выданнем пад зменeнай крыху назвай «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў». Гэту фальклорна-этнаграфічную працу болып правільна будзе разглядаць як манаграфічнае даследавапне. У ім Багдановіч выступае як даследчык, які глыбока задумваецца не толькі пад сацыялыгым становішчам беларускага народа, але і над прычынамі, што парадзілі архаічнасць светапогляду насельніцтва, якая выявілася ў пашыранасці прымхаў і забабонаў.

Перажыткі старажытнага светасузірання Адам Ягоравіч даследуе як сістэму поглядаў народа на акаляючы свет, грамадства і жыццё і вылучае ў ёй дамінуючыя элементы – фетышызм, анімізм, культ сонца, уяўленні пра нячыстую сілу, чараўніцтва і інш. Фетышызм Багдановіч разглядае з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матэрыялістычных пазіцый, называючы яго адной з ранніх форм рэлігійных уяўленняў. Манаграфія А. Багдановіча у гісторыі беларускай фалькларыстыкі другой палавіны XIX ст. заняла сваё месца - як першае спецыялыіае даследаванне светапогляду беларускага сялянства.

**Тэма 22. «Беларусы» (1903-1922) Я. Ф. Карскага**

Пытанні на тэме

1. Біяграфія Я.Ф. Карскага.

2. Я.Ф. Карскі як заснавальнік беларускага мовазнаўства. Праца «Беларусы».

3. Аналіз беларускага фальклору ў вып. 1 Т. 3 «Нарысы славеснасці беларускага племені».

Літаратура па тэме

Карскі, Я.Ф. Беларусы / Яўхім Карскі. Мн.: Бел. кнігазбор. 2001. 637 с.

Бандарчык, В.К. Я.Ф. Карскі / В.К. Бандарчык // Ін-т мастацтвазнаўства. этнаграфііі фальклору / Беларусы. У 12 т. - Т. 3.: Гісторыя этналагічнага вывучэння. С. 234 - 243.

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчаспі ў 60-х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка, 1989. - С. 256-282.

Яўхім Фёдаравіч Карскі (20 снежня 1860 г.. в. Лаша. Гродзенскі павет (цяпер -Гродзенскі раён) - 1931 г.. Ленінград. СССР) - філолаг-славіст. заснавальнік беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, фалькларыст, этнограф і палеограф .

Паходзіў з праваслаўнай шматдзетнай сям'і, бацька быў настаўнікам. Вучыўся ў Ятранскім і Бярозаўскім народных вучылішчах Навагрудскага павета, потым у Мінскай духоўнай семінарыі. У 1881 - 1885 ён вучыўся ў

Нежынскім гісторыка-філалагічным інстытуце, у якім рыхтавалі настаўнікаў для гімназій. У 1885-1893 гг. выкладаў рускую, стараславянскую мовы ў Віленскай мужчынскай гімназіі. У гэты час закончыў сваю першую кнігу, прысвечаную гукавому ладу і марфалогіі беларускай мовы «Обзор звуков н форм белорусской речи». Жыццёвы шлях даследчыка багаты на падзеі. 3 1893 г. выкладаў рускую мову ў Варшаўскім універсітэце, пазней славянскую палеаграфію, рускую дыялекталогію, граматыку царкоўнаславянскай мовы. У 1894 г. абраны на пасаду экстраардынарнага прафесара Варшаўскага ўніверсітэта і загадчыка кафедры рускай і царкоўнаславянскай мовы і гісторыі рускай літаратуры.. 3 1902 г. дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта, у 1905- 10 гг. рэктар Варшаўскага ўніверсітэта, двойчы пераабраны на пасаду (1905, 1908).

3 1917 г. Я.Ф. Карскі ў Мінску, удзельнік беларускага нацыянальнага руху, дэлегат і ганаровы старшыня Першага ўсебеларускага з'езду. Прызначаны настаўнікам на Мінскія беларускія настаўніцкія курсы (1918). якія ўзначальваліся Я. Лёсікам і потым былі ператвораны ў Мінскі беларускі педагагічны інстытут. дзе Я. Карскі стаў прафесарам. Я. Карскі займаў пасаду старшыні арганізацыйнай камісіі па адкрыцці ў Мінску Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, удзельнічаў у распрацоўцы статута Інбелкульта.

Летам 1921 г. назаўсёды пераехаў у Петраград.

Я.Ф. Карскі з'яўляецца першым, хто сістэматычна даследаваў усе асноўныя жанры і віды беларускага фальклору. Яго праца «Беларусы» (т. 1-3, 1903 1922. у 7 вып.; перавыд. вып. 1-3. М.. 1955-56) - буйны ўклад у літаратуразнаўства, лінгвістыку і фалькларыстыку. Паводле ацэнак спецыялістаў, гэта вышэйшае дасягненне еўрапейскай славістыкі канца XIX - пач. XX ст., фактычна энцыклапедыя беларусазнаўства.

У т. I «Уводзіны да вывучэння мовы і народнай славеснасці» (Варшава, 1903. Вільня, 1904) даследаваў паходжанне беларускага народа. Прарадзімай славян Я. Карскі лічыў Палессе (басейн Прыпяці, верхняга Нёмана і ніжняй Бярэзіны), вызначыў час фарміравання беларускай народнасці (XII-XV ст.),

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцвярджаў, што ў аснову беларускай народнасці ляглі плямёны дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў, прыйшоў да вываду, што беларусы былі аўтахтонамі на сваіх землях. Акрэсліў этнічныя межы беларускага народа, даў этнаграфічную карту Беларусі пач. XX ст., асвятліў важнейшыя этапы гісторыі беларускай мовы, яе спецыфічныя асаблівасці і ўзаемасувязі з рускай, украінскай, польскай, літоўскай і іншымі мовамі.

Нямала зроблена Я.Ф. Карскім у галіне беларускай гістарыяграфіі. Гэтаму прысвечаны раздзел 7 Т. 1 «Беларусаў», які па сутнасці з'яўляецца нарысам гісторыі беларускай этнаграфіі і фальклярыстыкі. У ім Карскі абагульніў усё тое, што было зроблена ў вывучэнні мовы, фальклору і быту беларусаў рускімі, беларускімі і польскімі вучонымі на працягу XIX ст.

У т. 2 «Мова беларускага племені» (вып. 1-3, 1908-1812) абгрунтаваў вучэнне пра гукавы і граматычны лад старабеларускай і сучаснай беларускай мовы ў яе народна-дыялектнай і літаратурнай формах.

Т. 3 «Нарысы славеснасці беларускага племені» складаецца з 3 выпускаў. У вып. 1 «Народная паэзія» (1916) асветлена гісторыя развіцця беларускага фальклору, ахарактарызаваны асноўныя жанры і віды народнай паэзіі беларусаў: даследаваны кулыурны стан плямён, якія склалі аснову беларускай народнасці, паказаны іх сямейныя і грамадскія ўзаемаадносіны, апісаны жыллё, ежа, заняткі, побыт, светапогляд, рэлігійныя вераванні, мова, міфалогія, выказаны думкі пра ўзнікненне народнай паэзіі і яе асаблівасці ў старажытнасці. У цеснай сувязі з паказам асаблівасцей абрадаў і звычаяў Я.Ф. Карскі зрабіў аналіз разнастайных фальклорных жанраў: замоў, каляндарна-абрадавых (калядных. масленічных. Валачобных, юраўскіх, траецкіх, русальных, купальскіх, жніўных), сямейна-абрадавых (радзінных, хрэсьбінных, дзіцячых, вясельных) песень і хаўтурных галашэнняў. Разгледжаны змест і мастацкія асаблівасці пазаабрадавай песні,прыведзены прыказкі і прымаўкі. Загадкі, казкі. Карскі прасачыў сляды гераічнага эпасу, паказаў сувязь беларускага фальклору з фальклорам рускага і ўкраінскага народаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У вып. 2 «Старая заходнеруская пісьменнасць» (1921) прааналізаваны помнікі старажытнай беларускай літаратуры XIV- XVIII ст. ст., раскрыты культурна-гістарычныя передумовы зараджэння пісьменнасці на старабеларускай мове, даследавана як перакладная, так і арыгінальная літаратура. Вып. 3 «Мастацкая літаратура на народнай мове» (1922) прысвечаны беларускай літаратуры XIX - пач. XX ст., звязанай з беларускім адраджэннем новага перыяду. У сваіх даследаваннях Я. Карскі паспяхова развіваў прынцыпы культурна-гістарычнай школы, зрабіў значны ўклад у многія галіны гістарычных ведаў, у тым ліку ў спецыяльныя гістарычныя навукі - крыніцазнаўства, палеаграфію, археаграфію.

Тэма 23. Пяткевіч (1856-1936) -даследчык традыцыйнай культуры беларускага палесся

Пытанні па тэме

1. Біяграфічныя звесткі пра Ч. Пяткевіча.
2. Матэрыяльная культура беларусаў у працы Ч. Пяткевіча «Рэчыцкае Палессе».
3. Беларускі фальклор у яго працы «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся: этнаграфічныя матэрыяды».

Літаратура па тэме:

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX - пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. - Мн.: Навука і тэхніка. 1989. - С. 309 -316.

У збіранне і вывучэнне беларускага фальклору і этнаграфічных звестак ўнеслі значны ўклад польскія вучоныя О. Кольберг, Ч. Пяткевіч, К. Машынскі. Чэслаў Пяткевіч (1856-1936) - польскі этнограф і фалькларыст, нарадзіўся ў в. Бабчын Хойніцкага р-на Гомельскай вобл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачаў навуковую дзейнасць у сталым узросце, свае этнаграфічныя працы прысвяціў галоўным чынам радзіме Рэчыцкаму Палессю. Яго маштабныя даследаванні - гэта не толькі вынік вывучэння канкрэтнай тэмы, а вынік асабістага спасціжэння самога жыцця. Сустрэча ў 1911 г. Ч. Пяткевіча з настаўнікам Казімірам Машынскім, азнаямленне з інтарэсамі кожнага ў вывучэнні народнай культуры, натхніла іх на актывізацыю даследаванняў быту і вуснай паэтычнай творчасці і ўзаемнае супрацоўніцтва.

У 1928 г. ён апублікаваў кнігу «Рэчыцкае Палессе” , якую прысвяціў матэрыяльнай культуры вывучаемага рэгіёна. З яе выхадам Ч. Пяткевіч адразу ж заваяваў вялікі аўтарытэт сярод спецыялістаў.

Падчас працы ў Аддзеле этналогіі Варшаўскага навуковага таварыства Пяткевічу былі прызначаны пастаянныя стыпендыі з Міністэрстваў веравызнання і народнай асветы, якія матэрыяльна падтрымалі яго і дазволілі цалкам прысвяціць сябе навуцы без лішніх клопатаў пра сродкі для існавання. Ч. Пяткевіч узяў на сябе абавязкі па падрыхгоўцы пасмяротнага 4 тома «Люду беларускага» Міхала Федароўскага. Гэты том ахопліваў матэрыялы малых жанраў – жарты, загадкі, выслоўі.

Адначасова даследчык не спыняў працу над уласнай тэмай. У 1930 - 1933 гг. ён апублікаваў некадькі артыкулаў пра народныя ўяўленні («Душа і смерць у вераваннях беларусаў», «Мёртвыя ў вераваннях беларусаў»), пра характар правядзення некаторых свят на Палессі («Вялікдзень на Беларусі»), пра асаблівасці сялянскага быту. Пераважная большасць гэтых артыкулаў увайшла ў другую манаграфію Ч. Пяткевіча.

Другая кніга - «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся: этнаграфічныя матэрыялы» выйшла ў свет пасля яго смерці ў Варшаве. у 1938 г, у ёй багата прадстаўлены і фальклорныя творы розных жанраў. У серыі артыкулаў ён даследаваў вераванні, каляндарныя святы беларусаў, іх уяўленні аб міфалагічных істотах («Земляробчыя боствы ў вераваннях беларусаў» і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вялікі раздзел у кнізе складаюць народныя вераванні, звязаныя з жывёльным светам, яны ахопліваюць амаль усіх прадстаўнікоў фауны ад насякомых да млекакормячых і ўвасабляюцца ў самыя разнастайныя фальклорныя жанры.

Спрадвечнае язычніцкае светаўспрыманне аказалася надзвычай трывалым, нягледзячы на забароны царквы ў адносінах гэтай сферы. Ч. Пяткевіч здолеў адлюстраваць вельмі цікавыя сюжэты «Народнай Бібліі»: у раздзеле «Хрысціянскія вераванні» прывёў шмат зафіксаваных на Палессі апавядаў пра бога, святых і інш.

Манаграфія Ч. Пяткевіча пераконвае ў тым, што яе аўтар дасканала адчуваў мову носьбітаў традыцыі. У.А. Васілевіч мяркуе, што Чэслаў Пяткевіч пры спрыяльных суб'ектыўных абставінах мог бы стаць у шэраг выдатных прадстаўнікоў новай беларускай літаратуры. На карысць гэтага служаць старонкі яго кнігі, прысвечаныя народнай дэманалогіі: на якіх гучыць жывая, сакавітая сялянская мова, ствараючы непаўторны каларыт.

Вельмі каштоўная для наступных пакаленняў аказалася тая выключная па сваёй паўнаце інфармацыя пра народны быт і культуру Палесся, якая сабрана ў яго манаграфіях і артыкулах.

У.А. Васілевіч, ацэньваючы вялікі ўнёсак Ч. Пяткевіча ў айчынную фалькларыстыку, адзначыў: «Чэслаў Пяткевіч з энцыклапедычнай шырынёй расказаў свету пра Беларускае Палессе на пэўным гістарычным этапе». Па яго словах, вынікам яго работы стала «сапраўднае адкрыццё Палескага краю».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 24. К. Машынскі - унёсак у славяназнаўства**

Пытанні па тэме

1. Значэнне навуковай дзейнасці Казіміра Машынскага. Праца з беларускімі карэспандэнтамі

2. Фундаментальная праца К. Машынскага «Усходняе Палессс».

Літаратура па тэме

Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60- х гадах XIX пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская. І. К. Цішчанка. У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. Мн.: Навука і тэхніка. 1989. - С. 316.....322.

Машынскі, К. Усходняе Палессе / Казімір Машынскі; уклад.. прадм.. камент. У.Васілевіча; пер. Л. Салавей. - Мінск: Беларуская навука. 2014......528 с. («Беларускі кнігазбор»: Серыя II. Гісторыка-літаратурныя помнікі).

Палессе : фотаздымкі з дваццатых і трыццатых гадоў / склад. Г. Рушчык. Г. Энгелькінг. Ін-т Мастацтва Польскай акад. навук; Кафедра беларус. культуры ўн-та ў Беластоку. Варшава : Argraf.

1999. 254 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковая дзейуасць выдатнага польскага і беларускага этнографа, фалькларыста, мовазнаўцы Казіміра Машынскага (1887-1959) з'яўляецца прыкметнай з'явай не толькі ў славянскай фалькларыстыцы, але нават у кантэксце ўсяго сусветнага нарадазнаўства. Аўтарытэт яго быў шырока прызнаны ў розных краінах свету: Казімір Машынскі - акадэмік Польскай АН (1938). прафесар Ягелонскага і Віленскага ўніверсітэтаў? Прэзідэнт Польската народазнаўчага таварыства.

У гісторыю фалькларыстыкі ўвайшлі яго артыкулы «Нататкі пра славянскую тапаграфічную і фізіяграфічную тэрміналогію, заснаваныя пераважна на беларуска-палескім матэрыяле» (1921). «Пра народную культуру паўднёва-сярэдняга Палесся». «Выпальванне цаліны», «Навагрудчына ў этнаграфічных адносінах» (1925). Матэрыялы экспедыцыі абагульніў у манаграфіі «Усходняе Палессе. Этнаграфічныя матэрыялы...» (1928), дзе адлюстраваныя прырода краю, побыт, заняткі жыхароў, іх духоўная і грамадская культура (абрады. вераванні, звычаі, вуснапаэтычная творчасць). У 3-х кнігах капітальнай працы «Народная культура славян»(1929 -1939) спрабаваў абагульніць звесткі амаль з усяго славянскага

рэгіёну, разглядаў беларускую культуру, фальклор у кантэксце усёй агульнаславянскай культуры.

Манументальныя працы К. Машьшскага па ахопу матэрыялу не маюць сабе роўных. Дзесяткі, сотні народаў этнічных груп траплялі ў кола зацікаўленняў вучонага, рабілася прадметам яго даследаванняў. І сярод іх, - што асабліва прыцягвае сёння нашу ўвагу да постаці К. Машынскага, - было вывучэнне быту і культуры беларускага народу, у прыватнасці палескага насельпіцтва. Захопленасць Беларуссю выявілася яшчэ ў самым пачатку навуковага шляху Машынскага, задоўга да яго сусветнай славы. Экспедыцыя на беларускае Палессе не стала прахадным эпізодам, у далейшай дзейнасці вучонага амаль пастаянна чуваць было яе водгалас.

У 1912 г. падчас знаходжання ў Белацаркоўскім павеце, непадалёку ад Кіева, Казімір Машынскі пазнаёміўся з Чэславам Пяткевічам, нарадзіўся на Палессі і пражыў тут каля сарака год, таму з дзяцінства ён меў добры кантакт з народам. Ён ахвотна пераказаў перспектыўнаму пачаткоўцу вядомыя звесткі і нават па яго просьбе напісаў каля 2 аркушаў этнаграфічных нататкаў. Пад уплывам старэйшага таварыша малады настаўнік усур'ёз загараецца ідэяй блізка спазнаць малавядомы край. Перагаворы з Польскім краязпаўчым таварыствам закончыліся паспяхова. Ідэя К. Машынскага адносна доўгатэрміновай этнаграфічнай экспедыцыі ў найболш глухія куткі была сустрэта прыхілна, і неўзабавс энтузіяст атрымаў неабходныя сродкі з касы Мяноўскага ў Варшаве і ўжо ў чэрвені 1914 г. выправіўся ў дарогу.

Экспедыцыя пачынатася вельмі ўдала. Вёска Дарашэвічы, што раскінулася па-над Прыпяццю, як нельга лепш спраўджвала спадзяванні. Пешшу і конна наведваўся Машынскі ў суседнія вёскі, у Дзякавічы ля Князь-возера, меў намер пасля вывучэння гэтай мясцовасці плысці на пагранічча Мазырскага і Бабруйската паветаў.

Але нечакана ўсе задумы былі спынены палітычнымі падзеямі - пачалася Першая сусветная вайна. На другі дзень пасля яе абвяшчэння да Машынскага з’явіліся жандары і, рэвізаваўшы ўсе яго рэчы, загадалі пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пагрозай арышту пакінуць наваколле. Давялося вярнуцца ў Варшаву са стосам незапоўненых блакнотаў, з некранутымі ў большасці фатаграфічнымі клішэ. Стацыянарнае вывучэнне Машынскім усходняга Палесся было спынена.

Сістэматычная праца К. Машынскага з беларускімі карэспандэнтамі была распачата ў 1924 г. Працуючы ў Варшаўскім навуковым таварыстве, ён на бланках таварыства высылаў невялікія анкеты з заданнямі, пытаннямі. Звычайна анкеты былі машынапісныя, з малюнкамі ці ад рукі, ці пад капірку. У архіве Ягелонскага ўніверсітэта захоўваюцца цікавыя матэрыялы, якія былі прысланы аматарамі, у тым ліку і з Беларусі, па закліку Машынскага. Такім інфарматарам, напрыклад. быў К. Шэмбер з вёскі Плавушка Вілейскага павета. Адзначаючы сваю нацыянальную прыналежнасць, ён пазначыў, што мова, якой ён карыстаецца ў паўсядзённым прыватным жыцці беларуская, а па-за межамі дома карыстаецца польскай мовай. Ён даслаў Машынскаму малюнкі і апісанне прылад рыбалоўства, якімі карысталіся на рацэ Віліі. Тры грунтоўныя сшыткі пад агульпай назвай «Культура вёскі Петракі» ў 1936 г. даслаў К. Машынскаму Я. Штурык з Пастаўскага павета. Першы сшытак прысвечаны ежы, хатнім раслінам, паляванню, рыбалоўству, бортніцтву, гадоўлі хатніх жывёл, другі- земляробству, трэці -аддзенню, жыллю і будаўніцтву.

Выхаду манаграфіі «Усходняе Палессе» - першай саліднай працы Казіміра Машынскага папярэднічаў цэлы шэраг артыкулаў, напісаных вучоным на беларускім матэрыяле. У іх закраналіся розныя бакі нарадазнаўства, што сведчыла пра высокую эрудыцыю таленавітага даследчыка. Так, напрыклад, у самым першым вопыце даследавання беларусаў Машынскі абраў лінгвістычны аспект, надрукаваўшы працу «Заўвагі пра славянскую тапаграфічную і філасофскую тэрміналогію, заснаваную на беларуска-палескім матэрыяле».

Услед за Дмахоўскай. Пяткевічам і іншымі Машынскі ўнёс значны ўклад у справу фальклорна-этнаграфічнага вывучэння Палесся. І якія б

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

папрокі ў адсутнасці паўнаты ні прад’яўлялі б мы сёння яго кнізе «Усходняе Палессе», нельга не забывацца, што сабраны яны былі ўсяго за паўтара месяца на вельмі абмежаванай тэрыторыі. Нават адкінуўшы тыя дапаможныя звесткі, якія прапанаваў яму Пяткевіч і якія, несумненна. істотна ўзбагацілі манаграфію яго вучня, нельга не ўразіцца той вялікай колькасці высакаякасных магэрыялаў, якія паспеў запісаць сам К. Машынскі.

Перад беларускай фальк.тарыстыкай і этнаграфіяй заслугі Машынскага ў тым. што ён з поўнай адданасцю звярнуўся да непасрэднага вывучэння Палесся, да збору яго неацэнных скарбаў у час, калі планамернае навуковае асваенне гэтага краю яшчэ толькі пачыналася. Песенныя запісы, зроблепыя Машынскім па Усходнім Палессі, сталі адкрыццём народнай культуры цэлага рэгіёна, бо ніхто з яго папярэнікаў не прадэманстраваў настолькі шырока песенны рэпертуар палешукоў. Вартасць запісаў Машынскага ўзмацняецца яшчэ і тым, што многія з іх, не паўтораныя фалькларыстамі наступных дзесяцігоддзяў, назаўсёды зберагаюць сваю унікальнасць.

**Раздзел V. Беларуская фалькларыстыка ў XX-XXI стст.**

**Тэма 25. Фальклорна этнаграфічная праца ў беларусі ў 1920-я гг.**

Пытанні па тэме

1. Інбелкульт - вышэйшая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова Беларусі. Славутыя дзеячы Інбелкульта.

2. Даследчыцкая дзейнасць А.А. Шлюбскага. «Праграма для запісвання помнікаў вуснай народнай творчасці».

3. Дзейнасць І.А. Сербава.

Літаратура па тэме

Інстытут беларускай культуры / АН Беларусі. Ін-т гісторыі; М.ІІ. Касцюк. П.Ц.Петрыкаў. М.У. Токараў і інш; Рэдкал.: М.А. Барысевіч (старш.). М.У. Токараў (адк.сакратар)......Мн.: Навука і тэхніка. 1993. - 255 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Матыліцкая Н.В. Краязнаўчы рух на Случчыне. // Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Слуцкага р-на і г. Слуцка. У 2 кн. Кн. 1-я. – Мн., 2000, с. 212-213

Матыліцкая Н.В. Слуцкае краязнаўчае таварыства // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2 т. Т.2: -- Мн., 2006, с.539-540

У выніку самаадданай працы збіральнікаў і даследчыкаў вуснай народнай творчасці беларусаў у пачатку XX ст. была падрыхтавана грунтоўная навуковая база для глыбокага вывучэння духоўнай культуры народа і закладзены падмурак для развіцця новай нацыянальнай навукі аб фальклоры.

Інбелкульт— вышэйшая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова, першая ў гісторыі Беларусі. Інстытут быў заснаваны 30 студзеня 1922 г. у Мінску на базе Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы БССР, у распрацоўцы устава Інбелкульга прымаў удзел славуты вучоны Я.Ф. Карскі. Інстытут існаваў да 1928, калі быў ператвораны ў Беларускую акадэмію навук. У 1929 годзе ў Інстытуце гісгорыі быў утвораны сектар этнаграфіі і фальклору, які стаў цэнтрам збірання і даследавання вуснай народнай творчасці ў краіне.

Правадзейнымі сябрамі Інстытута беларускай культуры ў розныя гады былі выдатныя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі: Я.Ф. Карскі, І. І. Замоцін, У. М. Ігнатоўскі, В. У. Ластоўскі, Я. Ю. Лёсік, І. Д. Луцэвіч, С.Ю. Матулайціс, К. М. Міцкевіч. С. М. Некрашэвіч. У. І. Пічэта. А. А. Смоліч, А. М. Ясінскі.

Пры Інбелкульце з 1924 г. існавача Цэнтрачьнае бюро краязнаўства (ЦБК). Краязнаўчая дзейнасць пачачася яшчэ з узнікнення ў 1918 г. на Случчыне культурна-асветнага таварыства «Папараць- кветка», на базе якога была створана Слуцкая павятовая камісія беларусазнаўства, рэарганізаваная ў 1923 г. у Слуцкае павятовае таварыства краязнаўства. Краязнаўчыя арганізацыі ствараліся па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Менавіга ў іх дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адной з важнейшых задач было збіранне фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў.

Каб надаць гэтай працы правільны накірунак і атрымліваць якасныя запісы. у першым жа нумары часопіса «Наш край» (выходзіў з кастрычніка 1925 г.) была змешчана «Праграма-інструкцыя для збіральнікаў беларускай музычна-этнаграфічнай творчасці», складзеная А. Грыневічам. Грыневіч арыентаваў запісваць каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя песні, бытавыя песні, дзіцячы фальклор, прыпеўкі, карагодныя танцавальныя песні, духоўныя вершы з дакладнай пашпартызацыяй тэкстаў.

У гэтым жа часопісе ў 1928 г. (№ 4) апублікаваў «Праграму для запісвання помнікаў вуснай народнай творчасці» А.А. Шлюбскі. Ён жа падводзіў вынікі сабраных матэрыялаў і рабіў іх агляд у часопісе «Наш край». Па яго падліках у 1925 / 26 акадэмічным годзе было даслана 8565 запісаў, у наступным годзе 13459 і ў 1927/28 годзе 12776. Найбольшую колькасць складалі прыпсўкі (12145), загадкі (4866), вясельныя песні (4816), бытавыя песні (3943), прыказкі (3847), песні працы (1675), веснавыя песні (772), замовы (711), казкі. апавяданні і легенды (508), каляндарныя песні (483), купальскія (395), хрэсьбінныя (дзіцячыя) песні (376). Менш было запісана масленічных і русальных песень. хаўтурных галашэнняў, духоўных вершаў. Не ўсе творы і іх запісы былі якаснымі. Аднак з падліку колькасці дасланых твораў можна зрабіць вывад аб бытаванні і добрай захаванасці ў памяці народа традыцыйных вусна-паэтычных твораў: каляндарна-абрадавых, вясельных і нават замоў.

Найбольш буйныя працы, якія друкаваліся ў 1920-я гг.. былі: А. Сержпутоўскага «Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета» (1926), А. Шлюбскага «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віпебшчыны» ў 2 частках (1927 - 1928). М. Гарэцкага і А. Ягорава «Народныя песні з мелодыямі» (1928).

У зборніку фальклорных матэрыялаў А. Шлюбскага песні сістэматызуюцца па жанрах і відах: калядныя, запусныя, веснавыя,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

русальныя, купальскія, працоўныя, хрэсьбінныя, вясельныя песні і прыпеўкі, хаўтурныя галашэнні. Складальнік змясціў багаты фальклорны і этнаграфічны матэрыял, асабліва падрабязна апісаў шлюбныя абрады і звычаі.

Асаблівае значэнне надаецца ў гэты час запісу песень з напевамі. У 1928 г. выходзіць зборнік «Народныя песні з мелодыямі» М. Гарэцкага і А. Ягорава апублікавана 318 песень. запісаных у вёспы Багацькаўка Мсціслаўскага павета ад маці Гарэцкай Ефрасінні Міхайлаўны. Ад яе запісаў напевы А. Ягораў і каля 125 перавёў на ноты. У зборнік увайшлі песні земляробчага календара (зімовыя, веснавыя, купальскія, жніўныя, вясельныя (іх найбольш 117).

У Інбелкульце плённа працаваў І. Сербаў. Яшчэ ў капцы XIX пачатку XX ст. ён сабраў шмат фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, якія часткова змясціў у кнізе «Беларусы-сакуны» (1915) і доўгі час, нават у 1930-я гг. публікаваў іх у газетах і часопісах. У 1911-1912 гг. падчас навуковых экспедыцый па населеных пунктах Мінскай губерні даследчык зрабіў унікальныя фотаздымкі, якія сёння з'яўляюцца каштоўнымі візуальнымі дакументамі па беларускай этнаграфіі, гісторыі і культуры. У сваіх фотаработах І.А. Сербаў адлюстраваў для нашчадкаў традыцыйную беларускую вёску напярэдадні Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі 1917 г.
.

З 1925 года І.А. Сербаў працуе сакратаром секцыі этнаграфіі Інбелкульта, а ў 1927 г. узначаліў камісію па вывучэнню быту і матэрыяльнай культуры насельніцтва Беларусі. У 1925 г. быў у экспедыцыі на Магілёўшчыне, дзе зафіксаваў шмат узораў фальклору, сярод якіх 50 песень на фанографе. Сабраны ім багаты матэрыял выкарыстоўваўся ў кнізе «Вічынскія паляне» (1928) і іншых публікацьгях. З 1929 г. І.А. Сербаў навуковы сакратар кафедры этнаграфіі і фальклора Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значэнне дзейнасці Інбелкульта для развіцця беларускай фалькларыстыкі і этнаграфіі, а таксама ддя ўзнікнення шырокага краязнаўчага руху ў Беларусі 1920-30-х гг. цяжка пераацаніць. Выданне праграм, зборнікаў, шматлікія экспедыцыі, прыцягненне ў Беларусь для навуковай дзейнасці і станаўлення нацыянальнай адукацыі славутых вучоных - усё гэта запачаткавана было ў гэтай першай нацыянальнай навукова-даследчай установе.

**Тэма 26. Беларуская фалькларыстыка 1930-50-х гг.: уплыў савецкай ідэалогіі**

Пытанні па тэме

1. Фалькларыстыка ў сістэме савецкай ідэалагічнай парадыгмы. Публікацыя псеўдафальклорных твораў.

2. Звужэнне праблемнага поля беларускай фалькларыстыкі.

3. Фалькларыстычная дзейнасць М.Я. Грынблата, М.М. Нікольскага.

Літаратура па тэме

Швед, І.А. Уводзіны ў фалькларыстыку : вучэбна-мета,цычны дапаможнік : у 2 ч. /І.А. Швед. - Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна. - Брэст : БрДУ.2009. 4.1. 92 с. 2010. 4.2. 114 с.

У 1930-я гг. цэнтрам збірання і вывучэння фальклору была Акадэмія навук БССР, створаная ў 1929 г. на базе Інбелкульта. Фалькларыстычныя дасдедаванні канцэнтраваліся ў сектары этнаграфіі і фальклору Інстытуга гісторыі. Штогод вялікія экспедыцыі накіроўваліся ў рэгіёны для збірання фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў. Але з пачатку 1930-х гт. у Беларусі, як і ў іншых рэспубліках былога СССР, пачынаецца панаванне ідэалагічнага дыктату: фальклор інтэрпрэтуецца выключна ў сістэме ідэалагічнай парадыгмы.

Паводле ўстановак ідэалагічных тэарэтыкаў, збіральнікаў накіроўвалі на запіс менавіта савецкай вуснай паэзіі, а тых, хто захапляўся традыцыйнай народнай творчасцю, адносілі да надцэмаў. Іх бязлітасна крытыкавалі, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выніку чаго многія паплаціліся жыццём. Сярод сабраных твораў, складзеных пра тагачаспыя падзеі ў краіне, пераважалі прыпеўкі, у большасці недасканалыя як па зместу, так і па мастацкай форме. Казкі, сказы, апавяданні нельга было лічыць фальклорнымі, але іх адносілі да народных, таму што ў іх славілася партыя і яе правадыры, ухваляліся поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве, у знішчэнні «ворагаў народа». У асноўным з псеўдафальклорных твораў былі скдадзены і апублікаваны тэматычныя зборнікі «Ленін і Сталін у беларускай народнай творчасці» (1937). «Чырвоная Армія і абарона радзімы ў беларускай народнай творчасці» (1938), «Дарэвалюцыйная і Савецкая Беларусь у народнай творчасці» (1938). «Беларускі народ супраць папоў і рэлігіі» (1939) і «Жанчына ў беларускай народнай творчасці» (1940). У гэтыя творы складальнікі ўключылі мноства псеўданародных твораў, прысвечаных услаўленню Сталіна, Варашылава, Молатава, Яжова і іншых кіраўнікоў партыі і ўрада, адказных за масавыя рэпрэсіі ў СССР.

Выключэннем у пэўнай ступені была падрыхтоўка трохтомпага збору беларускіх народных песень, у якім значная роля надавалася сапраўды фальклорным творам. 3 падрыхтаваных да друку трох тамоў песень у Акадэміі навук БССР быў выдадзены толькі адзін: перашкодзіла вайна. Рукапісы другога і трэцяга тамоў згубіліся. У перпіым томе «Песні беларускага народа» (склаў М.Я. Грынблат) змешчана 208 песень і 25 варыянтаў, якія сістэматызаваны па гісторыка-тэматычнаму прынцыпу: спачатку старажытныя вытворча-абрадавыя, потым - сацыяльна-бытавыя песні (антыпрыгонныя, чумацкія, бурлацкія, батрацкія. адходніцкія, рэкруцкія. салдацкія і жартоўныя). Да 80 песень даюцца ноты з расшыфроўкай запісаў на фанографе, мелодыі да 123 песень запісаны на слых. Да кожнай песні даецца каментарый. Каб пазбегнуць забароны друкавання традыцыйных песень, складальнік назваў каляндарна-абрадавыя песні вытворча-абрадавымі, хоць на самай справе аднёс да іх тыя ж песні земляробчага календара: веснавыя, валачобныя, траецкія, касарскія,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

купальскія, жніўныя, дажынкавыя, ільняныя, талочныя песні, калядкі. У другой частцы па тэматычнаму прынцыпу размеркаваны савецкія песні і прыпеўкі, прысвечаныя паказу дасягненняў у пабудове сацыялізму. Многія творы прымітыўныя па зместу і паэтыцы.

3 тэарэтычных прац даваенных гадоў трэба адзначыць даследаванне М.М. Нікольскага «Міфалогія і абрадавасць валачобных песень» (1931). у якім робіцца спроба вызначыць генезіс валачобных песень, паказаць іх структуру, сувязь са старажыпнымі міфамі і абрадамі, адлюстраванне светапогляду селяніна, выявіць функцыянальнасць твораў і абрадаў. Таксама ўяўляе цікавасць праца «Жывёлы ў звычаях. Абрадах і вераваннях беларускага сялянства» (1933). Асноўнымі крыніцамі свайго даследавання М.М. Нікольскі ўзяў фальклорныя творы: калядныя песні, хаджэнне з казой, этыялагічныя легенды пра паходжанне птушак, жывёл, раслін, ператварэнне чалавека ў жывёлу і інш. У многіх творах, звычаях і абрадах вучоны выяўляў рэшткі магіі, татэмізму. Аднак не абышлося без сацыялагізавання - разгляду матэрыялаў з класавага пункту гледжання, нярэдка беспадстаўнага. Вядомы нападкі М.М. Нікольскага на выдатных вучоных, якія нібыта перашкаджалі развіццю беларускай фальькларыстыкі і этнагарфіі. У прадмове да кнігі «Жывелы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства» ён беспадстаўна крытыкаваў А.К. Сержпутоўскага, характарызаваў яго зборнікі як прыклад «контррэвалюцыйнага нацдэмаўскага кірунку ў этнаграфіі». У 1932 г. у часопісе «Савецкая этнаграфія» М.М. Нікольскі апублікаваў артыкул «Установкі і метады беларускай нацдэмаўскай этнаграфіі», у якім першым «прагалашальнікам» нацдэмаўшчыны назваў Ф. Багушэвіча, з пазіцый вульгарнага сацыялагізму, жорстка і непрымірыма крытыкаваў А. Шлюбскага, М. Каспяровіча і іншых навукоўцаў. Пазіцыю М.М. Нікольскага падтрымалі і іншыя прыхілыгікі манапольнай ідэалогіі ў навуцы Л. Бабровіч. М. Грынблат, Р. Выдра, С. Вольфсан. Яны неаб'ектыўна крытыкавалі вучоных, што правакавала ўзмацненне рэпрэсій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пры гучных заявах пра гістарызм савецкая фалькларыстыка была ў вышэйшай ступені антыгістарычнай. Пры вытлумачэнні фальклору яго гістарычная абумоўленасць у разлік не бралася. Развіццё фальклору трактавалася вельмі спрошчана: фальклор першабытнай эпохі, феадалізму, капіталізму, сацыялізму.

Фактычна перапісана была і гісторыя фалькларыстыкі, прычым зроблена гэта было не на навуковых прынцыпах. Не толькі Маркс і Ленін былі прызнаны яе ідэйнымі натхняльнікамі, але і рускія рэвалюцыйныя дэмакраты, іх асобныя нататкі, цытаты, узятыя з іншага, не народазнаўчага. кантзксту былі аб'яўлены ці не самы.мі вырашальнымі фактарамі навуковага развіцця.

У перыяд панавання сталінскага рэжыму з праблемнага поля фалькларыстыкі знікаюць многія жанры фальклору і з’явы традыцыйнай культуры. Накладваецца забарона на вывучэнне духоўных вершаў і хрысціянскіх легенд, народна-рэлігійны змест якіх не адпавядаў атэістычным установкам савецкай улады. З поля зроку навукі выводзяцца замовы, магічныя практыкі, міфалагічныя апавяданні, а таксама анекдоты, якія нібыта з'яўляюцца адлюстраваннем «цёмнай» свядомасці сялянства, якая павінна быць пераадолена сацыялістычнай культурай. У абрадавай сферы штучна вылучаюцца асобныя песенныя жанры, а акцыянальны і прадметна-атрыбутыўны аспекты абрадаў наогул ігнаруюцца.

Ідэалогія будаўніцтва сацыялізму прадугледжвала абавязковы росквіт прамысловасці, сельскай гаспадаркі. навукі і мастацтва, а значыць, і фальклору. Меркавалася, што народная творчасць эпохі сацыялізму павінна быць ва ўсіх адносінах лепшай за фальклор мінулага. Узнікае «тэорыя шліфоўкі класічнага фальклору», яго бесперапыннага ўдасканалення. Узоры, зафіксаваныя дарэвалюцыйнымі фалькларыстамі старанна адбіраліся, рэдагаваліся, а ў зборніках «народнай творчасці савецкага часу», як ужо адзначалася, дамінавалі псеўдафальклорныя тэксты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У гэтыя гады значна звужаецца метадалагічная база навукі. Рабіліся спробы звесці ўсю разнастайнасць падыходаў у вывучэнні фальклору да «адзіна правільнага» марксісцка-ленінскага метаду, а дакладней да класавага, вульгарна-сацыялагічнага метаду. Развіваецца вузкая спецыялізацыя ў даследаваннях: прадмет вывучэння філолагаў абмяжоўваецца славеснымі жанрамі, этнографаў сацыяльнымі працэсамі, музыказнаўцаў музычнымі жанрамі. З 1930-х гг. практычна да 1950-х фальклор разглядаўся выключна як мастацтва слова працоўнага народа. Разнастайнасць складнікаў вуснай культуры зводзілася да адзінага пачатку- эстэтычнага, адбывалася зближэнне фальклярысгыкі з літаратуразнаўствам.

У 1958 г. савецкі вучоны М.К. Азадоўскі меў ужо падставы сцвярджаць: «Савецкая фалькларыстыка выпрацавала гістарычны пункт гледжання на з'явы фаікклору і вызначыла яго месца ў практыцы будаўніцтва сацыялістычнай культуры». Сапраўды, савецкая фалькларыстыка стала ў пэўным сэнсе на адрозны ад сусветнай навукі шлях развіцця. Пераадоленне савецкіх псеўданавуковых установак у навуцы аб фальклоры пачнецца з 1960-х гг.

**Тэма 27. Збіранне і вывучэнне народнай песні беларускімі савецкімі кампазітарамі**

Пытанні па тэмс

1. Збіральніцкая дзейнасць М. Чуркіна. Зборнік «Беларускія пародныя песні і танцы».

2. Дзейнасць Р.Р. Шырмы ў галіне вывучэння і папулярызацыі беларускай народнай музыкі.

3. Г. І. Цітовіч як даследчык беларускай музычнай народнай песеннай творчасці.

Літаратура па тэме

Фядосік, А.С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А.С. Фядосік ; [рэд. В. К.Бандарчык] : Акадэмія навук Беларускай ССР. Інстытут

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства,этнаграфіі і фальклору. - Мн. : Навука і тэхніка. 1987. 348 с.

Песня - душа народа : 3 літаратурнай спадчыны / Уклад., камент. і біліягр. В. Ліцвінкі ; Прадм.Н. Плевіча. - Мн. : Мастацкая літаратура. 1993. 349 с.

Вялікі ўклад у развіццё беларускай фалькларыстыкі, а менавіта ў збіранне і вывучэнне народнай песні і танца, уносяць беларускія кампазітары М. Чуркін. Р. Шырма, Г. Цітовіч і іншыя.

Яшчэ ў дарэвалюцыйны час пачаў сваю збіральніцкую фалькларыстычную дзейнасць Мікалай Мікалаевіч Чуркін (1869 1964). Як дасціпна адзначаў Р.Р. Шырма. яго творчая дзейнасць пачыналася ў той час, калі беларуская народная песня разам са сваім народам «сіратой начавала забытаю ў полі, у лясах беларускага краю». 3 1905 г., калі яго запрасілі на працу ў Віленскі настаўніцкі інстытут, ён зацікавіўся беларускім фальклорам. Сустрэча ў 1908 г. з Е.Р. Раманавым натхніла М.М. Чуркіна на актыўнае збіранне народнай песні. У 1910 г. у сёмым выпуску «Беларускага зборніка» Е.Р. Раманава ўжо надрукавана 50 нотных запісаў песень са збораў Чуркіна. Сотні запісаў беларускіх песень зрабіў ён на Віленшчыне ў даваенныя гады. 3 1935 г. М.М. Чуркін жыве ў Мінску, у складзе экспедыцый АН БССР выязджае ў Мінскую і Віцебскую вобласці, дзе зноў і зноў робіць запісы народных песень. Народны мелас уплывае на яго кампазітарскую творчасць (Чуркін піша музыку на творы народных песняроў Я. Купалы, Я. Коласа, а таксама на вершы П. Броўкі, М. Танка і іншых паэтаў).

Шмат што з палявых матэрыялаў кампазітара загінула падчас вайны. Але ў 1949 г. М.М. Чуркін выдаў зборнік «Беларускія народныя песні і танцы», у якім апублікаваў 177 песень і танцаў (песні каляндарна-абрадавыя, сямейпа-абрадавыя, бытавыя. Карагодныя, гульнёвыя, прыпеўкі). Ён адзначыў асаблівасці сольных і калектыўных спеваў, аднагалосся, двухгалосся і паліфаніі, сцісла акрэсліў рытміку беларускіх народных песень. У 1959 г. выйшаў у свет зборнік М.М. Чуркіна «Беларускія народныя песні»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у якім надрукаваны 73 песні з напевамі. Амаль усе яны традыцыйныя народныя творы (толькі пяць познетрадыцыйных). Песні сістэматызаваны па функцыянальнаму жанрава-відавому пранцыпу: каляндарна-абрадавыя, сямейна-абрадавыя, казацкія, рэкруцкія, любоўныя, жаночыя, танцавальныя. За творчую спадчыну, якую пакінуў славуты дзяяч культуры М.М. Чуркін Г.І. Цітовіч назваў «старэйшынай беларускай музыкі».

Надзвычай плённай была дзейнасць у галіне беларускай фальклярыстыкі Рыгора Раманавіча Шырмы (1892 - 1978). У Заходняй Бсларусі ён актыўна збіраў песенны фальклор, папулярызаваў яго, арганізоўваючы самадзейныя фальклорныя калектывы, напрыклад, хор Віленскай гімназіі, хор Беларускага Саюза студэнтаў у Вільні. Р.Р. Шырма, захапляючыся беларускай і рускай народнай музыкай, часта выступаў з лекцыямі і артыкуламі. У 1929 г. выдаў зборнік «Беларускія народныя песні», у які ўключыў песні ў музычнай апрацоўцы кампазітараў К. Галкоўскага, М. Анцава, А. Грачанікава. Падзеі 1939 г. натхнілі Р.Р. Шырму на плённую працу, у якой раскрыўся яго магутны талент фальклярыста-музыказнаўца. У 1940 г. ён арганізаваў прафесійны ансамбль песні і танца ў Беластоку (Польшча).

У 1947 г. ён апублікаваў першы том задуманага яшчэ да вайны выдання беларускага фальклору ў некалькіх выпусках - «Беларускія народныя песні, загадкі і прыказкі», у якім змясціў творы, запісаныя ў Вілейскім, Пастаўскім. Слонімскім, Валожынскім, Гродзенскім, Нясвіжскім і іншых раёнах. У кнізе апублікаваны 337 песень, 26 прыпевак, 60 прыказак і 44 загадкі.

Важнейшай працай Р.Р. Шырмы з'яўляецца чатырохтомны збор «Беларускія народныя песні», складзены пераважна з яго ўласных запісаў. У першы том уключаны песні пра каханне, бытавыя, жартоўныя, балады і інш. У другім томе змешчаны песні аб жаночай долі, сіроцкія, сацыяльна-бытавыя, хрэсьбінныя і інш. У трэцім томе апублікаваны вяснянкі, валачобныя, юр'еўскія, купальскія, пятроўскія, жніўныя, восеньскія, калядныя і масленічныя песні. Чацвёрты том поўнасцю прысвечаны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вясельнай паэзіі з апісаннем вяселля, яго асноўных этапаў. Чатырохтомнік Р.Р. Шырмы характарызуецца адборам высокамастацкіх твораў, кваліфікаваным націраваннем песень, падрабязнай пашпартызацыяй і каменціраваннем усіх тэкстаў. Яшччэ адзін зборнік для хораў выйшаў у свет у 1971 г. «Беларускія народныя песні», у яго складальнік уключыў і традыцыйныя, і сучасныя песні. Навуковую і практычную каштоўнасць збору народных песень Р.Р. Шырмы нельга пераацаніць. На працягу ўсяго жыцця Шырма клапаціўся аб высокаякаснай інтэрпрэтацыі народнай песні, апрацоўцы яе кампазітарамі, выступаў супраць прымітывізму у прафесіянальным музычным мастацтве.

Нястомным збіральнікам. даследчыкам і прапагандыстам народнай песні быў Генадзь Іванавіч Цітовіч (1910-1986). Палюбіў ён беларускую песню яшчэ ў юнацтве, калі вучыўся ў Віленскай гімназіі і ўдзелынічаў у хоры, якім кіраваў Р.Р. Шырма. Менавіта Шырма выхаваў у Цітовіча захапленне народнай песняй. Беларускія народныя песні пераважалі ў рэпертуары Падлескага народнага хору(в.Падлессе Ляхавіцкага р. Брэсцкай вобл.), арганізаванага Цітовічам у 1939 г., і ў рэпертуары Дзяржаўнага народнага хору БССР, створанага ім у 1952 г.

Г.І. Цітовіч збіраў песні ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, радаваўся, як ўспаміналі яго калегі. кожнай новай знаходцы.

У 1959 г. ён выдаў «Песні беларускага народа», дзе змясціў 296 узораў. Лепшыя ўзоры песень для «Анталогіі беларускай народнай песні» (1968) ён адбіраў не толькі са сваіх запісаў, але і з запісаў Р.Р. Шырмы, А.С. Мухарынскай, З.Я. Мажэйкі, У.У. Алоўнікава і іншых. Ён імкнуўся да таго, каб у анталогію трапілі творы з усіх беларускіх абласцей. Матэрыялы сістэматызуюцца ў зборы па гістарычнаму і функцыянальна-жанраваму прынцыпу: у першай частцы змешчаны традыцыйныя песні (калядкі і шчадроўкі, вяснянкі, валачобныя, юраўскія, купальскія, жніўныя, дажынкавыя, восеньскія, піліпаўскія, вясельныя, радзінныя, хрэсьбінныя, дзіцячыя, любоўныя песні, балады, сацыяльна-бытавыя песні); у другой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

частцы сучасныя песні. Другое, значна дапоўненае выданне анталогіі выйшла ў 1975 г. (уключае 430 песень).

Г.І. Цітовіч праявіў сябе сур'ёзным даследчыкам беларускай музычнай народнай песеннай творчасці. Ён надрукаваў шэраг артыкулаў, брашур, у якіх даследаваў песенную творчасць Заходняй Беларусі, узаемасувязі беларускай і ўкраінскай народнай музычнай творчасці, беларускага і літоўскага песеннага фальклору і інш. У 1964 г. Цітовіч выступіў на VII Міжнародным кангрэсе антрапалагічных і этнаграфічных навук у Маскве з дакладам «Новыя стылявыя рысы традыцыйнай бедарускай народнай песні» (надрукавана асобным выданнем). У 1976 г. выйшлі ў свет яго выбраныя нарысы «Аб беларускім песенным фальклоры». Г.І. Цітовіч пакінуў багатую фалькларыстычную спадчыну і па праву ўвайшоў у гісторыю беларускай культуры як адзін з лепшых яе падзвіжнікаў.

Беларускія савецкія кампазітары, падрыхтавалі глебу для будучых даследчыкаў-этнамузыколагаў. Разуменне каштоўнасці захавання і трансляцыі фальклорнага твора ў аўтэнтычнай форме будзе сфарміравана ў навуцы і практыцы пазней.

**Тэма 28. Дзейнасць ІМЭФ АН БССР. Серыя «Беларуская народная творчасць» (БНТ)**

Пытанні па тэме

1. Утварэнне ІМЭФ. Напрамкі навуковых даследаванняў.

2. Найважнейшая праца фалькларыстаў Нацыяналыіай акадэміі навўк шмагтомнае выданне (БНТ): класіфікацыя, каментарыі, паказальнікі.

3. Акадэмічныя выданні 1980- 2000-х гг., прысвечаныя праблемам беларускай народнай кудьтуры.

Літаратура па тэме

Фядосік. А.С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А.С. Фядосік ; [рэд. В. К.Бандарчык] ; Акадэмія навук Беларускай ССР. Інстытут

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. - Мн. : Навука і тэхніка. 1987. 348 с.

Швед, І. А. Уводзіны ў фалькларыстыку : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў 1-га курса філалагічнага факультэта : у 2 ч. /1. А. Швед ; УА БрДУ імя А.С. Пушкіна. - Брэст : БрДУ. 2009 2010. - Ч. 2. 2010. 113 с.

У сярэдзіне 1950-х гг. у БССР усе болыш актуальным робіцца вывучэнне беларускай нацыянальнай культуры як прафссіянальнай, так і народнай. 3 мэтай комплекснага даследавання традыцыйнай культуры беларусаў 11 ліпепя 1957 г. ствараецца Інстыпут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. Першым дырэктарам Інстытута стаў акадэмік АН БССР Пятро Фёдаравіч Глебка, які ўзначальваў яго на працягу 12 год. Як сведчаць многія навукоўцы, узгадваючы час станаўлення інстытута. П.Ф. Глебка шмат сіл аддаў арганізацыі, збору, папулярызацыі і тэарэгычнаму вывучэнню фальклору, быў душой і натхняльнікам шматтомнага выдання БНТ. У 1993 г. інстытуту было прысвоена імя Кандрата Крапівы.

Па шырыні напрамкаў навуковых даследаванняў Інстытут мастацтвазпаўства, этнаграфіі і фальклору - установа шматпрофільная, асноўны цэнтр фундаментальных дасдедаванняў у галіне фалькларыстыкі і мастацтвазнаўства. Супрацоўнікі Інстытута ажыццяўлялі збіранне, сістэматызацыю і публікацыю вусна-паэтычных твораў, даследаваді тэорыю і гісторыю беларускага фальклору, праблемы генезісу, сучасныя фальклорныя працэсы. Вынікам работы. праведзенай па ўсіх гэтых напрамках стала выданне вялікай колькасці манаграфій, зборнікаў, артыкулаў.

Адна з першых прац Інстытута ў гэтым напрамку зборнік «Беларускі эпас» (1959), выдадзены пад рэдакцыяй П.Ф. Глебкі і І.В. Гутарава. Гісторыя беларускага фальклору ад старажытнасці да 60-х гадоў XX ст. знайшла адлюстраванне ў калектыўнай манаграфіі «Беларуская народная вусна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паэтычная творчасць: гісторыка-тэарэтычнае даследаванне» (1967). Гэта першы пасля Я.Ф. Карскага сістэматычны разгляд асноўных відаў і жанраў фальклору беларусаў і некаторых праблем іх генезісу і асаблівасцей зместу.

Некаторыя заканамернасці развіцця беларускага фальклору разгледжаны ў манаграфіі К.П. Кабашнікава. Беларуская народная сатыра ўпершыню ў фальклярыстыцы даследавана ў манаграфіях А.С. Фядосіка. Азначаныя працы маюць адбітак савецкіх сацыялыіа-ідэалагічных установак.

Паэтыку беларускіх народных твораў даследавалі М.А. Янкоўскі, В.М. Коўтун. Шматлікія манаграфіі беларускіх навукоўцаў прысвечаны асобным жанрам або відам беларускага фальклору.

Даследчыкамі была здзейснена велізарная праца па тэарэтычным асэнсаванні і публікацыі многіх жанраў і відаў беларускай народнай творчасці. Многія пытанні беларускай фальклярыстыкі разгледжаны ў «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі» (У 5 т. 1984-1987). У ёй мы знаходзім літаратуразнаўчыя характарыстыкі жанраў беларускага фальклору (лірычныя песні, празаічныя жанры вялікіх і малых форм ды інш.). З 1995 г. Інстытут мастацтвазнаўства. этнаграфіі і фальклору Нацыяпалыіай АП Беларусі пачаў фундаментальнас шматтомнае выданне «Беларусы». Асобныя тамы прысвечаны прамысловым і рамесным заняткам, дойлідству, грамадскім традыцыям, гісторыі этналагічнага вывучэння. У плане вывучэння фальклору цікавасць уяўляе Т. 7 «Вусная паэтычная творчасць».

У апошняе дзесяцігоддзе XX ст. значна павышаецца цікавасць па беларускай (славянскай) міфалогіі. Выходзяць манаграфічныя даследаванні А.М. Ненадаўца. Для выкладчыкаў і студэнтаў вышэйшых навучалыіых устаноў было выпушчана некалькі вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў.

Так. з 1970 па 1996 гг. вытрымаў чатыры выданні дапаможнік «Беларускі фальклор. Хрэстаматыя» (склад. К.П. Кабашнікаў. А.С. Ліс. А.С. Фядосік. Т.К. Цішчанка). У 1979 г. выйшаў у свет вучэбны дапаможнік «Беларуская народна-паэтычная творчасць» калектыву аўтараў (К.П.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кабапшікаў. Л.С. Ліс, А.С. Фядосік. І.К. Цішчанка, М.А. Янкоўскі). У 1988 г. пад той жа назвай выдадзены падручнік, перавыдадзены у 2000 г., перапрацаваны і дапоўнены. Важныя праблемы фальклarыстыкі даследаваны ў многіх сотнях артыкулаў, брашур, матэрыялах канферэнцый. Выдадзена шмаг зборнікаў вуснай народнай творчасці для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзростаў, а таксама для шырокага чытача.

Значнай падзеяй у фалькларыстыцы з'явілася выданне гісторыка-тэарэтычнага даследавання у выдавецтве «Беларуская навука» у 6 кнігах серыі «Беларускі фальклор: жанры, віды. паэтыка»

Адной з важнейшых прац фалькларыстаў Нацыянальнай акадэміі навук з'явілася шматтомнае выданне беларускай народнай творчасці (БНТ), падрыхтаванае калектывам супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства. этнаграфіі і фадьклору. Падрыхтоўка да яго выдання пачалася яшчэ ў 1960-я гг. Выходзіць у свет першыя тамы пачалі з 1970 г. Да 2000 г. было надрукавана 45 тамоў. Класіфікацыя фальклорных матэрыялаў у зводзе грунтавалася на жанрава-відавым. функцыянальным, эстэтычным і тэматычным прынцынах з улікам музычных асаблівасцей песеннай творчасці.

У цэлым звод беларускай народнай творчасці (БНТ) даў не толькі грунтоўнае тэарэтычнае асэнсаванне, але і змясціў вялізную колькасць унікальыіых узораў каляндарнай і сямейнай абраднасці. абрадавай песні, пазаабрадавай лірыкі, асэнсаванне замоў, народнага эпасу і малых жанраў фальклору, народнай сатыры. народнага тэатру і інш. Да кожнага тома даецца грунтоўны ўступны артыкул (да песенных тамоў два, з славсснай і музычнай характарыстыкай). У песенных тамах змяшчаюцца націроўкі напеваў. Усе гамы БНТ забяспечаны паказальнікамі: геаграфічнымі, імяннымі запісчыкаў і інфарматараў, у некаторых тамах алфавітнымі.

Значная частка твораў у зводзе БНТ друкуецца ўпершыню, з архіваў, новых запісаў. Звод раскрывае велізарнае багацце высокамастацкай паэтычнай творчасці беларускага народа, славеснай, музычнай. тэатральнай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звод «Беларуская народная творчасць» атрымаў высокую ацэнку навуковай грамадскасці. Дзяржаўнай прэміяй БССР за 1986 год былі ўзнагароджаны навукоўцы, якія працавалі над укладаннем тамоў БНТ: А.С. Фядосік, М.Я. Грынблат, В.І. Ялатаў, К.Н. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч, А.І. Гурскі, А.С. Ліс, Л.А. Малаш, Л.М. Салавей, І.К. Цішчанка.

ТЭМА 29. РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ЭТНАМУЗЫКАЛОГІІ

Пытанні па тэме

1. Актывізацыя збірання і вывучэння музычнага фальклору ў 1960-я гг.; працы В.І. Ялатава.

2. Навуковая дзейнасць З.Я. Мажэйка. Манаграфія «Каляндарна-песенная культура Беларусі: Вопыт сістэмна-тыпалагічнага даследавання».

3. Тыпалогія і функцыянальнасць народных музычных народных інструментаў у працах І.Д. Назінай.

4. Народная харэаграфія ў даследаваннях Ю.М. Чурко.

Літаратура па тэме

Фядосік, А.С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А.С. Фядосік ; [рэд. В.К. Бандарчык]; Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. - Мн. : Навука і тэхпіка. 1987. 348 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1957-1986 гг., якія ў палітычным сэнсе вызначаюцца хрушчоўскай «адлігай» і брэжнеўскім «застоем» адбываецца павольнае вызваленне навукі ад ідэйнага дыктату і вяртанне яе да разнастайнасці метадалагічпых пазіцый. Вялікую ролю ў развіцці беларускай фадькларыстыкі адыгралі даследавапні этнамузыколагаў. 3 1960-х гг. значна актывізавалі збіранне і вывучэннс беларускага фальклору В.І. Ялатаў, З.Я. Мажэйка. Л.С. Мухарынская. Ю.М. Чурко. І.Д. Назіна, Г.В. Таўлай.

Пачатак вывучэнню народнай музычнай культуры палажыў В.І. Ядатаў выданнем шэрагу манаграфій, у якіх ён даследаваў заканамернасці і спецыфіку развіцця бедарускай музычнай песеннай творчасці: «Ладавыя

асновы беларускай народнай музыкі» (1964), «Рытмічныя асновы беларускай народнай музыкі» (1966). «Меладычныя асновы бсларускай народнай музыкі» (1970). Даследчык аналізаваў тэндэнцыі развіцця беларускай народнай музыкі ў кантэксце ўсёй традыцыйнай культуры і ў параўнанні з музычнымі культурамі іншых народаў.

З.Я. Мажэйка паспяхова даследавала рэгіянальныя асаблівасці песеннай творчасці беларусаў у сваіх працах: «Пеесnная культура Беларускага Палесся» (1971). «Песні Беларускага Палесся» у двух выпусках (1983-1984Ю, Масква). «Песні Беларускага Паазер'я» (1981). У манаграфіі «Каляндарна-песенная культура Беларусі: Вопыт сістэмна-тыпалагічнага даследавання» (1985) З.Я. Мажэйка ўпершыню глыбока тэарэтычна асэнсавала сістэму каляндарнай песеннай творчасці, вызначыла спецыфіку яе функцыянавання.

У манаграфіі «Песенная культура Беларускага Палесся» (1971) З.Я. Мажэйка даследавала мясцовы песенны стыль, вызначыла асаблівасці, якія адрозніваюць яго ад стыляў іншых этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Фактычную аснову склалі палявыя матэрыялы, сабраныя аўтарам у 1963-1970 гг. пераважна ў вёсцы Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Асобны раздзел прысвечаны ўнісонна-гетэрафоннай і сольнай традыцыям, выкананню лірычных шматгалосых песень.

Першы выпуск «Песень Беларускага Палесся» прысвечаны каляндарнай і сямейна-абрадавай песні, другі пазаабрадавым песням розных гістарычных перыядаў.

Грунтоўныя тэарэтычныя артыкулы, якія суправаджаюць выпускі зборніка, даюць сістэмны аналіз песеннай лірыкі Беларускага Палесся. «Песні беларускага Паазер'я» - гэта істотны ўнёсак дасдедчыцы ў вывучэнне паўночнабеларускай песеннай творчасці. З.Я. Мажэйка вызначае асаблівасці народнапесеннай культуры Паааазер'я і дзве асноўныя тэндэнцыі ў станаўленні меладычнага стылю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асабіста сабраны багаты песенны матэрыял тэарэтычна асэнсаваны З.Я. Мажэйка ў манаграфіі 1985 г. Песні земляробчага календара ўпершыню даследуюцца не па жанрах або цыклах, а ў сукупнасці, у сістэме этнамузыкаяагічньгх тэарэтычных прынцыпаў, вызначаюцца тыпы напеваў і зоны іх распаўсюджання. Каляндарна-земляробчы цыкл успрымаецца 3. Мажэйка не як рэліктавая з’ява, што мае толькі пазнаваўчае гістарычнае значэнне, але як жывая з'ява сучаснасці. Пазнейшыя працы даследчыцы «Народна-песенная культура Беларусі ў агульнаславянскім кантэксце: Да пытання薦 параўналных даследаванняў на ўзроўні песенных сістэм» (1998). «Песні Беларускага Падняпроўя (разам з Т.Б. Варфаламеевай. 1999). «Экология традиционной народно-музыкальной культуры» (2011) развіваюць этнамузыкалагічны кірунак у беларускай фалькларыстыцы. Спадчына этнамузыколага З.Я. Мажэйка з'яўляецца ў тэарэтычным і практычным плане непераўзыдзенай да нашага часу .

У манаграфіі Л.С. Мухарынскай «Беларуская народная песня» (1977) даследуецца генезіс і развіццё музычнага фальклору беларусаў, паказана разнастайнасць песенна-меладычных тыпаў у народнай песнятворчасці. Акрамя ўзораў раннетрадыцыйнай песеннай класікі аўтар разглядае таксама казацкія, антыпрыгонніцкія песні і ўзоры савецкага фальклору, аўтэнтычнасць якіх сення выклікае сумненне.

Узаемасувязі вербальнага кампанента і напева ў беларускай абрадавай песні прысвечана даследаванне Г. Таўлай «Белорусское Купалье: Обряд. песня» (1986). Этнафонію паўночнабеларускага вяселля ўпершыню сістэмна вывучае Т.Б. Варфаламеева, значным унёскам у этнамузыкалогію з'яўляецца яе манаграфія «Песні Беларускага Панямоння» (1998).

Беларуская народная харэаграфія ў цэнтры навуковых даследаванняў Ю.М. Чурко: «Беларускі сцэнічны танец» (1969) і «Беларускі народны танец» (1972). Даследчыцай вылучаны асноўныя харэаграфічныя элементы традыцыйнага танца (Лявоніха, Мяцеліца, Юрачка, Крыжачок, Мікіта,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таўкачыкі і інш.), тэматыка карагодных песень, а таксам гісторыя развіцця беларускага сцэнічнага танца.

Тыпалогія і функцыяналыіасць музычных народных інструментаў падаецца І.Д. Назінай у яе працах «Беларускія народныя інструменты. Самагучныя, ударныя, духавыя» (1979) і «Беларускія народныя інструменты. Струнныя» (1982). На падставе экспедыцыйных магэрыядаў і гістарычных помнікаў І.Д. Назіна сістэматызавала беларускія народныя музычныя інструменты, апісала іх канструкцыю, спосаб вырабу, лад і гукарад. Таксама ёй апісаны спосабы выканання на гэтых інструментах, асаблівасці выкарыстання кожнага з іх у штодзённым жыцці, святочнай і абрадавай практыцы. З указанымі працамі перагукаецца і калектыўная манаграфія З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеевай, І.Д. Назінай «Беларуская этаамузыкалогія: Нарысы гісторыі (XIX-XX стст.)» (1997), у якой раскрываецца станаўленне і развіццё беларускай этнамузыкалогіі ў непарыўнай сувязі з самой народнай музычнай традыцыяй. Варта адзначыць працы Т. Якіменка «Сучасная беларуская этнамузыкалогія : Да практык апошняй трэці XX - пач. XXI ст.» (2004). Я.У. Гіпіус «Избранные труды в контексте белорусской этномузыкологнн» (2004).

Этнамузыкалагічныя даследаванні народнай культуры рэалізаваны ў шматтомным выданні пад агульнай рэдакцыяй Т.Б. Варфаламеевай «Традыцыйная мастацкая кульгура беларусаў» у шасці тамах (2008-2013). Апошнія тры тамы выйшлі з электроннымі праграмамі: запісамі аўтэнтычных песень, інструментатьнай музыкі і народнай прозы ў выкананні яркіх спевакоў, інструменталістаў і апавядальнікаў.

**Тэма 30. Спадчына славутых збіральнікаў у даследаваннях беларускіх навукоўцаў**

Пытанні па тэме

1. Працы па гісторыі фалькларыстыкі І.К. Цішчанкі: персаналіі і сацыялына-культурныя працэсы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Гісторыя фалькларыстыкі ў даследаваннях Г.А. Каханоўскага.

3. Збіральнікі і даследчыкі народнай творчасці ў працах Г.А. Пятроўскай.

4. У.А. Васілевіч: манаграфія «Збіральнікі». Пераклад на беларускую мову твораў Ч. Пяткевіча.

Крыніцы па тэме

Фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Асаблівае значэнне ў кантэксце гісторыі навукі аб фальклоры маюць працы, што складаюць своеасаблівую трохтомную гісторыю збірання і вывучэння беларускай народнай творчасці: Каханоўскі Г.А., Малаш Л.А., Цвірка КА. «Беларуская фалькларыстыка. Эпоха феадалізму» (1989), Пятроўская Г.А., Цішчанка І.К., Васілевіч У. А. і інш. «Беларуская фалькларыстыка. Збіранне і даследаванне народнай творчаспі ў 60-х гг . XIX - пач. XX ст». (1989). Фядосік А.С. «Беларуская савецкая фадькларыстыка» (1987).

У гэтых працах разгледжаны сацыяльна-гістарычныя ўмовы, у якіх адбывалася развіццё навукі аб фальклоры беларусаў, сістэматызаваны звесткі пра асоб збіральнікаў, ахарактарызаваны іх сацыяльныя і навуковыя погляды, прааналізаваны змест зборпікаў, якія сёння лічацца класічнымі. У шырокім сапыяльна-палітычным кантэксце апісана дзейнасць устаноў, якія садзейнічалі збіранню, вывучэнню беларускага фальклору, указаны навуковыя таварыствы і іх перыядычныя выданні, на старонках якіх на працягу XIX-XX ст. друкаваліся беларускія фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы. Сюды ж адносяцца і асобныя манаграфіі, прысвечаныя дзейнасці выдатных фалькларыстаў. Працы В. Бандарчыка, А. Фядосіка, І. Цішчанкі, Г. Каханоўскага, Г. Пятроўскай, У. Васілевіча, Я. Саламевіча, А. Аксамітава і Л. Малаш маюць не толькі ўласна фалькларыстычны, але і гістарыяграфічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характар. Яны ствараюць сёння залаты фонд гісторыі беларускай фалькларыстыкі.

Васіль Кірылавіч Бандарчык (1920-2009) - савецкі этнолаг і гісторык, сабраў і ўпершыню сістэматызаваў шырокі фактычны матэрыял па гісторыі этналагічныя вывучэння беларусаў рускімі і польскімі даследчыкамі і навуковымі арганізацыямі. В.К. Бандарчык - аўтар Т. 3 «Гісторыя этналагічнага вывучэння» (1999) у шматтомным выданні «Беларусы» і манаграфій пра М.Я. Нікіфароўскага і Е.Р. Раманава.

Анатоль Сямёнавіч Фядосік (1926 -1974) - беларускі савецкі фалькларыст, доўгі час працаваў на кіруючых пасадах ў ІМЭФ НАН Бедарусі. Беларускай фалькларыстыцы прысвечана яго кніга «Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фалькларыстыкі 20 —30-х гг. « (1991).

Іван Кіры.тавіч Цішчанка (1930 - 2001) - беларускі савецкі фалькларыст, упершыню ў шырокім сацыяльна-культурным кантэксце даследаваў гісторыю беларускага народазнаўства другой паловы XIX ст. і стварыў цэлую галерэю партрэтаў этнографаў і фалькларыстаў, сярод якіх А. Кіркор, П. Шэйн, П. Бяссонаў, І. Насовіч, Ю. Крачкоўскі, Е. Раманаў, Я. Ляцкі, М. Доўнар-Запольскі. А. Багдановіч. Нарысы аб іх ўвайшлі ў выданні «Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50-60-я гады XIX ст.» (1986) і «Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX пачатку XX ст.» (1989). Цішчанка-навуковец здолеў не толькі ўжыцца ў біяграфію кожнага збіральніка, але і сфармуляваць матывацыю яго імкнення, паказаць навуковаму свету багацце традыцыйпай культуры беларусаў. Такая якасць даследавання грунтавалася на шматгадовай працы аўтара ў архівах Санкт-Пецярбурга, Масквы, Вільнюса, Варшавы.

Каханоўскі Генадзь Аляксандравіч (1936 - 1994) - беларускі гісторык, археолаг, фалькларыст, музеязнаўца і краязнаўца. Яго працы вылучаюцца гістарыяграфічнай дакладнасцю, аўтарскім веданнем крыніцазнаўчай базы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

багаццем спасылачнага апарату. Г.А. Каханоўскі напісаў змястоўныя працы «Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч» (1991). нарыс «Уральская ссылка Яна Чачота»

Галіна Аляксандраўна Пятроўская - вядомы беларускі фальклярыст, шматтадовы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі ІМЭФ. Яе аўгарству належыць праца «Не погасла звезда: Жизненный и творческнй пугь Н.А. Янчука» (1987), у калектыўнай манаграфіі 1989 г. яе нарысы пра З.Ф. Радчанка, М.Я. Нікіфароўскага, Я.Ф. Карскага, М.А. Янчука, І.А. Сербава. Пазней Г.А. Пятроўская публікуе манаграфію «Пачынальнік беларускага народазнаўства М.Я. Нікіфароўскі» (1991), у якой створаны выразны і вельмі «чалавечы» партрэт збіральніка, цытуюцца яго лісты і ўспаміны.

Нельга не ўзгадаць унёсак Уладзіміра Аляксандравіча Васілевіча ў даследаванне жыцця і творчасці беларускіх фалькларыстаў. Распрацаваныя для згаданай вышэй манаграфіі 1989 г. склалі аснову для выдадзенай пазней працы «Збіральнікі». Упершыню ў беларускай навуцы ў такім аб'еме чытачу даюцца звесткі пра народазнаўпаў, сярод якіх Оскар Кольберг, Зыгмунт Глогер, Іван Берман, Аляксандр Троіцкі, Аляксандр Пшчолка, Эма Яленская-Дмахоўская, Біруга.,Уладзіслаў Вярыга, Чэслаў Пяткевіч, Казімір Машынскі. У.А. Васілевіч і Л.М. Салавей пераклалі на беларускую мову Ч. Пяткевіча «Рэчыцкае Палессе» (серыя «Беларускі кнігазбор». 2004).

Неабходна адзначыць дзейнасць У.К. Касько па захаванні спадчыны А.К. Сержпутоўскага. Ён падрыхтаваў да перавыдання працы А.К. Сержпутоўскага. якія разам з біяграфічны.м парысам і фальк.торна-этнаграфічнымі каментарамі склалі выданне ў чатырох кнігах серыі «Повязь вякоў»: «Святло далёкай зоркі» (1997). «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1998). «Сказкн и рассказы белорусов-палешуков» (1999), «Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета» (2000). Пазней з'явіўся ўкладзены У.К. Касько зборнік парэмій «Палескі дзівасіл: Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, выслоўі: са скарбніцы А. Сержпутоўскага» (2005).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Янка (Іван Уладзіміравіч) Саламевіч (1938-2012) - беларускі літаратуразнавец, фалькларыст, бібліёграф, перакладчык. Яму належыць стварэнне першага ў Беларусі «Слоўніка беларускіх псеўданімаў (XVI-XX ст.ст.)» (1983), манаграфіі «Міхал Федароўскі» (1972). Саламевіч таксама ўклаў бібліяграфічны даведнік «Беларускі фальклор (1926-1963)» (1964).

Прыкладам глыбокага гістарыяграфічнага даследавання і арыгінальнага выкладння фактычнага матэрыялу служаць працы М.В. Новікава «Павел Васильевич Шейн : книга о собирателе и издателе русского и белорусского фольклора» (1972), К.А. Цвіркі «Слова пра Сыракомлю. Быт і культура беларусаў у творчасці "вясковага лірніка"» (1975), Г. Кісялёва «Пошукі імя» (1978), А.С. Аксамітава, Л.А. Малаш «З душой славяніна: Жыццё і дзейнасць З.Я. Даленгі-Хадакоўскага» (1991). А.ІІ. Цыхун «Акадэмік з всскі Лаша Я.Ф.Карскі : Краязн. біягр. нарыс» (1992) і іншыя.

Багаты матэрыял на тэму спадчыны славутых збіральнікаў можна знайсці ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

**Тэма 31. Беларуская фалькларыстыка на сучасным этапе**

Пытанні на тэме

1.Антрапалагізацыя сучасных фалькларыстычных даследаванняў.

2. Вывучэнне з'яў традыцыйнай культуры, выключаных з увагі прафесійнай навукі у савецкі час.

3. Развіцце збіральніцкай тэорыі і практыкі.

Літаратура па тэме

Володина, Т.В. Успехи и болевые точки белорусской фольклористики последних лет / Т.В. Володина // Навстрсч}у Третьему Всеросснйскому конгрессу фольклорнстов. Сборннк научных статей. М. : Гос. республ. центр русского фольклора, 2013. С. 79- 98.

Швед, І.А. Фалькларыстыка: даследчыя прыярытэты і перспектывы развіцця / Іна Швед // Фальклор і сучасная культура : матэрыяды III

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. 21-22 красавіка 2011 г.. Мн. : у 2 ч. / [рэдкал.: І. С. Роўда і і.нш.1. - Ч. 1. - С. 4-6.

Да пачатку 2000-х гг. у беларускай навуковай традыцыі, сфармаванай пераважна навукоўцамі аддзела фалькларыстыкі акадэмічнага Інстытута мастацтвазнаўства. этнаграфіі і фальклору, дамінавала вузкае разуменне фальклору, як вуснай народнай творчасці, мастацтва слова і г.д. Практычна застаючыся ў рамках гэтага разумення, новае тысячагоддзе беларускія фалькларысты сустрэлі, маючы велізарны задзел амаль пяцьдзесят тамоў серыі «Беларуская народная творчасць» (БНТ) і многія іншыя выданні.

Ажыццёўленыя ў традыцыях філалагічнай фалькларыстыкі даследаванні, якія абапіраюцца на зборнікі класічнага фальклору XIX-другой паловы XX ст., падвялі свайго роду вынік папярэдняму назапашванню і асэнсаванню матэрыялу. Аднак, серыя БНТ, з'яўляючыся найбагацейшым дакументальна зборам беларускага фальклору, у прынцыпах прадстаўлення матэрыя.ту прытрымлівалася нормаў сучаснага правапісу, што, на жаль, не адлюстроўвае дыялектныя асаблівасці тэкстаў.

У пачатку 2000-х гг. робіцца відавочным імкненне разглядаць тэкставыя комплексы не ў жанравых адносінах, а як складаную сістэму кодаў, інтэрпрэтацыя якіх лагічна прыводзіць да выяўлення і апісання істотных для культуры сэнсаў, незалежна ад таго, у якой форме або субстанцыі яны выяўленыя. У той ці іншай меры апынуліся апісаны наступныя коды: прасторава-ландшафтны, астранамічны, арніталагічны, прадметны і саматычны. Асабліва падрабязна распрацаваны дэндралагічны і каларыстычны коды ў працах І.А. Швед, якая пераканаўча паказвае, што «вывучэнне асобных знакаў за рамкамі кода. у межах якога яны функцыянуюць, па-за кантэкстам традыцыйнай культуры не дазваляла ўсебакова раскрыць змест фальклорных сімвалаў».

У цэнтры ўвагі аказваецца ўжо не канкрэтны жанр або нават тэкст вусна-наэтычпай творчасці, але адзінка сімвалічнай мовы культуры. Таму заканамерным стала выданпе энцыклапедычнага с.чоўніка «Беларуская

міфалогія» (2004). Практычна з моманту выхаду кнігі пачалася яе дапрацоўка і ў 2011 г. выйшла «Міфалогія беларусаў». Міфапаэтычпая карціпа свету бсларусаў прадстаўлена ў амаль тысячы артыкулаў, якія тэматычна ўкладваюцца ў прыблізна пятнаццаць асноўных кодаў.

Распаўсюджванне ідэй антрапалагічнай фалькларыстыкі ў пачаткчу трэцяга тысячагоддзя ўжо прыносіць свой плён. Выходзяць манаграфіі, дзе да традыцыйных філалагічных метадаў даследавання фальклорнага матэрыялу ўжо падключаюцца семіятычныя. культуралагічныя і інш. Прыкладам з'яўляюцца манаграфіі У.М. Сівіцкага «Русальная традыцыя бедарусаў: міфапаэтычная сістэма. тыпалагічныя паралелі» (2006). Т.В. Валодзінай «Цела чалавека: слова. міф. рытуал» (2009). У.А. Лобача «Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай псрспектыве» (2013).

І ўсё ж даводзіцца канстатаваць: найболып цікавыя і значпыя вынікі фалькларыстыка атрымала ў міждысцыплінарных даследаваннях. Паслядоўны зварот да метадалогіі сумежных народазнаўчых дысцыплін. Паступовая, але ўпэўненая «антрапалагізацыя» беларускай фалькларыстыкі дазволілі прыступіць да ўсебаковага даследавання фальклору як цэласнай гісторыка-культурнай з'явы. комплексна. інтэгратыўна вывучаць працэсы. якія адбываюцца ўнутры фальклорнай традыцыі ў сувязі з рознымі зменамі ў жыцці грамадства.

У этнамастацтвазнаўчых даеледаваннях выхад на прадметнае поле сумежных этнаграфічных і фалькларыстычнага дысцыплін дазваляе болып шырока асэнеаваць антрапалагічныя асновы мастацкай дзейнасці чалавека ў стварэнні прадметнага акружэння. яе непарыўнасці з архаічнымі рытуалыіымі практыкамі і высокую ступень іх захаванасці ў сучасных праявах народнага мастацтва. і ўрэшце цэласнасць феномена градыцыйнай кульгуры. Прыкладам служаць працы В.А. Лабачэўскай' .

Ужо адзначалася. што значнай падзеяй стала выданне серыі «Традыцыйная мастацкая кульгура беларусаў» у 6-і тамах (дзесяці кнігах).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аўтэнтычнаспь тэкстаў. дакладная перадача дыялектных асаблівасцяў і індывідуальнай манеры гаворкі інфармантаў. увага да кантэксту і асабістых перажыванняў носьбітаў традыцыі. шырокі рэгіяналыіы ахоп матэрыялаў сгварае аб'ёмную панараму існавання беларуекай традыцыйнай культуры на сучасным эгапе. Аўтарекі калектыў паказаў нспасрэднае бытаванне фальклорных тэкстаў ў сувязях і ўзаемапранікненпі з жыццядзейнасцю этнасу.

У кангэкспе развіцця збіра:іыііцкай традыцыі трэба адзначыць укладзсны У.А. Лобачам «Полацкі этнаграфічпы зборнік» (>' 2 вып. 2006-201 1) . які ўяўляе еабой ўдалы вопыт прэзентацыі матэрыялаў. сабраных у апошнія гады ў час палявых этпаграфічпых даследаванняў на тэрыгоры і Віцебскай вобласці. Асноўная задача выдання скласці комплексную карціну сучаснага стану традыцыйнай культуры беларускага Падзвіння ва ўсім яе разнастайнасці. Сярод збіральнікаў і публікатараў беларускага фальклору асабліва трэба назваць Г.І. Лапаціна з г. Ветка Гомедьскай вобласці. які здолеў адкрыць. запісаць і паднесці рэдкія. прафесійна пракаментаваныя дадзеныя аб дабрахожых, русаіках. аб абрадзе ('вячы і г.д.

Сярод найболып перспектыўных планаў у беларускіх фалькдарыстаў і этналінгвістыкі стварэнне БФЭЛА (Беларуекага фальклорна-этналінгвістычнага атласа). пачатае ў сектары этналінгвістыкі і фальклору ЦДБКМЛ пад кіраўніцтвам М.II. Антропава і Т.ГЗ. Валодзінай. Менавіта комплексны этналінгвістычны метад аказваецца асабліва прадуктыўным пры даследаванні фадьклорных сюжэтаў і вобразаў. архаічных форм розных абрадавых дзеянняў і міфалагічных уяўленняў. У БФЭЛА дэталёва і паслядоўна будуць раскрыты ўсе найважнейшыя змястоўныя эдементы фальклорнай культуры. якія маюць тыпалагічнае значэнне.

У 2013 г. у ЦДБКМЛ пачалося перыядычнае выданпе зборпіка павуковых артыкулаў «Беларускі фальклор: Матэрыялы і даследаванні». якое стала цікавай пляцоўкай абмеркавання актуалыіых праблем фальклрыстыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актуальнымі нраблемамі еучаснай фаіьк.тарыстыкі з'яўляюцца: анграпалагічная фалькларыстыка; інтэрпрэтацыя фа_тьклорных тэксгаў у сістэме кодаў традыцыйнай культуры; «ніжэйшая» міфалогія. народныя вераванні і дэманалагічныя апавяданні; «пародныя Біблія»; школы і кірункі ў фальк.тарыстыцы: геаграфія фа.тьклорпых факгаў і фальклорныя дыялекты; аўдыёвізуаіыіыя метады вывучэнпя фальклору: арэальнае этнамузыкалагічнае вывучэнне фальклору; народныя веды пра музыку вуснай градыцыі; сістэматызацыя фальклорных фактаў. складанне генеральных і дапаможпых фальклорных указа^тьнікаў і каталогаў; грансфармацыя фальклору. постфадьклор; захоўванне і публікацыя экспедыцыйпых матэрыялаў; фалькдор у Інтэрнэт-прасторы; дзейнасць установ адукацыі і культуры па рэканструкцыі. адраджэнню і актуалізацыі фальклору.

Распрацоўка гэтыгх і падобных праблем мае вя.тікі патэнцыял, які дапаможа беларускай навуцы пра фальклор дасягнуць новых канцэптуальных адкрыццяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

## 3.1 ВУЧЭБНЫЯ ВЫДАННІ, РЭКАМЕНДАВАННЫЯ МА РБ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4. 1. Пералік пытанняў да семінарскіх заняткаў

**Занятак 1.**

1. Жыццёвы шлях З.Даленгі - Хадакоўскага
2. Збіральніцкія прынцыпы даследчыка
3. Значэнне працы “Пра славяншчыну да хрысціянства”
4. Лёс фальклорнай калекцыі З.Даленгі-Хадакоўскага

Літараратура:

1. Беларуская фальклярыстыка: Эпоха феадалізму / Г.А. Каханоўскі [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 288 с.
2. Цішчанка, І.К. Да народных вытокаў: збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50–60-я гг. XIX ст. / І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 246 с.

**Занятак 2.**

1. Я. Тышкевіч – выдатны гісторык і краязнаўца
2. Фальклярыстычны аспект працы “Апісанне Барысаўскага павету”
3. Традыцыйная культура беларусаў у даследаваннях Я.Тышкевіча

Літараратура

1. Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 118 с.

**Занятак 3.**

1. Жыццёвы шлях А. Кіркора
2. Даследаванне славянскага насельніцтва Віленшчыны ў працы А.Кіркора “Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Асноўны змест нарысаў А. Кіркора для III тома ”Маляўнічай Расіі”

4. Навуковыя і сацыяльныя погляды даследчыка

Літараратура:

1. Беларуская фалькларыстыка: збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. : зб. / Г.А. Пятроўская [і інш.]; АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 333 с.

2. Запрудскі, І.М. «Да мілага пабачэння!»: к жизнеописанию Адама Киркора / І.М. Запрудскі // Нёман. – 1998. – № 10. – С. 171–192.

3. Каханоўскі, Г.А. Кіркор Адам Ганоры Карлавіч / Г.А. Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 326.

4.Цішчанка, І.К. Да народных вытокаў: збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50–60-я гг. XIX ст. / І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 246 с.

**Занятак 4.**

1. Біяграфія  М.В. Доўнар-Запольскага. Значэнне Кіеўскага ўніверсітэта.

2. Беларускае народнае вяселле ў даследаваннях М. Доўнар-Запольскага.

3. “Песні пінчукоў”: жанравы склад, значэнне зборніка.

Літараратура

1. Беларуская фалькларыстыка: збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. : зб. / Г.А. Пятроўская [і інш.]; АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 333 с.

**Занятак 5**

1. Жыццёвы шлях А.К Сержпутоўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Побыт, звычаі і вераванні сялян Мазыршчыны і Случчыны ў нарысах даследчыка.

3.Публікацыя казак А.К.Сержпутоўскім ў Інбелкульце. Сацыяльная вастрыня сюжэтаў.

4. Збіральніцкія прынцыпы даследчыка. "Казачнікі Сержпутоўскага"

Літараратыра

1. Беларуская фалькларыстыка: збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах ХІХ – пачатку ХХ ст. : зб. / Г.А. Пятроўская [і інш.]; АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 333 с.

2. Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. - 270 с.

**Занятак 6**

1. К.П. Кабашнікаў як даследчык беларускай фалькларыстыкі
2. Працы па гісторыі фалькларыстыкі І. К. Цішчанкі
3. Гісторыя фалькларыстыкі ў даследаваннях Г.А. Каханоўскага
4. Збіральнікі і даследчыкі народнай творчасці ў працах Г.А. Пятроўскай
5. Манаграфія "Збіральнікі" У. А.Васілевіча: персаналіі, каментары

Літараратыра

1. Васілевіч, У.А. Збіральнікі / У.А. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 188 с.

2Кабашнікаў, К.П. Гістарыяграфія беларускай фалькларыстыкі / К.П. Кабашнікаў, А.С. Фядосік // Беларусы. – Мінск : Бел. навука, 2004. – Т. 7 : Вусная паэтычная творчасць. – С. 11–41.

3.Каханоўскі, Г.А. Беларуская фалькларыстыка: эпоха феадалізму / Г.А. Каханоўскі, Л.А. Малаш, К.А. Цвірка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 228 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4.Пятроўская, Г.А. Пачынальнік беларускага нарадазнаўства М.Я. Нікіфароўскі / Г.А. Пятроўская. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 72 с.

5.Цішчанка, І.К. Да народных вытокаў: збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50–60-я гг. XIX ст. / І.К. Цішчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 246 с.

6.Цішчанка, І.К. З творчай спадчыны: навуковыя артыкулы, літаратурныя творы / І.К. Цішчанка. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2004. – 288 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 ЗАДАННІ ДЛЯ КАНТРАЛЮЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ

***Падрыхтаваць пісьмовыя паведамленні на прапанаваныя тэмы:***

1. Фалькларыстка і этнограф Зінаіда Радчанка. Зборнік “Гомельскія народныя песні(беларускія і маларускія)”(1888)
2. Беларускае Палессе ў працы Генрыка-Оскара Кольберга.
3. А.Р. Пшчолка – даследчык традыцыйнай культуры Лепельшчыны. Фальклорна-этнаграфічны нарыс ”Беларускія святы”(1904)
4. Эма Яленская-Дмахоўская: унёсак у збіранне,пуублікацыю і вывучэнне фальклору Усходняга Палесся
5. Ян Карловіч: збіранне і ўкладанне зборнікаў беларускіх паданняў і казак.

Літарараура

1. Васілевіч, У.А. Збіральнікі / У.А. Васілевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 188 с.
2. Карский, Е.Ф. Белоруссы : в 3 т. / Е.Ф. Карский. – Варшава : Тип. Варш. учеб. окр., 1903–1922. – Т. 1 : Введение в изучение языка и народной словесности. – 466 с.
3. Саламевіч, Я. Даследчыца беларускага фальклору// Полымя. – 1969. – № 11

***Прааналізаваць наступныя манаграфіі:***

1. Прыказкі і прымаўкі у 2 кн. АН БССР,Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Рэд. А.С. Фядосік.-Мн.; Навука і тэхніка.1976. (серыя БНТ)

Складзіце план прадмовы да 1-га тома, напісанай М.Я. Грынблатам, выпішыце па 7 прыказак з кожнага раздзелу двухтомніка. Растлумачце іх сэнс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Гілевіч, Н.С. Збор твораў: у 23 т. – Т.20: Фалькларыстыка: апавядальныя і мудраслоўныя жанры беларускай народнай творчасці. – Мн.; Тэхналогія, 2011. - 496с.

*Запішыце асноўных раздзелаў тома, акрэсліце іх праблематыку.*

3. Сравнительный указатель сюжетов: Восточнославянская сказка/АН СССР. Составители: Л.Г.Бараг, И.П. Березовский,К.П. Кабашников, Н.В.Новиков.- Л.: Наука, 1979. - 437 с.

Запішыце асноўныя прынцыпы, якія ляжаць у аснове параўнальнага паказальніка сюжэтаў. Прывядзіце некалькі прыкладаў казачных сюжэтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3. ПЫТАННІ ДЛЯ ЗАЛІКУ

1. Перыядызацыя беларускай фалькларыстыкі.

2. Элементы традыцыйнай народнай культуры беларусаў у помніках старажытнага пісьменства.

3. «Аповесць мінулых часоў»: фальклорна-этнаграфічны аспект.

4. Народнасць прадмоў і пасляслоўяў Францыска Скарыны.

5. Прычыны развіцця гістарычна-мемуарнай літаратуры ў XVI – XVII ст.

6. Апісанні культуры ўсходніх славян у працах заходнееўрапейскіх дзеячоў XVI – XVII ст.

7. Дзейнасць Я. Ласіцкага ў Беларусі і Літве. «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя, пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў, татар».

8. Вясельная і пахавальная абраднасць беларусаў у апісанні Я. Ласіцкага.

9. Біяграфічныя звесткі пра Саламона Рысінскага.

10. Змест зборніка С. Рысінскага «Польскія прымаўкі». Значэнне для славянскай фалькларыстыкі.

11. Ідэі рамантызму ў еўрапейскай культуры канца XVIII – пачатку XIX ст.

12. Значэнне Варшаўскага таварыства сяброў навук і Віленскага ўніверсітэта для згуртавання навуковых сіл і выпрацоўкі метадалогіі вывучэння народнай культуры.

13. Жыццёвы шлях З. Даленгі-Хадакоўскага.

14. Наватарская трактоўка З. Даленгі-Хадакоўскім традыцыйнай народнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

15. Значэнне працы З. Даленгі-Хадакоўскага «Пра славяншчыну да хрысціянства». Лёс яго фальклорных калекцый.

16. Славутыя вучоныя і выхаванцы Віленскага ўніверсітета.

17. Роля дзеячоў Віленскага ўніверсітэта ў вывучэнні культуры народаў былой Рэчы Паспалітай. Супрацоўніцтва з замежнымі славяназнаўцамі.

18. Філаматы і філарэты: засваенне і папулярызацыя народнай культуры ў шляхецкім асяродку. Перадавыя сацыяльныя ідэі.

19. Біяграфія Я. Чачота. Удзел у таварыстве філаматаў.

20. Зборнікі Я. Чачота «Сялянскія песні...»: задачы ўкладальніка, характар матэрыялу, мова. Арыгінальныя тэксты беларускага фальклору ў спадчыне Я. Чачота.

21. У. Сыракомля як перакладчык і культурны дзяяч. Беларуская спадчына У. Сыракомлі.

22. Фалькларыстычная дзейнасць О. Кольберга. Збіральніцкія прынцыпы.

23. Фальклорна-этнаграфічныя працы П. Шпілеўскага: трактоўка славянскага язычніцтва.

24. Міфалагічныя персанажы П. Шпілеўскага: ацэнка навуковага патэнцыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.4 ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНУ

1. Жыццёвы шлях З. Даленгі-Хадакоўскага.
2. Значэнне працы З. Даленгі-Хадакоўскага «Пра славяншчыну да хрысціянства». Лёс яго фальклорных калекцый.
3. Славутыя вучоныя і выхаванцы Віленскага ўніверсітета.
4. Філаматы і філарэты: засваенне і папулярызацыя народнай культуры ў шляхецкім асяродку. Перадавыя сацыяльныя ідэі.
5. Зборнікі Я. Чачота «Сялянскія песні...»: задачы ўкладальніка, характар матэрыялу, мова. Арыгінальныя тэксты беларускага фальклору ў спадчыне Я. Чачота.
6. У. Сыракомля як перакладчык і культурны дзяяч. Беларуская спадчына У. Сыракомлі.
7. Фалькларыстычная дзейнасць О. Кольберга. Збіральніцкія прынцыпы.
8. Фальклорна-этнаграфічныя працы П. Шпілеўскага: трактоўка славянскага язычніцтва.
9. Зборнік «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»: гісторыя выдання, мова, структура.
10. Даследаванні беларускага фальклору Я. Тышкевічам.
11. Вынікі дзейнасці Паўночна-Заходняга аддзела РГТ.
12. Праца А. Кіркора для III тома «Маляўнічай Расіі». Навуковыя і сацыяльныя погляды даследчыка.
13. Змест працы П. Шэйна «Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю».
14. Праца І. Насовіча «Зборнік беларускіх прыказак»: жанравая разнастайнасць, навуковае значэнне.
15. Асэнсаванне беларускай каляндарна-абрадавай творчасці ў зборніку П. Бяссонава «Беларускія песні».
16. Унікальнасць шматтомнай працы Е. Р. Раманава «Белорусский сборник»: гады выдання, часткі, праблематыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Жыццёвы шлях М. Я. Нікіфароўскага (1845-1910). Значэнне фалькларыстычнай дзейнасці.

18. Белетрызаваныя нарысы М.Я. Нікіфароўскага па беларускай дэманалогіі «Нячысцікі. Збор простанародных у Віцебскай Беларусі паданняў пра нячыстую сілу».

19. Фальклорна-этнаграфічная дзейнасць У.М. Дабравольскага.

20. Біяграфічныя звесткі пра А.К. Сержпутоўскага. Унёсак даследчыка ў вывучэнне Палесся.

21. Публікацыі беларускай народнай прозы А.К. Сержпутоўскага. «Казачнікі Сержпутоўскага».

22. Трактоўкі міфалагічнай свядомасці ў працы А.Я. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў беларусаў»

23. Пытанні фалькларыстыкі ў працы Я. Ф. Карскага «Белорусы»: кн. 1-2 т. 3.

24. Беларускае народнае вяселле ў даследаваннях М. Доўнар-Запольскага.

25. Духоўная культура беларусаў у працы М. Федароўскага «Люд беларускі на Русі Літоўскай».

26. Дзейнасць М.А. Янчука ў ТАПАЭ. «Праграма для збірання этнаграфічных звестак».

27. Беларускі фальклор у працы Ч. Пяткевіча «Духоўная культура Рэчыцкага Палесся: этнаграфічныя матэрыялы».

28. Заснаванне і дзейнасць Інбелкульта (па манаграфіі «Інстытут беларускай культуры», 1993).

29. Даследчыцкая дзейнасць А.А. Шлюбскага. «Праграма для запісвання помнікаў вуснай народнай творчасці».

30. Дзейнасць І.А. Сербава ў Інбелкульце.

31. Тэарэтычныя працы М.М. Нікольскага (1931, 1933).

32. Здабыткі беларускай фалькларыстыкі 1950–1960-х гг. (па манаграфіі А.С. Фядосіка «Беларуская савецкая фалькларыстыка», 1987).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

33. Актывізацыя збірання і вывучэння музычнага фальклору ў 1960-я гг.: працы В.І. Ялатава.

34. Дзейнасць Р.Р. Шырмы ў галіне вывучэння і папулярызацыі беларускай народнай музыкі.

35. Г.І. Цітовіч як даследчык беларускай музычнай народнай песеннай творчасці.

36. Станаўленне беларускай этнамузыкалогіі: З.Я. Мажэйка.

37. Развіццё беларускай этнамузыкалогіі: Л.С. Мухарынская.

38. Калектыўная манаграфія «Беларуская этнамузыкалогія: Нарысы гісторыі (XIX–XX стст.)» (1997).

39. Шматтомнае выданне «Беларуская народная творчасць»: класіфікацыя, каментарыі, паказальнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4.5 ТЭМАТЫКА РЭФЕРАТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4.6 КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленнестудэнтамчасткіпраграмнагаматэрыялу па памяці. Ізаляванасцьведаў па асобныхтэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца ВНУ ў дзейнасці сучасных устаноў сацыякультурнай сферы, шляхоў і сродкаў засваення фальклору). Веданне даследчай і навукова-метадычнай літаратуры. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля адукацыи щ ВНУ), веданне структуры аналізу навучання. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры і метадычнага фонду па дысцыпліне. Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё праблемадукацыі ў ВНУ, фармуліроўка вывадаў. Уменнеаналізаваць вучэбны працэс. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Усведамленне студэнтам працэсаў сацыяльна-карыснага выкарыстання адукацыі і веданне інавацыйных шляхоў і сродкаў яе ўдасканалення, асэнсаванне досведу па эстэтычнаму аздабленню навучання. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць структуру вучэбнага працэсу, карыстацца навукова-метадычнай літаратурай па акрэсленых пытаннях. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне праблем арганізацыі вучэбнага працэсу ў ВНУ як навуковай галіны. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў адукацыі ў ВНУ на сучасным этапе. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з’явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па эстэтыцы і экалогіі культуры, праблемах і тэндэнцыях этнамастацкай адукацыі. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі**

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

- падрыхтоўка прэзентацый;
- падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
- напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
- вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па распрацаваных тэмах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1 ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

Гулак, А. Гісторыя беларускай фалькларыстыкі. Вучэбная праграма для ўстаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор) / уклад. А. Гулак. – Мінск: БДУКМ, 2015. – 25 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| № | Раздзелы і тэмы | Уся го | Лек | Сем | К С Р С |
|---|---|---|---|---|---|
| | Уводзіны | 2 | 2 | | |
| **Раздзел І. Узнікненне навукі аб фальклоры** | | | | | |
| **1** | Метадалогія фальклярыстыкі, яе школы і напрамкі ў Беларусі | 2 | 2 | | |
| **2** | Перадумовы ўзнікненне навукі аб фальклоры | 2 | 2 | | |
| **Раздзел II. Развіцце народазнаўства ў канцы XVIII – пачатку XIX ст.** | | | | | |
| **3** | Пачатак сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы | 2 | 2 | | |
| **4** | Навуковая спадчына заснавальніка славяназнаўства З.Даленгі-Хадакоўскага | 4 | 2 | 2 | |
| **5** | Віленскі універсітэт як цэнтр навукі і прагрэсіўнай грамадскай думкі | 2 | 2 | | |
| **6** | Народазнаўчая спадчына Я.Чачота, У. Сыракомлі і Ю.Крашэўскага. | 2 | 2 | | |
| **7** | Даследаванні беларускай міфалогіі П.М.Шпілеўскага | 2 | 2 | | |
| **Раздзел III. Даследаванне народнай культуры ў 50-70-я г.г. XIX ст.** | | | | | |
| **8** | Я. Баршчэўскі:”Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, | 2 | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | дзейнасць Я.Тышкевіча і “Апісанне Барысаўскага павета”(1847) | | | | |
| **9** | Дзейнасць Рускага Геаграфічнага таварыства. | 2 | 2 | | |
| **10** | Народазнаўчая спадчына А. Кіркора “Маляўнічая Расія”(Т.ІІІ)(1882) і П.В.Шэйна | 2 | 2 | 2 | |
| **11** | Навуковая спадчына І. І.Насовіча і П.Бяссонава – як даследчыкаў, арыентаваных на заходнерусізм | 2 | 2 | | |
| **Раздзел IV. Здабыткі беларускай фалькларыстыкі 80-90 –х г.г.XIX ст.** | | | | | |
| **12** | Школы і накірункі даследавання ў фалькларыстыцы канца XIX ст. | 2 | 2 | | |
| **13** | “Беларускі зборнік”(1886-1928) Е.Р.Раманава | 2 | 2 | | |
| **14** | Навуковая спадчына М.Федароўскага. “Люд беларускі”(1891-1981) | 2 | 2 | | |
| **15** | Даследаванні У. М. Дабравольскага. “Смаленскі этнаграфічны зборнік”(1891-1903) | 2 | 2 | | |
| **16** | Даследаванні М.Нікіфароўскага | 4 | 4 | | |
| **17** | Даследчык ўсходнеславянскай культуры М.А.Янчук | 2 | 2 | | |
| **18** | Фалькларыстычная дзейнасць М. Доўнар-Запольскага | 2 | 2 | 2 | |
| **19** | Працы А.К.Сержпутоўскага | 4 | 2 | | |
| **20** | Дзейнасць Я.А. Ляцкага | 2 | 2 | | |
| **21** | А.Я.Багдановіч як міфолаг | 2 | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **22** | “Беларусы”(1903-1922) Я.Ф. Карскага | 4 | 4 | | |
| **23** | Ч.Пяткевіч – даследчык традыцыйнай культуры Палесся | 2 | 2 | | |
| **24** | К.Машынскі – унёсак ў славяназнаўства | 2 | 2 | | |
| **Раздзел V. Беларуская фальклярыстыка ў XX-XXI стст.** | | | | | |
| **25** | Фальклорна-этнаграфічная праца ў Беларусі ў 20-я гг. | 2 | 2 | | |
| **26** | Беларуская фальклярыстыка 1930-50-х гг.: уплыў савецкай ідэалогіі | 2 | 2 | | |
| **27** | Збіранне і вувучэнне народнай песні беларускімі савецкімі кампазітарамі | 2 | 2 | | |
| **28** | Дзейнасць ІМЭФ АН ЮССР. Серыя “Беларуская народная творчасць” | 2 | 2 | | |
| **29** | Развіцце беларускай этнамузыкалогіі | 2 | 2 | | |
| **30** | Спадчына славутых збіральнікаў у даследаваннях беларускіх навукоўцаў | 6 | 4 | 2 | |
| **31** | Беларуская фальклярыстыка на сучасным этапе | 6 | 4 | | |
| | Усяго: | 102 | 72 | 8 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5.3 МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Асноўныя методыкі выкладання дысцыпліны заснаваны на спалучэнні метада дэманстратыўнай антрапатэхнікі з метадам уключанага назірання, падмацаваныя мастацкай рэканструкцыяй абрадаў і абрадавым картаграфаваннем пры рэпрэзентацыі фальклорных адзінак.

Аналіз вопыту этнакультурнага выхавання, этнамастацкай адукацыі і постфальклору мяжы ХХ – ХХІ стагоддзяў паказвае, што ў галіне музычнага мастацтва яны адчувальна імкнуцца да каранёвых вакальных і інструментальных складнікаў традыцыйнай культуры (яны ўзаемазвязаныя і перадаюць манадыйную аснову і поліфанічны стыль музычнага мыслення беларускага фальклору) – абрадавых аўтэнтычных спеваў, музыкі для струнных традыцыйных музычных інструментаў і дуды.

У сучасным вузкаспецыялізаваным грамадстве кожнай з'явай мастацтва павінны займацца прафесійна падрыхтаваныя спецыялісты, пажадана – з вышэйшай адукацыяй. Гэта значна павялічвае плён прафесійнай дзейнасці. Працаваць з аўтэнтычным фальклорам у ВНУ пачалі адносна нядаўна. Адным з першых досведаў такога тыпу ў Беларусі стала дзейнасць кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ (створаная ў 2003 г.). Вучэбна-метадычная дзейнасць кафедры мае канцэптуальны напрамак і засяроджаная на выпрацоўцы адукацыйных мадэляў для вышэйшай школы Беларусі, якія б спрыялі захаванню і ахове каранёвай этнічнай культуры беларусаў. Дзейнасць кафедры заснаваная на кваліфікацыйных характарыстыках кафедральных спецыялізацый (2004) і Адукацыйным стандарце напрамку «Фальклор» спецыяльнасці «Народная творчасць» (2008).

Асноўныя інавацыйныя дасягненні прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры этналогіі і фальклору на працягу 2003 – 2015 гг. :

а) распрацоўка і паспяховае ўкараненне ў вучэбны працэс мадэлі ў падрыхтоўкі ва ЎВА спецыяліста-практыка па захаванні фальклору;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

б) распрацоўка і ўкараненне адукацыйнай мадэлі кафедры практычнай фалькларыстыкі (мастацтва вуснай традыцыі).

Мадэль падрыхтоўкі спецыяліста-практыка па захаванні фальклору ва ЎВА акамулюе вопыт выкладання Санкт-Пецярбургскай акадэміі музыкі (кансерваторыі) імя М.А. Рымскага-Корсакава, Вільнюскай акадэміі музыкі, дзе аддзяленні этнамузыкалогіі (рыхтуюць «фалькларыстаў, якія спяваюць ці граюць» – «поющих и играющих фольклористов») існуюць шмат год і зараз іх досвед інтэгруецца ў асяродак музычных каледжаў і сацыякультурную практыку.

**Кафедральная мадэль**
**падрыхтоўкі ва УВА спецыяліста-практыка па захаванні фальклору**

Экспедыцыя на 1 курсе ► яе вынікі як дыдактычны матэрыял на 2-3 курсах ► дыпломны праект на матэрыялах экспедыцыі на 4 курсе

Навучанне па дысцыпліне заснавана на ***метадзе дэманстратыўнай антрапатэхнікі*** – калі фальклорнае выканальніцкае майстэрства пераймаецца непасрэдна ад асобы носьбіта – ці пры непасрэдным назіранні, ці праз прагляд аўдыя- і відэаматэрыялаў пра носьбітаў традыцыі.

У працэсе ўкаранення ў вучэбны працэс метада дэманстратыўнай антрапатэхнікі і вышэйпералічанай мадэлі адукацыі дзейнасць кафедры набыла нечакана дасканалую форму, якая моцна адрозніваецца ад дзейнасці іншых кафедраў універсітэта. Акрамя ўласна вучэбнага працэсу, навукова-метадычнай дзейнасці выкладчыкаў і прафесуры, у жыццё кафедры дадаліся моцна інтэграваныя ў вучобу элементы, без якіх яна ўжо не здолела б існаваць. Яна адбылася як кафедра практычнай фалькларыстыкі (кафедра мастацтва вуснай традыцыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5.5 ПЕРАЛІК ВЫДАННЯЎ І ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная**

1. *Беларуская* фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 332 с.
2. *Беларускі* фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Бел. энцыкл., 2005–2006. –
3. *Беларусы*: у 12 т. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 1995. – Т. 3: Гісторыя этналагічнага вучэння / В. К. Бандарчык [і інш.]. — 1999. – 365 с.
4. *Васілевіч*, У. А. Збіральнікі. / У. А. Васілевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 189 с.
5. *Каханоўскі,* Г.А. Беларуская фалькларыстыка : эпоха феадалізму / Г.А.Каханоўскі, Л.А.Малаш, К.А.Цвірка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. –
6. *Цішчанка*, І. К. Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50-60-я гады XIX ст. / І. К.Цішчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 248 с.
7. *Фядосік*, А. С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А.С.Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. –

**Дадатковая**

1. *Беларускія* народныя песні. Са зборнікаў П. Шэйна. Склад. К. Кабашнікаў. – Мн. : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 429 с.
2. *Богданович*, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Гродна: Губ типография, 1895. – 186 с.
3. *Гілевіч*, Н. С. З клопатам пра песні народа / Н. С. Гілевіч. – Мн. : Выд. БДУ, 1970. – 160 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Гулак*, А.А. Пётр Аляксеевіч Бяссонаў: славяназнаўца і фалькларыст / А.А. Гулак. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 110 с.
5. *Живописная* Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мінск : БелЭн, 1993. – 550 с.
6. *Земцовский*, И.И. Искатели песен / И. И. Земцовский. – Л. : Музыка, 1967. – 110 с.
7. *Казакова, І.В.* Беларускі фальклор: вучэб. дапам. / І.В.Казакова. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.
8. *Карскі*, Я.Ф. Беларусы / Яўхім Карскі. – Мінск : МГА "Бел. Кнігазбор", 2001. – 637 с. (Беларускі кнігазбор. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).
9. *Каханоўскі*, Г.А., Каханоўскі, А.Г.: Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г.А.Каханоўскі, А. Г.Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с. (Нашы славутыя землякі).
10. *Романов*, Е.Р. З гісторыка-археалагічнай спадчыны : выбраныя творы / Е.Р.Раманаў. – Магілёў : МДУ, 2006. – 237 с.
11. *Рыгор* Шырма / Склад. В.Дз. Ліцвінка. – Мінск : Беларусь, 1990. –
12. *Саламевіч*, І. У. Міхал Федароўскі / Янка Саламевіч. – Мн. : Выш. шк., 1972.
13. *Скідан*, В. І. Бяссонаў і Беларусь. Пошукі і знаходкі / Васіль Скідан. – Мн. : Звезды Гор, 2008. – 90 с.
14. *Фальклор* у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / [Уклад., сістэмат. тэкстаў і камент. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай. – Мінск : Бел. навука, 1997. – 342 с. – (Беларуская народная творчасць).
15. *Федароўскі*, М. Люд беларускі. Вяселле. / М. Федароўскі. - Уклад., прадм. і пер. з польскай мовы І.У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1991. – 142 с.
16. *Фядосік*, А. С. Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фалькларыстыкі 20—30-х гг. / А.С. Фядосік. – Мінск : 1991, –
17. *Г.І. Цітовіч* ва успамінах сучаснікаў : Зборнік / Музыч. тав-ва БССР. – Мінск : 1990. – (Выдатныя дзеячы беларускай музычнай культуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18. *Цыхун*, А. П. Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф.Карскі : Краязн.-біягр. нарыс / А.П.Цыхун. – Гродна, 1992.

19. *Швед*, І. А. Уводзіны ў фальклярыстыку : вучэбна-метадычны дапаможнік : у 2 ч. / І. А. Швед ; Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С Пушкіна. – Брэст : БрДУ. 2009. – Ч. 1. – 92 с.

20. *Шлюбскі*, А. Этнаграфічная дзейнасць Дабравольскага / Ал. Шлюбскі. – Мінск : 1928. –

21. *Шырма*, Р. Р. (1892—1978). Песня – душа народа : публіцыстыка, фальклор, музыка, літ. / Рыгор Шырма. – Мінск : Маст. літ., 1976. –

22. *Ягич*, В. История славянской филологии / И. В. Ягич. – Репр. изд. – М.: Индрик, 2003. – 960 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ